№ 33 (391) 3 верасьня 2004

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## З Днём беларускай вайсковай славы!



### Пасьля Алімпіяды



«Яна не крычала ад радасьці».

старонка 9

### Лёгкае стоўпатварэньне дэмакратаў

Усе на выбары!

старонка 4

### КДБ пад судом

Працэс Землякова.

старонка 3

### Запавет Кучмы

Любіць Украіну, любіць!

старонка 10

КУЛЬТУРА

### Лявонава ўлада

31 жніўня рок-сэзон быў адкрыты канцэртам «N.R.M». Паўнюткая заля клюбу «Рэактар» сьпявала і дыхала разам. Тры гадзіны яднаньня, тры гадзіны ўздыму. Вольскі і Ка сабралі людзей больш, чым Ганчарык у помны дажджысты вечар у верасьні 2001-га. Лідэру б «N.R.M.» ды ў прэзыдэнты! А ў якасьці гімну абралі б «Партызанскую». І жылося б сапраўды весялей. Лявон ужо кланаваны (Крамбамбуля, Zet), каранаваны (на «Рок-каранацыях»), каніназаваны (трыб'ютам). Засталося адзінае.

**Сяргей Будкін**

Навіны культуры — **старонка 12.**

## На якой мове зьвініць званок



Акцыя «Хочам вучыцца па-беларуску!», зладжаная незарэгістраваным Задзіночаньнем беларускіх студэнтаў на Кастрычніцкай плошчы ў Менску 1 верасьня, суправаджалася затрыманьнямі. Спробы разгарнуць плякаты спыняліся. Адзінае, што можна было зрабіць беспакарана, — сесьці і засьпяваць. Пасьля пары песень удзельнікі рушылі да помніка Купалу. Сярод затрыманых — Лявон Баршчэўскі, Франак Вячорка, Яўген Афнагель.

Міністэрства адукацыі на словах турбуецца пра беларускую школу. Але ўлады па-ранейшаму жорстка рэагуюць на кожную ініцыятыву зьнізу ў гэтай сфэры. У выніку колькасьць беларускамоўных школьнікаў скарачаецца ўжо 10-ы год, а беларускамоўныя ВНУ застаюцца ў праектах.

**Працяг тэмы на старонцы 8.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

### Увага!

Ідзе падпіска на чацьверты квартал. «Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапіках «Белсаюздруку» ў Менску.

## Менск 9.11



PHOTO.BYMEDIA.NET

Іншыя анонсы верасьня — **старонка 12.**

8 ВЕРАСЬНЯ



**На Тураўскім Эвангельлі ёсьць уласнаручныя пазнакі Канстанціна Астроскага. У розныя гады, між войнамі, князь меў час браць у рукі кнігу. Сьвятую ня толькі паводле зьместу. На той час Эвангельлю было пяцьсот гадоў, яно перажыло дзясяткі пакаленьняў, прайшло праз тысячы рук. Дзякуючы такім кнігам адчуваеш далучанасьць да тысячагадовай культуры. Гэтае ўсьведамленьне далучанасьці дала Астроскаму рашучасьць зламаць страшную царкоўную прысягу, абы вярнуцца дамоў у Вільню з ганаровага маскоўскага палону. Бо толькі культурны чалавек мае радзіму. Выходзіць, бяз Тураўскага Эвангельля не было б перамогі пад Воршай. Як не было б перамог пад Кірхгольмам, на Уле — усюды, дзе нашы продкі былі ўтрая меншыя лікам за чынгісханаў. Яны баранілі ня толькі матэрыяльнае, але і свой духоўны сьвет. Імі рухала ня толькі вернасьць сваёй дзяржаве, але і страх стаць чужымі самім сабе, прыняўшы чужую культуру. Таму Астроскі і перамагаў. Сёньня, калі беларусы ў меншыні, яны ня маюць іншага спосабу спыніць масу.**

### Наша вечная бітва

Калі я вучыўся ў школе, пра Аршанскую бітву 8 верасьня 1514 году нам нічога не расказвалі. Зялёненькі падручнік гісторыі БССР быў незапатрабаваны. Асноўная ўвага надавалася гісторыі СССР.

Абэцэдарскага няма сярод аўтараў сёньняшняга падручніка гісторыі Беларусі, але ён паўсюдна з намі — у тэксьце параграфаў.

**Працяг на старонцы 2.**

## Тысяча гадоў беларускай Кнізе

Сёлетняе сьвяткаваньне Дня беларускага пісьменства будзе адбывацца ў Тураве, які наноў, пасьля многіх стагодзьдзяў, набыў афіцыйны статус гораду. Сівы Тураў ад XIII ст. ня меў гэткае ўвагі да сябе. Улады паруліліся нават пра тамтэйшыя платы, расфарбаваўшы іх. Чакаецца багата гасьцей. Ва ўсёй гэтай перадсьвяточнай куламесе забыліся толькі на адно: менавіта ў Тураве тысячу гадоў таму было створана славутае Эвангельле, самая старажытная беларуская кніга, што дайшла да нас.

Здавался б, самы час, каб на сьвята згадаць пра гэты ўнікальны помнік нашага пісьменства й мастацтва. Але не. Нічога пра тысячагадовы юбілей Тураўскага Эвангельля ніхто пакуль не сказаў.

Тым часам гэта наша рэліквія, што паходзіць з XI ст. і да сёньня зьберагаецца ў Вільні. Там мне пашчасьціла пабачыць яе двойчы. Першага разу — 10 гадоў таму, у бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. Тады, працуючы там, я стаў сьведкам таго, як Тураўскае Эвангельле вымалі з мэтаю прафіляктычнага нагляду. Фарбы рукапісу зусім не пабляклі за тысячагодзьдзе. Большыня тых ініцыялаў-літарак расфарбаваныя адно трыма колерамі: чырвоным, зялёным і сінім, а астатнія тэксты — брунатна-барвовымі, нібы запечаная кроў. Шчыра кажучы, я гатовы быў пабачыць усё што хочаце, толькі ня гэткія дзівосна жывыя літары, напісаныя нібы толькі ўчора.

**Працяг на старонцы 2.**

## Што можа быць горшым за Алімпіяду?

Віталь Тарас

«Горшым за камунізм можа быць толькі антыкамунізм», — пісаў некалі Мілаван Джылас, югаслаўскі камуніст-дысыдэнт. Што можа быць горшым за глябальную эканоміку й транснацыянальныя карпарацыі? Бадай што антыглябалісты. Як і ўсялякае «анты-», змаганьне з глябалізмам толькі ўмацоўвае аб'ект нянавісьці. Адным з такіх улюбёных аб'ектаў для антыглябалістаў апошнім часам зьяўляюцца Алімпійскія гульні. Гэта натуральна зь іхнага боку, бо сучасныя Алімпіяды зьвязаныя з гіганцкімі грашыма, а ўзьвязьненьне ўсё новых агромністых будаўнічых аб'ектаў само сабе кепскім чынам адбіваецца на прыродзе. Пастаянныя допінг-скандалы, заангажаванасьць судзьдзяў, агромністы карумпаваны бюракратычны апарат МАК, мільёны абалваненых рэклямай тэлегледачоў дапаўняюць карціну сучаснага апакаліпсысу.

**Працяг на старонцы 9.**




AFP

Беслан (Паўночная Асеція). **Старонка 2.**

ХАРЭЎСКІ




**Ваша кампутарная крама Formoza**

**Кампутары** (гатовыя мадэлі на складзе, гарантыя 36 месяцаў)
**Камплектуючыя**
Вялікі выбар **кампакт-дыскаў**
**Запраўка** картрыджаў
**Рамонт** і абслугоўваньне
Прыём на **камісію** ўжыванай тэхнікі

**вул.Прытыцкага, д.62, корпус 2**
Пн—Пт 9.00— 9.00, Сб 10.00—16.00
**Т.: 253-57-86** Ліцэнзія №413 ад 19.09.2003

# Наша вечная бітва

Працяг са старонкі 1.

«На працягу XIV—XVI ст. адносіны паміж Літоўскай і Расейскай дзяржавамі нярэдка насілі варожы характар».

Гэты «варожы характар» калісь, на дзяцінны глузд, разумеўся адназначна: *добрыя расейцы* хацелі вызваліць беларусаў ад *кепскіх літоўцаў*. І верылася. Да пары. Адраджэнская публіцыстыка, накшталт «100 пытаньняў і адказаў», сталася сапраўдным адкрыцьцём *беларускага* ў нашай гісторыі, а бітва пад Воршай 1514 году — фактам, які перакрэсьліваў у сьвядомасьці рэшткі навязанага сыстэмай адукацыі маскваўфільства.

8 верасьня — гэта дзень барацьбы парадоксаў.

Падручнікі зноў гавораць нам пра цягу тагачаснага жыхарства ВКЛ да Масковіі. А мы ківаем галавою на праваслаўнага Канстанціна Астроскага, які вайсковай хітрасьцю завабіў *вызваліцеляў* у пастку і расстраляў з гарматаў, ажно «Цэлы сьвет скалануўся, неба застагнала, / І ў паветры ад пылу ноч запанавала», як напісаў Мацей Стрыйкоўскі.

Нам цьвердзяць, што гэтая перамога — толькі эпізод у прайгранай вайне. Нам жа даводзіцца нагадваць пра тое, што пасьля перамогі ліцьвінаў пад Воршай распаўся вайскова-палітычны хаўрус Масковіі і Сьвятарнай Рымскай Імпэрыі, які ставіў на мэце падзел нашай Айчыны.

У Аршанскай бітве і падзеях вакол яе мы можам убачыць шмат. Акрамя ваеннага генія Канстанціна Астроскага, маем прыклад сапраўднай інфармацыйнай вайны. Жыгімонт Стары адмыслова спрыяў распаўсюду па Эўропе зьвестак пра літоўскую ваенную фартуну. У эўрапейскія манаршыя двары паляцелі адпаведныя лісты, і толькі тады эўрапейцы зразумелі, што літвінскі гетман — новы Сцыпіён. Мясцовы летапісец, мабыць, атрымаў замову на пахвалу найвышэйшаму гетману, а нехта з паэтаў — на верш-песьню, каб данесьці яе нават да непісьменных сялян. Мо акурат таму песьня як народная і дайшла праз гушчары іншых падзеяў да нас, гэтак нагадваючы стылізацыю пад фальклёр.

Аршанская бітва паказвае апрычонае месца Беларусі ў Эўропе. І тады, і сёньня Эўропа гатовая забыцца, што Беларусь — яе частка, дзеля заспакаеньня Масковіі-Расеі.

Што мусяць рабіць беларусы сёньня бяз гетмана Астроскага? На якіх палях здабываць перамогі, каб пра нас не адно ўспомнілі, а прызналі за сваіх? І ці патрэбна нам наагул гэтае прызнаньне?

Новая Аршанская бітва адбываецца ў сьвядомасьці беларускага грамадзтва. Грамадзтва, якое дагэтуль канчаткова ня вызначылася з палітычнымі і каштоўнаснымі прыярытэтамі, не лякалізавала сябе ў прасторы найперш уласнае дзяржавы, нацыянальных клопатаў. Гаворка зусім не пра ізаляцыю ад вонкавага сьвету. Гаворка пра патрэбу разумнага супрацьстаяньня глябалізацыі. Каб браць ад сьвету тое, што карысна нацыі, што не перашкаджае заставацца беларусамі і спрыяе множаньню славы нашай краіны сярод «мест замежных». Тут Беларусь, а ўжо потым Эўропа, Эўразія ці плянэта Зямля.

**Сяргей Балахонаў**

# Тысяча гадоў беларускай Кнізе

Працяг са старонкі 1.

Напэўна, гэтае Эвангельле, зважаючы на яго выкшталцонае аздабленьне, мела й багата мініятураў. Але, на вялікі жаль, яны не захаваліся. Нагул, да нас дайшло толькі 10 аркушаў гэтага рукапісу на шчыльным глянцаваным пэргамэнце. На кожнай з 20 старонак — па 18 радкоў тэксту. Загалоўныя літары — ініцыялы — займаюць па 8 радкоў, а таму глядзяцца манумэнтальна й ўрачыста, як асобныя дэкаратыўныя элемэнты. Месцамі трапляюцца й маргінальныя аздобы ў выглядзе гронак. Упэўненая графіка й дасканалая арнамэнтыка ініцыялаў сьведчаць пра высокі ўзровень каліграфічнага майстэрства безыменнага творцы з Турава. Сама стылістыка рукапісу й яго дэкарацыі ўзыходзіць аднагасова і да бізантыйскай, і да раманскай традыцыяў. Наша Тураўскае Эвангельле вельмі блізкае стылістыкай выкананьня да гэтак званага Рэймскага Эвангельля, таксама XI ст.

Таксама вялікую каштоўнасьць маюць так званыя ўкладныя запісы, што зьберагліся на палёх рукапісу. Яны былі зроблены ў 1508, 1513 і ў 1781 гадах. Зь першых запісаў, зробленых уласнай рукою славутага гетмана Канстанціна Астроскага, пераможцы маскоўскай арды пад Воршаю, вынікае, што кніга належала найстаражытнейшай царкве Раства Багародзіцы ў Тураве, на прадмесьці Заяцельле.

У 1800 г. на месцы тае найстаражытнейшае царквы была ўзьведзена на сродкі прыхаджанаў новая й высьвечана пад найменьнем Спаса-Праабражэньня. Менавіта адсюль у 1865 г. Эвангельле было вывезенае М.Сакаловым у Віленскую публічную бібліятэку.

Другога разу я змог пабачыць Тураўскае Эвангельле ў 2000 г. Было гэта на выставе, прымеркаванай да мілeніюму. Наша кніга адкрывала ўсю шыкоўную экспазыцыю. Бо гэта самая старажытная з кніг, што ёсьць цяпер у Літве. Трэба зазначыць, што й дэманстравалася яна шыкоўна — у асобным шкляным сэйфе з падсьветкаю, зь ніцямі-зацiскачкамі з золата.



Тое, што ёсьць у сховах Беларусі, патрабуе да сябе несувымерна большае ўвагі, чым ёсьць.

У Вільні гэты скарб добра даглядаецца. Яшчэ ў 1962—1963 г. Тураўскае Эвангельле было адрэстаўраванае, увабранае ў новы пераплёт. Дарэчы, стары пераплёт, XVII ст., зьберагаецца таксама, але асобна.

Што б чакала гэтую рэліквію ў Беларусі, сказаць цяпер цяжка. Ці вынесьлі б яе з полымя XX ст.? Не засталося й знаку ад тае царквы, дзе яна некалі зьберагалася. Зьнiклі бязь весткі тысячы іншых беларускіх рэліквій. А нават тое, што ёсьць у сховах Беларусі, патрабуе да сябе несувымерна большае ўвагі, чым ёсьць.

Вось і цяпер, рыхтуючы ў Тураве чарговае сьвята, арганізатары не згадалі пра нашую сьвятыню — Тураўскае Эвангельле. Не парупіліся яго выдаць ні дзяржава, ні царква.

Бадай, за гэтым рэжымам гэта нерэальна. Культуры не хапае. Для некаторых гісторыя Беларусі пачынаецца ад 1995 г. Аднак стагодзьдзе толькі пачалося. Маркую, 20 старонак у пяць колераў зможам выдаць і прыватным чынам.

**Сяргей Харэўскі**

## На магіле рэдактара легендарнае «Свабоды» зьявіўся помнік



Аўтар манумэнту архітэктар Лявонці Зданевіч кажа, што зрабіць гэты помнік было ягоным абавязкам перад сябрам: «Я сябраваў зь Ігарам і, шчыра скажу, вельмі яго любіў. Гэта быў сымпатычны чалавек зь непаўторным пачуцьцем гонару».

Архітэктурнае рашэньне помніка простае. «Я заўсёды стараюся рабіць як мага прасьцей. Для мяне галоўнае — прастата і стылізацыя. Ну, і пэўная доля манумэнталізму там ёсьць. Ігар быў сьціплы чалавек, вось і помнік сьціплы».

Паводле слоў Л.Зданевіча, падзеленая на дзьве часткі пліта сымбалізуе жыцьцё і сьмерць чалавека. «У разрыве пліты будуць расьці кветкі, — кажа Зданевіч. — Жыцьцё перамагае». Паміж паловамі пліты ўздымаецца ўласна помнік чалавеку — стэла-абэліск з простым надпісам — толькі імя і прозьвішча — і крыжам на тле сьцягу. На вышыні чалавечага росту на стэле ўмацаваны бюст І.Герменчука работы скульптара Канстанціна Селіханава. «Ігар быў сутулаваты, але хто ведае яго паходку, памятае, што ён заўсёды з узьнятым падбародзьдзем хадзіў, ніколі не схіляў галавы — таму і бюст высока трымае галаву», — тлумачыць Зданевіч.

**Алесь Пяткевіч**

КАМЭНТАР

## Расейскі кашмар

Тэракты робяцца штодзённымі і набываюць усё больш варварскія формы. Абсурдна патрабаваць міру, захопліваючы дзяцей у закладнікі. Ня міру і не незалежнасьці, а сусьветнае крыві хочуць гэтыя тэрарысты. Аднак мы ня мусім забывацца, што суаўтары гэтага варварства — аднавіцелі «канстытуцыйнае законнасьці» ў Чачэніі. Праз дывановыя бамбёжкі, патаптаньне нацыянальнае годнасьці і выбарчыя фарсы думалі яны назаўжды вырашыць пытаньне «аднаго народу». А цяпер пацiраюць рукі, што чачэнскі супраціў будзе асацыявацца з скуралупамі. Гора грамадзтву, якое няздольнае цьвёрда сказаць сваё «Не — вайне».

Як дзіўна, што дагэтуль яшчэ ў Беларусі знаходзяцца людзі, якія лічаць патрэбным прывязаць, а з часам і далучыць Беларусь да расейскае прасторы.

**Барыс Тумар**

IN MEMORIAM

# Адзін з тысячаў

22 жніўня трагічна загінуў **Васіль Гурын**. Яму было 56 гадоў. Гэты чалавек за сваё жыцьцё, што абарвалася зьнянацку, здолеў зрабіць шмат. Найперш — выбудаваць на рэдкасьць шчасьлівую кар'еру савецкага чыноўніка. Па сканчэньні журфаку БДУ імя Леніна ён стаў першым сакратаром ЦК камсамолу Беларусі. Затым пакручасты лёс службіста вывеў яго ў загадчыкі ўпраўленьня Кантрольнае палаты Беларусі, пасьля — у намесьнікі старшыні Менскага гарвыканкаму і нарэшце, цалкам лягічна, — на высокую пасаду ў Адміністрацыі Лукашэнкі, дзе сп.Гурын займаўся кадравымі пытаньнямі.

Найбольш, аднак, ён запомніўся тым сваім пэрыядам службы, як працаваў у Менгарвыканкаме. Яго вінавацілі ў трагедыі, што адбылася ў пераходзе мэтро на Нямізе (менавіта ён выдаў дазвол на правядзеньне таго сумнавядомага сьвята), у праблемах беларускамоўных школьнікаў, у патураньні рэжыму ды шмат у чым яшчэ. Можа, хто калі ў гэтым і разьбярэцца.

Але я разабраўся ў наступным: менавіта дзякуючы Васілю Гурыну ў Менску пакуль не пабудаваны паркінг на Нямізе. Двойчы, за бурмістрам Ярмошыным і ўжо за Паўлавым, іхны намесьнік Гурын блякаваў рашэньні па гэтай будоўлі. Ён меў, несумненна, шырэйшы сьветапогляд і лепшую адукацыю за сваіх начальнікаў. Адчайныя звароты беларускае інтэлігенцыі для яго не былі пустым гукам, як для ягоных наступнікаў. Дазволю сабе цытату зь ліста Васіля Гурына на імя першага намесьніка Менскага гарвыканкаму Г.Сянкевіча ад 20 лістапада 2000 году: «...Разьмяшчэньне наземных шматузроўневых парковак на тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасьці Верхні горад недапушчальна. У сувязі з гэтым прашу Вас даць даручэньне Камітэту архітэктуры, горадабудаўніцтва й землеўпарадкаваньня падшукаць іншую пляцоўку для будаўніцтва стаянкі, па-за межамі гістарычнага цэнтру». Гэты афіцыйны дакумэнт складзены па-беларуску.

Атрымлівалася парадаксальная сытуацыя: тыя, хто быў прызначаны ахоўваць гістарычную спадчыну, а менавіта старшыня Камітэту гісторыка-культурнае спадчыны сп.Бубноўскі, як і ягоныя наступнікі, давалі дазвол на зьнішчэньне рэшты Нямігі, а той, хто мусіў бы проста прамаўчаць, — Васіль Гурын — павысіў голас у абарону таго, што нам засталося ад мінуўшчыны.

Пасьля таго як Гурын пакінуў гарвыканкам, справа з будаўніцтвам у ахоўнай зоне гістарычнага цэнтру была вырашана. Вандалы, на чале з колішнімі рупліўцамі беларушчыны, перамаглі. Няміга — самая старажытная вуліца Менску — неўзабаве стане й самай пачварнай. Імёны тых вандалаў добра вядомыя. Як і кожны іх крок — дакумэнтальна засьведчаны. Вандалізм ня будзе ананімным.

Ягоны лёс стаў напамінам тым, хто працаваў побач зь ім. Кожнага з нас чакае некалі грамадзянская паніхіда. Што на ёй скажуць, а самае галоўнае — чаго *ня* скажуць?

Прыклад з Васілём Гурыным сьведчыць, што на любой пасадзе можна застацца чалавекам і грамадзянінам.

**СХ**

Шчырыя спачуваньні **Алесю Міхалевічу** з прычыны сьмерці бацькі **Анатол**я. Трымайся і ў гэтыя дні.
Сябры

Беларускае Шуманаўскае Таварыства (Польшча) выказвае глыбокае спачуваньне свайму сябру **сп. Алесю Міхалевічу** ў сувязі зь цяжкім горам, якое яго напаткала, — сьмерцю **бацькі**.
Трымайся, Алесь!

## Дэмакратычны форум беларусаў Эўропы

28—29 жніўня ў канцэртнай залі «Клементынум» у Празе адбылася першая сустрэча беларусаў Эўропы, арганізаваная Радай БНР і супольнасьцю беларусаў Чэхіі «Скарына». У Прагу прыбылі беларусы зь пятнаццаці краёў.

Бацькаўшчыну прадстаўлялі паэт Генадзь Бураўкін, журналіст Мікола Маркевіч, мастак Алесь Пушкін, сьпявак Зьміцер Сасноўскі. Да ўдзельнікаў сустрэчы зьвярнуўся былы міністар замежных справаў Пятро Краўчанка, што прыехаў у Прагу з уласнай ініцыятывы.

Па выніках двухдзённай І сустрэчы вырашана стварыць Дэмакратычны форум беларусаў Эўропы і прыняты зварот да Эўразьвязу.

Як стала вядома «НН», Старшыня Рады БНР ня возьме ўдзелу ў зьезьдзе беларускай палітычнай эміграцыі, што запланаваны на 4—5 верасьня ў Антвэрпэне.

**МБ**

## Бэтонам у «Вольва»

Іншым разам сюжэты гарадзкіх легендаў увасабляюцца ў рэчаіснасьць. У Жлобіне невядомы зламысьнік скінуў са шматпавярховіку добры кавалак бэтону на дах прыпаркаванага побач аўтамабіля «Вольва-740». Падзеньне гэткага «мэтэарыту» для машыны не прайшло бясьследна. Кідальнік жа ўцёк. Гаспадар «тачкі» — дваццацігадовы дзяцюк, які нідзе не працуе.

Іншыя паведамленьні з усёй краіны — **старонка 5.**

# КДБ пад судом

**Давесьці да суду такую арганізацыю, як КДБ, — пра гэта марылі б многія праваабаронцы ў Беларусі. На сёньня адзіным чалавекам, якому гэта ўдалося, стаў Міхал Землякоў зь Віцебску. Адказчыкам у ягоным працэсе выступае ўправа КДБ па Менску і Менскай вобласьці. Міхал Землякоў патрабуе, каб кадэбісты вярнулі рэчы, канфіскаваныя ў ягонага сына Юр'я ў жніўні 2001 г. Супрацоўнікі органаў не адмаўляюць законнасьці ягоных патрабаваньняў, але рэчы вяртаць не сьпяшаюцца. Пагатоў што сярод некалькіх дзясяткаў канфіскаваных прадметаў фігуруюць такія, як мінашукальнік, прылады начнога бачаньня, газэта «Голас краю» і, урэшце, сьпіс сяброў арганізацыі «Край».**

## «Край» ты мой, «Край»...

Пры канцы жніўня 2001 г., незадоўга да прэзыдэнцкіх выбараў, адзін з актывістаў «Краю» Андрэй Жарнасек і супрацоўнік КДБ Генадзь Вугляніца зьбеглі за мяжу і распаўсюдзілі відэакасэту, на якой распавялі пра пошукі ды пра месца пад Бягомлем, дзе нібыта пахаваныя целы Віктара Ганчара й Анатоля Красоўскага.

Літаральна перад іхнымі ўцёкамі, 21 жніўня, абсталяваньне, з дапамогай якога вяліся пошукі целаў, было канфіскаванае міліцыяй і пазьней перададзенае ў КДБ. Канфіскацыя адбылася ў Менску на кватэры, якую здымаў Юрась Землякоў.

Студэнт ангельскага аддзяленьня Лінгвістычнага ўнівэрсытэту Ю.Землякоў далучыўся да незалежніцкага руху яшчэ школьнікам. Для яго гэта было цалкам натуральна: з нацыянальна-вызвольнымі арганізацыямі былі зьвязаныя і ягоныя бацькі, і іншыя сваякі. Яшчэ школьнікам яго затрымлівалі за нанясеньне палітычных графіці і ўдзел у акцыях пратэсту. Юнак ня мог спакойна назіраць, як зьневажаюць беларускую мову, як гуляюць зь незалежнасьцю. Сэрца пратэставала, хацела змаганьня. І ўрэшце ён далучыўся да арганізацыі «Край», якая ставіла сабе радыкальныя мэты. У ягонай кватэры й захоўвалася абсталяваньне, з дапамогай якога «краёўцы» шукалі целы зьніклых Ганчара й Красоўскага.

Сам працэс канфіскацыі нагадваў сцэну з баевіку. Юрась выйшаў увечары патэлефанаваць бацькам у Віцебск, пакінуўшы ў кватэры двух сяброў. Вярнуўшыся, ён не пазнаў свае кватэры. У ёй гаспадарылі пяць чалавек у цывільным і адзін амапавец з аўтаматам. Ніхто зь іх не назваў сябе. Хлопца абвінавацілі ў забойстве маёра міліцыі Кашкана, патрабавалі выдаць зброю й наркотыкі. Казалі, нібыта маюць дакладную інфармацыю, што тут захоўваецца наркота. «Сартаваньне» рэчаў у кватэры рабілі нагамі. Урэшце, праз 2,5 гадзіны, нічога крымінальнага не знайшоўшы, пачалі складаць акт канфіскацыі, адбіраючы рэчы хутчэй з палітычных матываў, чым зь якіх іншых. Пад заканчэньнеператрусу запрасілі дзьвюх суседак панятымі…

## Начны расстрэл

У Партызанскім РУУСе, куды прывезьлі Юрася, пратаколу затрыманьня не складалі. Калі даведаўся скаргам хлопца ў пракуратуру, міліцыянты паводзілі сябе так, быццам у гэтым выпадку для іх не існуе закону. На працягу чатырохгадзіннага допыту на яго крычалі, мацюкаліся, а потым пачалі біць, — пра гэта піша Юрась у сваіх заявах, зьмешчаных на сайце illegality.by.ru: «Так, мяне білі сувэнірнай шабляй у ножнах, білі прадметам, які нагадваў «булаву», рабілі тычковыя ўдары ствâламі аўтаматаў, ірвалі валасы, круцілі вушы і білі ў вобласьць галавы. Малодшы лейтэнант АМАПу даваў мне чысты ліст паперы і пагражаў, што зараз я ўсё буду пісаць крывёю», — так апісвае тыя страшныя гадзіны ў пастарунку Юрась.

Кульмінацыяй тае ночы стаў… расстрэл Юрася. Міліцыянт паставіў яго да сьценкі, навёў рулю аўтамата і — стрэліў. Халастым. Значна пазьней Юрась расказаў бацьку, што перад гэтым міліцыянты паведамілі яму, што яго заб'юць і пра гэта ніхто не даведаецца: ноч, у пастарунку нікога лішняга, пратаколу аб затрыманьні няма…

Пад раніцу яго адпусьцілі, узяўшы падпіску аб нявыезьдзе і абяцаньне прыйсьці ў РУУС зноў удзень. У міліцыю Юрась не пайшоў, бо ня мог гэтага зрабіць чыста фізычна: замоцна быў ён зьбіты за ноч. Забраць свае рэчы папрасіў Андрэя Жарнасека. Але яму рэчаў не аддалі. Праўда, і самога Юрася больш на допыты не выклікалі. Крыху пабыўшы ў Беларусі й адчуваючы, што за ім няспынна сочаць, Землякоў вымушаны быў зьехаць за мяжу.

Праўда, як сьведчыць галава сям'і Земляковых, перасьлед сям'і на гэтым не спыніўся. Сп.Міхал адзначае, што ў 2003 г. ягонага малодшага сына, непаўналетняга Ігара, забралі з дому ў міліцыю ўжо ў Віцебску — па абвінавачаньні ў кватэрным крадзяжы. Натуральна, без дарослых, што забаронена законам. Там хлопцу пагражалі, бралі ў яго адбіткі пальцаў, абражалі. Выканаўцаў гэтых дзеяньняў знайшлі, а хто аддаваў загад — невядома: «Сьледчы, які вёў справу з тым крадзяжом, сказаў: а я не пасылаў гэтага капітана да вас у кватэру».

## Вінаватых няма

Адстаяць правы сына ўзяўся бацька. Міхал Землякоў змагаецца за сына ўжо амаль тры гады. Для яго гэта стала ўжо справай прынцыпу. Скаргі ягонага сына і яго самога на незаконныя пабоі, нанесеныя міліцыянтамі, ішлі і ў Партызанскае РУУС Менску, і ў менскую гарадзкую пракуратуру, і ў рэспубліканскую, і ва ўправу ўласнай бясьпекі МУС, а таксама асабіста міністру ўнутраных справаў Уладзімеру Навумаву і генэральнаму пракурору Віктару Шэйману. «Атрымалася так, што міліцыянты падставілі пракуратуру Партызанскага раёну: мне адтуль адказалі, што сына не затрымлівалі, бо няма пратаколу затрыманьня. А тыя проста не складалі ніякіх папераў. Таму праверка з пракуратуры нічога і не знайшла», — распавядае сп.Міхал. У сваіх зваротах ён наўпрост параўноўваў дзеяньні міліцыянтаў з фашыстоўскімі ды з энкавэдысцкімі ўзору 37-га году. Кажа, што ціха абурыліся толькі ў рэспубліканскай пракуратуры…



**Юрась Землякоў. Мае 22 гады. Нарадзіўся ў Віцебску. Атрымаў сярэднюю адукацыю ў ліцэі № 1 па праграме «замежныя мовы». Паступіў у Лінгвістычны ўнівэрсытэт (МДЛУ) на факультэт ангельскай мовы, дзе і правучыўся да 2-га курсу. Сябар «Краю». Пасьля зьбіцьця і канфіскацыі абсталяваньня, з дапамогай якога «краёўцы» меліся шукаць целы зьніклых палітыкаў, зьехаў за мяжу.**

Земляковы не здаваліся і зноў слалі скаргі. Зрушыць зь месца гэтую махіну ім усё ж удалося: міліцыя прызнала незаконнае затрыманьне. Аднак знайсьці вінаватых у падзеях тае ночы так і не выходзіць: у адказах ад Партызанскага РУУС паведамлялася, што не ўдалося ўстанавіць асоб, якія «дапытвалі» Юрася ўначы.

Адказы наконт рэчаў, канфіскаваных у Юрася ў тую ноч, былі больш шчырыя. Міліцыянты паведамілі, што іх забралі да сябе супрацоўнікі КДБ з управы па Менску й Менскай вобласьці, ды больш аніякіх тлумачэньняў наконт гэтага даць не маглі. Каб вярнуць рэчы, М.Землякоў пасьлядоўна зьвяртаўся ў пракуратуру й суд адпаведнага раёну, адкуль яго накіравалі ў Цэнтральны раён: маўляў, КДБ «прапісана» на іхным участку.

Толькі сёлета ў жніўні М.Землякову давялося давесьці справу да суду. На сумоўі 25 жніўня прэсу не пусьцілі. Прадстаўнік КДБ, які прысутнічаў амаль інкогніта («Толькі судзьдзю паказаў кніжачку гэтую чырвоную», — кажа М.Землякоў), прызнаў, што рэчы ў іх. Але вярнуць адмовіўся: маўляў, яны далучаны да справы Жарнасека, які дагэтуль знаходзіцца ў вышуку. Справа дагэтуль не закрыта, таму рэчы вярнуць немагчыма.

Фармальна КДБ адмаўляецца вярнуць рэчы, бо на частку іх калісьці прэтэндаваў уцёклы А.Жарнасек. Маўляў, трэба разабрацца, што належыць Землякову, а што — Жарнасеку. Довадаў сп.Міхала, што вось ужо цягам трох год рэчы патрабуе толькі ён адзін, а Жарнасека й блізка не чуваць, супрацоўнікі органаў пад увагу не бяруць.

Цяпер у Землякова надзея на суд — прынамсі, адносна вяртаньня рэчаў. Што вырашыць судзьдзя Натальля Вайцяховіч, на долю якой выпаў гэты працэс, стане вядома ўжо найбліжэйшымі днямі.

**Аркадзь Шанскі**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Камітэту дзяржбясьпекі будуць баяцца або ненавідзець, пакуль ён будзе верны традыцыям ЧК-НКВД-КГБ. На здымку: ускладаньне кветак да помніка Дзяржынскаму.**

## Вайтовіч за свабодныя выбары



Акадэміку Аляксандру Вайтовічу, былому прэзыдэнту Акадэміі навук і старшыню савету рэспублікі, прапанавана ўзначаліць аргкамітэт грамадзянскай ініцыятывы «За справядлівыя выбары». А.Вайтовіч узяў тыдзень на кансультацыі.

## Як на Захадзе

1 верасьня адчыніўся Баранавіцкі ўнівэрсытэт. На адкрыцьці А.Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ўнівэрсытэт будзе арыентавацца на заходнія стандарты ў арганізацыі побыту студэнтаў: навучальныя карпусы маюць быць злучаны з інтэрнатам, стадыёнам, паліклінікай, сталоўкай, бібліятэкай.

## Камісіі без дэмакратаў

Абсалютная большасьць вылучэнцаў ад дэмпартыяў не прайшлі ва ўчастковыя выбарчыя камісіі. Фармаваньне 6619 камісій у Беларусі й 40 за мяжой скончылася 1 верасьня.

## Выстава Вашчанкі

У Нацыянальным музэі гісторыі й культуры адчынілася выстава Гаўрылы Вашчанкі й дванаццаці ягоных вучняў — Зоі Літвінавай, Віктара Альшэўскага, Леаніда Хобатава, Сяргея Рымашэўскага, Алеся Ксяндзова, Алеся Пушкіна й інш. На ёй экспануюцца творы апошніх 10 гадоў, што вымоўна рэпрэзэнтуюць сучаснае беларускае мастацтва. Выстава пройдзе да 21 верасьня.

## У чорнай дзясятцы

Калюмбія — сусьветны лідэр па забойствах: 0,63 забойства на 1000 чалавек у год. У тройку лідэраў уваходзяць таксама ПАР (0,51) і Ямайка (0,32). За імі ідуць Вэнэсуэла (0,32), Расея (0,19), Мэксыка (0,13), Літва, Эстонія, Латвія (усе па 0,1). Беларусь на 10-м месцы (0,09).

## Польскай штангістцы зрабілі прапанову



Польскай штангістцы Агаце Ўрубель, бронзавай прызэрцы Алімпіяды, пасьля перамогі затэлефанаваў ейны хлопец і прапанаваў выйсьці замуж. Самая цяжкая спартоўка плянэты (вагавая катэгорыя 118 кг) пагадзілася.

## Шумахер — чэмпіён

Пілёт «Фэрары» Міхаэль Шумахер у сёмы раз стаў чэмпіёнам «Формулы-1», прычым за чатыры этапы да фінішу! На чарговым этапе першынства — «Гран-пры Бэльгіі» — яму дастаткова было прыйсьці да фінішу другім. Ён саступіў фіну Кімі Райконэну 3,132 сэкунды, але ўсё ж выйграў чэмпіянат.

**МБ; БелаПАН, «Gazeta.pl»**

# АГП патурбавалі

Шчыльныя рады агэпоўцаў. Паперадзе Віктар Карняенка (сядзіць зьлева), Станіслаў Багданкевіч, Аляксандар Цынкевіч



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Аб арэндзе памяшканьня для VIII нечарговага зьезду партыі АГП удалося дамовіцца з адміністрацыяй гатэлю «Менск» — іх, маўляў, палітыка не абыходзіць, абы плацілі.

Арэнда канфэрэнц-залі была аплачана за тры тыдні да зьезду, аднак раніцай у нядзелю служба бясьпекі гатэлю не пусьціла дэлегатаў у залю.

Анатоль Лябедзька з ганку гатэлю запрасіў дэлегатаў перабірацца ў офіс АГП і паведаміў, што юрысты АГП падрыхтуюць заявы ў пракуратуру аб узбуджэньні крымінальных справаў супраць адміністрацыі «Менску» паводле двух артыкулаў — стварэньне перашкод выбарчай кампаніі і махлярства. З процілеглага боку вуліцы ягоны выступ здымалі на стужку відэааматары ў цывільным з характэрнымі кароткімі стрыжкамі.

Зьезд, на якім частцы дэлегатаў давялося стаяць, вылучыў 57 кандыдатаў у дэпутаты, сярод якіх 8 былых дэпутатаў парлямэнту — Анатоль Лябедзька, Аляксандар Дабравольскі, Людміла Гразнова, Станіслаў Багданкевіч (усе — сталіца), Віктар Карнеенка, Юры Варонежцаў (Гомель), Марат Афанасьеў (Жлобін), Вячаслаў Герасіменка (Петрыкаў). Чацьвёра кандыдатаў — Леанід Арлоў (Мазыр), Марат Афанасьеў, Зьміцер Шкулькоў (Рагачоў) і Кірыл Шарапкін (Магілёў) — дзейныя дэпутаты мясцовых саветаў.

У партыйны сьпіс увайшла таксама народная артыстка Зінаіда Бандарэнка, якой адмовілі ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы.

У панядзелак гісторыя з арэндай залі ў «Менску» атрымала нечаканы працяг: дырэктар гатэлю Мікалай Жураўскі ў інтэрвію радыё «Свабода» назваў нядзельныя падзеі непаразуменьнем і выбачыўся перад АГП.

**АП**

# Валянціна Вячорку прапанавалі аднагалосна



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У нядзелю ў Менску адбыўся нечарговы зьезд Партыі БНФ. На яго сабраліся дэлегаты з усяе краіны агульнай колькасьцю 106 чалавек (пры вылучаных 140). Нагода мерапрыемства — вылучэньне сяброў партыі ў кандыдаты ў дэпутаты палаты прадстаўнікоў. Зразумела, што даволі маштабнае мерапрыемства (нават прыбіраньне перагародак паміж пакоямі сядзібы не дазволіла забясьпечыць месцамі ўсіх удзельнікаў) мела, у пэўным сэнсе, фармальны характар. Прычым усе фармальныя працэдуры даводзілася выконваць максымальна чыста, бо ня тое каб нечаканым, але, пэўна, ня вельмі жаданым госьцем на зьездзе быў прадстаўнік Мінюсту сп.Харытон.

Аб палітычнай сытуацыі ў краіне выказаўся **Вінцук Вячорка (на фота зьлева)**. Паводле яго слоў, яна складаная і працягвае пагаршацца, але, на шчасьце, сытуацыя ў Беларусі не пакінута па-за ўвагай сусьветнай супольнасьці. Вось і перад зьездам у Партыю БНФ прыйшоў ліст падтрымкі ад хрысьціянскадэмакратычнай партыі Нямеччыны. Сваю падтрымку выказалі ЗША ў асобе сэнатара Джона Маккейна. Толькі Расея нэгатыўнага стаўленьня да ўсталяванага ў Беларусі антыдэмакратычнага рэжыму, паводле слоў старшыні партыі, не выказвае.

Галасаваньне па вылучэньнях у кандыдаты ад партыі праходзіла за кожнага прэтэндэнта асобна. Нечаканасьцяў не адбылося. Усе кандыдатуры пераважнай большасьцю галасоў ці аднагалосна (як «Валянцін» Вячорка па 107-й Усходняй акрузе) былі зацьверджаны. Пад заслону дэлегатамі зьезду была прынята Выбарчая платформа Партыі БНФ, што адпавядае праграме «Пяць крокаў да лепшага жыцьця», толькі з выразна праэўрапейскімі акцэнтамі.

**Арцём Лява**

# І Астапенка туды ж

V нечарговы зьезд Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады адбываўся ў паходных умовах. Залі для правядзеньня форуму партыя ў Менску арандаваць не змагла. Як паведаміў на пачатку зьезду лідэр **Станіслаў Шушкевіч (на фота)**, прычына была ў… сумленнасьці партыі: «Мы маглі сказаць, што праводзім канфэрэнцыю, і тады спакойна зьнялі б памяшканьне. Але мы казалі, што яно нам трэба для зьезду апазыцыйнай партыі». Вырычылі эсдэкаў таварышы-камуністы — далі бясплатна залю ў сваім офісе. Таму зьезд БСДГ праходзіў пад пільным наглядам не шанаванага сацдэмамі Леніна.

57 дэлегатаў рэпрэзэнтавалі 67 зарэгістраваных суполак і філіяў партыі. Шушкевіч наракаў, што партыя мае яшчэ 47 філіяў, якія не рэгіструюць праз праблемы зь юрыдычным адрасам.

На зьезьдзе партыя вырашала два асноўныя пытаньні: перадвыбарная платформа й вылучэньне кандыдатаў. Спрэчкі выклікалі абодва пункты. Супраць неканкрэтнасьці перадвыбарнай плятформы актыўна выступіў дэпутат Гарадоцкага райсавету Леанід Гаравы: «Як я з такой праграмай пайду да людзей на выбары? За што я іх буду агітаваць з такой плятформай?»

БСДГ вылучыла 16 партыйных кандыдатаў — у Менску (8 акругаў), Баранавічах (2), Гомелі, Маладэчне, Шуміліне, Бабруйску, Пінску, Магілёве. Сярод партыйных вылучэнцаў — такія вядомыя асобы, як С.Шушкевіч, Мечыслаў Грыб, Алег Волчак, Аляксей Кароль, Алег Трусаў. Тры партыйцы вылучаюцца толькі праз збор подпісаў, бо ў іхных акругах няма нізавых суполак.

Многія з партыйных кандыдатаў вылучаліся праз збор подпісаў. Некаторым, як, напрыклад, Сяргею Фаміну з Магілёва й Міхаілу Кавалькову з Бабруйску, не ўдалося прайсьці сіта рэгістрацыі. Іншым пашанцавала больш: Л.Гаравы ня толькі зарэгістраваў сваю групу, але ўжо сабраў больш за паўтары тысячы подпісаў. Ініцыятыўная група А.Трусава сабрала ў Купалаўскай акрузе №97 каля 700 подпісаў.

Дарэчы, Купалаўская акруга стала нагодай для ўнутрыпартыйных спрэчак. На яе прэтэндуюць два эсдэкі — Трусаў і лідэр колішняе Нацыянальнай партыі Анатоль Астапенка. Як патлумачылі дэлегатам прэтэндэнты, акруга «належала» раней Астапенку. Але падчас перадзелу, праведзенага Цэнтравыбаркамам на сёлетнія выбары, да яе «дарэзалі» раён, дзе жыве Трусаў. Цяпер старшыня ТБМ вядзе перадвыбарную кампанію праз ініцыятыўную групу. Астапенка ж групы не ствараў, але настойвае на тым, што акруга «ягоная». Вынік спрэчкі: за Астапенкава вылучэньне ад партыі прагаласавала крыху больш за палову дэлегатаў (32 чалавекі). Трусаў прыгразіў, што «будзе думаць» наконт акругі для вылучэньня, калі яму ўдасца сабраць належную колькасьць подпісаў.

**Аркадзь Шанскі**

# Лёгкае стоўпатварэньне дэмакратаў

Кааліцыя «Маладая Беларусь» падвяла прамежкавыя вынікі рэгістрацыі ініцыятыўных груп: 14 груп зарэгістраваныя, 7 групам у рэгістрацыі адмовілі. Шэсьць сяброў кааліцыі пасьля перамоў зь іншымі дэмакратычнымі кандыдатамі зьнялі свае кандыдатуры на карысьць мацнейшых і будуць удзельнічаць у іх выбарчых кампаніях. Чатыры незарэгістраваныя прэтэндэнты, магчыма, будуць вылучаны ад партыяў.

Паводле слоў лідэра кааліцыі Паўла Севярынца, найбольшыя шанцы на перамогу маюць актывісты «Маладой Беларусі» Алесь Зарамбюк у Мастах, Аляксей Шэін у Маладэчне, Мікола Арцюхоў у Нясьвіжы. Палова прэтэндэнтаў ужо набрала больш за тысячу подпісаў, дастатковую для рэгістрацыі кандыдата. Сам Севярынец у сваёй акрузе ў Віцебску «гатовы перамагаць любога кандыдата, хоць Лукашэнку», аднак не без агаворкі — «калі будуць сумленныя выбары».

Прадстаўнік кааліцыі «Маладая Беларусь» Зьміцер Дашкевіч, які балятуецца ў Купалаўскай акрузе Менску, задаволены тым, што да гэтай акругі прыпісаны ўсе 40 замежных участкаў для галасаваньня: «Мы ведаем, што беларусы за мяжой больш схільныя падтрымліваць дэмакратычныя каштоўнасьці». Дарэчы, у гэтай акрузе чакаецца лёгкае стоўпатварэньне дэмакратаў. Тутсама шукаюць шчасьця дзейны дэпутат Уладзімер Навасяд, лідэр ТБМ Алег Трусаў, прафдзяячка Валянціна Палевікова і актывіст БНФ Сяргей Мудрачэнка.

**Алесь Пяткевіч**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Юбілеі ў Кабыльніку

**Як ніколі сёлетняе лета на Мядзельшчыне багатае на юбілеі касьцёлаў. Так, 250-годзьдзе адзначыў храм у Мядзеле, 100-годзьдзе — у Шэметаве, традыцыйны Будслаўскі фэст праходзіў пад знакам 500-годзьдзя заснаваньня Будслава. А ў гэтыя выходныя вернікі адзначылі два сьвяты касьцёлу ў вёсцы Нарач (ранейшая назва — Кабыльнік) — споўнілася 570 год ад пабудовы першага драўлянага касьцёлу і 100 год кансэкрацыі (асьвячэньня) цяперашняга храму.**


WWW.CATHOLIC.BY

**У жніўні кардынал Казімер Сьвёнтак вандраваў па Мядзельшчыне: у Кабыльнік ён прыехаў з Шэметава.**

Крыху гісторыі. Першы храм пабудавалі тут князі Сьвірскія ў 1434 г. Драўляны касьцёл перабудоўвалі, урэшце ён згарэў у 1897 г. Тады і пачалі будаваць новы, мураваны. Будаўніцтва можна назваць народным, бо вялося яно стараньнямі і ахвяраваньнямі парафіянаў і людзей зь іншых мясцовасьцяў. Мясцовыя бабулі ўспамінаюць аповеды бацькоў пра тое, як дружна выходзілі людзі працаваць. Грошы на касьцёл прысылалі нават з Амэрыкі — землякі, якія падаліся туды на заробкі. Дагэтуль захоўваецца абразок, на адваротным баку якога згадваецца Ян Койра, што ахвяраваў на цэглу для храму 5 даляраў. Людзі ня толькі дапамагалі будаваць касьцёл, а нават і фрэскі малявалі — займаліся гэтым дзьве сястры-самавучкі.

Завяршылі будаўніцтва касьцёлу пры канцы 1901 г. Пасьля гэтага ў Вільні рэстаўравалі абразы, упрыгожвалі разьбой алтары. І вось надышоў дзень кансэкрацыі касьцёлу. Дзеля гэтага 25 ліпеня 1904 г. прыбыў сюды біскуп Эдвард Роп. «З самай раніцы людзі натоўпамі ішлі да сьценаў новага храму. Сабралася вялікая колькасьць ня толькі каталікоў, але і людзей іншых канфэсій», — піша пра гэту падзею дасьледчык, ураджэнец Кабыльніку Часлаў Каспарэўскі.

Шмат вернікаў сабралася ў прыгожа прыбраным касьцёле і праз 100 год. На сьвяткаваньні прыехаў і ксёндз-кардынал Казімер Сьвёнтак. Адслужыў ён урачыстую сьвятую імшу. Асьвяціў і гроту Маці Божай, пабудаваную ў гонар юбілею. Кардыналу вельмі спадабалася, што шмат было сярод вернікаў моладзі.

**Алесь Высоцкі, Мядзел**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Скаўты аблюбавалі Полацак

З 24 да 28 жніўня полацкая грэка-каталіцкая грамада прымала ў сябе групу беларускіх скаўтаў-«ваўчкоў» (гэта самая першая скаўцкая ступень, узрост 7—8 гадоў). Дзеці прыехалі ў Полацак з розных куткоў Беларусі — пераважна зь Менску і Магілёва. «Ваўчкі» маюць сваю адмысловую форму, гальштук. У Полацку яны наведвалі музэі, развучвалі скаўцкія песьні, практыкаваліся хадзіць шыхтом. Кожную раніцу над полацкім раёнам прыватнай забудовы Кароўнікі, дзе кватаравалі «ваўчкі», уздымаўся скаўцкі сьцяг.

На пачатку жніўня полацкія грэка-каталікі прымалі ў сябе больш дарослых скаўтаў. Якія, дарэчы, узялі ўдзел у прэзэнтацыі полацкага нумару часопісу «Arche», што адбылася ў Музэі беларускага кнігадрукаваньня.

## Росіцкія ўрачыстасьці

У Росіцы Верхнядзьвінскага раёну 20—21 жніўня адбыліся традыцыйныя ўрачыстасьці ў гонар айцоў-марыянаў Антонія Ляшчэвіча і Юр’я Кашыры, якія ў часы другой сусьветнай вайны загінулі пакутніцкай сьмерцю разам са сваімі парафіянамі. У Росіцкім касьцёле было наладжана ўрачыстае набажэнства. Велічна адбылася начное шэсьце з запаленымі сьвечкамі да месца спаленьня жыхароў вёскі і сьвятароў. Ва ўрачыстасьцях браў удзел генэрал манаскага ордэну марыянаў Марк Гарэл, які прыехаў з гэтае нагоды з Рыму, а таксама вернікі з розных мясьцін Беларусі.

**Васіль Кроква, Полацак**

## Гімназізацыя

З новага навучальнага году чатыры гомельскія школы пачынаюць працу ў новым статусе — як гімназіі. Зь іх дзьве шматпрофільныя і дзьве спэцыялізаваныя (бізнэс і права, лінгвістыка). Цяперака агулам у Гомелі ўжо 6 гімназій, як да 1918-га.

## Ня бачыў савы смаленай?

Такое пытаньне на Гомельшчыне зазвычай задаюць старыя падшыванцам, што гуляюцца з агнём. У вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёну дзевяцігадовы хлапчук вырашыў ня толькі сам гэную саву паглядзець, але і паказаць аднавяскоўцам. У выніку з дымам пайшлі тры хаты з прыбудовамі, ровар, трактар і плойма свойскае жывёлы.

## Алімпійскі патрыятызм

Гамельчукі шчыра радаваліся ўдачам беларускіх спартоўцаў на Алімпіядзе. Такога ажыятажу вакол тэлевідовішча не назіралася даўно. Усе спартовыя навіны абмяркоўваюцца ў транспарце, на вуліцы. Імя земляка-дзюдаіста Ігара Макарава, што прынёс Беларусі першы на гэтых Гульнях залаты алімпійскі мэдаль, гучыць у гутарках найчасьцей. Даводзіцца таксама чуць развагі, што той, хто ня сочыць за посьпехамі нашых алімпійцаў, не патрыёт.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## Рысі напалі на статак

А шостай ранку даяркі КУСП «Перамога», што на Івацэвіччыне, распачалі дойку ва ўрочышчы Беразіна. Раптам 248 кароў нібы звар’яцелі: кінуліся ў розныя бакі, нічога ня бачачы перад сабой ад страху. Гурт сабралі, прыгналі ў статак 60 рагуль, якія давялося шукаць некалькі дзён. Хто ж напужаў жывёлу? Людзі нічога падазронага ня бачылі. Аднак мясцовы трактарыст — зацяты паляўнічы — па пакінутых сьлядах назваў прычыну пярэпалаху: статак атакавала рысь з кацянятамі. Успомнілі, што нехта з паляўнічых бачыў у тых лясных мясьцінах чатыры рысі.

Паляўнічтвазнаўца раённага таварыства паляўнічых Мікола Лабко так пракамэнтаваў здарэньне: «Рысь — надзвычай асьцярожная дзікая кошка, яна вядзе скрытны лад жыцьця. На каровы нападае рэдка, такі выпадак быў гадоў сем таму… Кацяняты падрасьлі, дарослая рысь узялася іх вучыць, практычна паказвае сваім дзецям, як трэба паляваць».

## Брат — злодзей

Прыйшоўшы раніцай на працу, загадчыца крамы вёскі Глядзеньне заўважыла, што за ноч на паліцах прыкметна паменшала прадуктаў, гарэлкі й цыгарэтаў. Яна неадкладна выклікала міліцыю. Як жа была разгубленая работніца прылаўку, калі сьледзтва высьветліла, што адным са злодзеяў аказаўся яе брат — вучань 7-й клясы. Пададбраўшы зручны момант, падлетак скраў у сястры ключы ад крамы. На «справу» яго панесла з 16-гадовым сябруком, на якога заведзена крымінальная справа. Апошняму давядзецца адказваць за сябе і «за таго хлопца», якога праз малалецтва суд чапаць ня будзе.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

# Рэкорд аршанскай «Куцейны»

Аршанская філія віцебскага прадпрыемства «Дзяржбудунівэрсал» стала 14-й арганізацыяй, якая пад ціскам аршанскіх уладаў адмовіла рэдакцыі незалежнай газэты «Куцейна» ў арэндзе памяшканьня. Такім чынам, рэдакцыя ня можа набыць юрыдычны адрас і легальны статус. Кіраўнікі ахвотна пагаджаюцца здаць у арэнду пустыя памяшканьні ў будынках сваіх прадпрыемстваў. Праблемы пачынаюцца, калі Віктар Андрэеў, падпарадкоўваючыся заканадаўству, зьвяртаецца да гарадзкой вэртыкалі для «ўзгадненьня» новага юрыдычнага адрасу газэты. Кіраўнікі ўстаноў за адну ноч мяняюць сваё стаўленьне.

Гэтую традыцыю — не даваць уладкавацца ў горадзе незалежнай газэце — распачаў у Воршы яе былы мэр Валянцін Майсяюк. В.Майсеюка зачапіў артыкул у «Куцейне», які грунтаваўся на перададзеных супрацоўнікамі праваахоўных органаў матэрыялах разбору кватэрных махінацый. Тады й пайшла негалосная забарона на тутэйшыя незалежныя выданьні.

Цікава, што выдаўцы іншае аршанскае газэты «Тэлевестник» палічылі за лепшае накіраваць усіх супрацоўнікаў рэдакцыі ў пазатэрміновы адпачынак і перапыніць выхад газэты да заканчэньня выбараў у «палатку».

Тым часам В.Андрэеў спадзяецца, што падступныя захады ўладаў гэтым разам будуць выкрыты, бо з прадпрыемствам «Дзяржбудунівэрсал» ён пасьпеў заключыць дамову і нават заплаціў арэндную плату за паўгоду. На прапановы кіраўнікоў «Дзяржбудунівэрсалу» адмовіцца ад арэнды ён не пагаджаецца і рыхтуецца да разгляду справы ў судзе. Тым часам дасьціпныя знаёмцы раяць яму паралельна з судовым пазовам падаць заяўку ў Кнігу рэкордаў Гінэса.

**Міхал Чарвінскі, Віцебск**

# БДЭУ самы папулярны

**Лідэрамі сёлетняй абітурыенцкай кампаніі сталі спэцыяльнасьці «Лінгвістычнае забесьпячэньне міжкультурных камунікацыяў» у БДЭУ (27,8 заявы на месца), «Міжнародныя адносіны» (19,9) і «Псыхалёгія» (15,7) у БДУ. БДЭУ трымае першынство й па агульным конкурсе — 5,5 прэтэндэнта на месца. На другім месцы — мэдунівэрсытэт (5), на трэцім — Гомельскі інжынэрны інстытут МНС (4,8).**

Не нашмат меншым, чым на стацыянар, быў конкурс і сярод завочнікаў. Так, у пэдунівэрсытэт імя М.Танка было 3,1 прэтэндэнта на месца. Прычым першае месца ўзяла спэцыяльнасьць «Псыхалёгія. Псыхалёгія прадпрымальніцкай дзейнасьці» (12 заяў на месца), а апошняе — «Геаграфія» (1,46).

Хоць конкурс у ВНУ сёлета быў вышэйшым, чым летась (3 абітурыенты на месца супраць ранейшых 2,7), былі й правальныя спэцыяльнасьці. Наагул не было ахвотных ісьці на спэцыяльнасьць «Дзяржаўнае кіраваньне. Эканоміка» ў Віцебскі ўнівэрсытэт і на «Музэйную справу й ахову гісторыка-культурнай спадчыны» ў Гарадзенскі. Няма пэрспэктыў! Гэтаксама як не адчуваюць абітурыенты пэрспэктыў у сельскагаспадарчых спэцыяльнасьцях: у аграрна-тэхнічным унівэрсытэце конкурс склаў 1,9 чалавека на месца, у Горацкай акадэміі — 1,6, у Віцебскай акадэміі вэтэрынарнай мэдыцыны — 1,5.

Апроч абавязковых тэстаў па беларускай (расейскай) мове, абітурыенты маглі паспрабаваць свае сілы ў платных тэстах у ВНУ па іншых прадметах. Вынікамі тых тэстаў пры паступленьні скарысталіся толькі 8749 чалавек. Значна большая частка (18052) вырашыла паўтарыць спробу на ўступных іспытах.

Сёлетняя ўступная кампанія стала першым крокам да пазбаўленьня ад ільгот. Мэдалісты сёлета паступалі на агульных падставах — 102 зь іх іспыты «завалілі». Своеасаблівымі «льготнікамі» пакуль застаюцца пераможцы алімпіяд. Сёлета было 376 такіх шчасьліўцаў: 231 — пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд, 131 — алімпіяд БДУ, 4 — ляўрэаты спэцфонду прэзыдэнта, 10 — чэмпіёны кантынэнту, сьвету і Алімпійскіх гульняў.

Другая льготная катэгорыя — вясковыя жыхары: паводле Правілаў прыёму, для іх былі прадугледжаныя палёгкі пры паступленьні. Таму колькасьць студэнтаў зь вёскі ў параўнаньні зь мінулым годам вырасла з 3330 да 4001. Усяго ж на бясплатныя месцы прынята 24 тысячы абітурыентаў.

**АВ**

# Мікалай Калінін:
# «Штампік у пашпарце ня значыць

**Якія асацыяцыі ў вас нараджае слова «цыганы»? Галасістыя цёткі, што на вакзалах ды базарах навязьліва прапануюць паваражыць? Шэдэўр савецкага кінэматографу «Табар адыходзіць у неба»? Гітарныя пераборы ды надрыўны стогн скрыпак? Насамрэч гэта ўсё мае вельмі ўскосныя адносіны да рэальнага цыганскага жыцьця — жыцьця із сваімі законамі і правіламі, сваім маральным кодэксам і нормамі паводзін, сваёй мовай і культурай. Для нас іх сьвет цалкам закрыты. Прыадкрыць гэты сьвет згадзіўся Мікола Калінін, каардынатар праекту «Прававая дапамога прадстаўнікам цыганскага насельніцтва Беларусі».**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Колькі ў нашай краіне цыганоў?**

**Мікола Калінін:** Сёньня існуюць дзьве лічбы. Адна зь іх дзяржаўная, якая не адпавядае рэчаіснасьці. І іншая лічба, якую дае, напрыклад, беларуская асацыяцыя цыганоў «Рома», — каля сямідзесяці тысяч цыганоў. Найбольш кампактна яны жывуць у мястэчках. Каля Віцебску, за цэнтрам гораду, існуе цэлы цыганскі пасёлак Себяхі. Вельмі шмат цыганоў. Асабліва пасьля таго, як там аселі малдаўскія цыганы-бежанцы.

**«НН»: А качавых цыганоў ужо не засталося?**

**МК:** Не, чаму? Існуюць качавыя цыганы, напрыклад таджыкія цыганы, якія называюць сябе «люлі». Прыкладна два гады таму іх было вельмі шмат у Менску. Асабліва ў цэнтры гораду. Існуюць, безумоўна, румынскія і вугорскія цыганы і цыганы Закарпацьця. Ну, яны качавыя не таму, што ім гэта падабаецца. Яны адтуль бягуць. Калісьці яны былі прыбеглі сюды, пажылі некаторы час, а затым зьбеглі адсюль. Бо тут такое самае становішча для цыганоў, як у Закарпацьці ці ў Таджыкістане.

**«НН»: А што гэта такое — «нарадзіцца цыганом»? У Беларусі…**

**МК:** Гэта гора. Ад самага дня нараджэньня вы адчуваеце, што вы ізгой, што вы не такі, як усе. Гэта ідзе за вамі ўсё ваша жыцьцё. Ад нараджэньня, ад таго, як вы ідзяце ў школу, вы пачынаеце адчуваць сябе іншым чалавекам. І справа ня ў вас, а ў тым, што так да вас ставяцца іншая. Нічога добрага ў тым, каб «нарадзіцца цыганом», я ня бачу.

**«НН»: Людзі ходзяць у школу. А ці паступаюць у інстытуты?**

**МК:** Паступаюць. Але цыганы з вышэйшай адукацыяй — гэта нейкія выключныя людзі. Іх вельмі мала. Цыганы ня маюць сярэдняй адукацыі, бо вельмі складанае жыцьцё. Трэба зарабляць грошы, а не вучыцца. Гэта могуць дазволіць сабе вельмі багатыя сем'і, каб, напрыклад, дзяўчына была адукаваная. Мела 12 клясаў адукацыі. Для астатніх гэта вельмі праблематычна. Лепей паслаць яе на базар, каб яна гандлявала нейкімі шмоткамі і прыносіла грошы. Што тычыцца вышэйшай адукацыі, прывяду адзін факт. На тэрыторыі Польшчы, усёй Прыбалтыкі і Беларусі — толькі два цыганы-юрысты. І гэта на пяць краін. І я адзін зь іх. Гэта катастрофа. Уладзе трэба задумацца — а што будзе далей? Гэта ж людзі. І калі яны будуць неадукаваныя, дык куды ім ісьці? Яны сыдуць у цень. У ценявы бізнэс. І нічога добрага ні для цыганоў, ні для ўлады я тут ня бачу.

**«НН»: І хто вінаваты ў такім становішчы? Дзяржава ці ўклад жыцьця цыганоў?**

**МК:** Цыганскі ўклад жыцьця тут ні пры чым. У Савецкім Саюзе існавала нейкая дырэктыва, згодна зь якой да цыганоў, што жадалі атрымаць вышэйшую адукацыю, ставіліся ляяльна. 99 працэнтаў цыганоў, якія цяпер маюць вышэйшую адукацыю, — людзі сталага веку. І бяда ў тым, што моладзь зусім неадукаваная. Працэнтаў 95 цыганскай моладзі ня маюць пяці клясаў пачатковай школы. А ўсе адукаваныя — гэта старыя. А тыя, хто цяпер з моладзі адукаваны, — гэта, безумоўна, цуд. Традыцыйны ўклад жыцьця ні пры чым. Цыганы здольныя да навук. Вельмі цікавяцца навукамі. Але справа ў тым, што немагчыма паступіць у той ці іншы інстытут. Вось вам жывы прыклад.

> У цыган свае законы адносна аліментаў. На адно дзіця аліменты ня плацяцца. На дваіх — мужчына павінен купіць дзецям кватэру.

Цыган з гораду Слуцку скончыў школу з залатым мэдалём. І прыехаў у Менск паступаць у эканамічны ўнівэрсытэт. Ну, ён з выгляду такі чарнявы. І нацыянальнасьць у пасьведчаньні аб нараджэньні. І яму проста адмовілі. Нават не прынялі ягоных дакумэнтаў. Тады што? Ягоны бацька, стары бацька, прыехаў сюды ў Менск, пайшоў сварыцца з гэтымі чыноўнікамі. Яны яго наагул адштурхнулі, гэтага бацьку. «Ідзі ты куды далей». Тады ён зьвярнуўся ў ААН. І нейкі добры чалавек пашкадаваў гэтага хлопца і тэлефонным званком папрасіў свайго сябра ў магілёўскім унівэрсытэце — вазьмі яго, чалавек хоча вучыцца. Гэта нармальная сытуацыя? І такіх прыкладаў шмат. І я ня мог паступіць у дзяржаўную ВНУ ніяк. Я навучаўся на грошы Сораса ў прыватным інстытуце.

**«НН»: І дзе выйсьце?**

**МК:** Цыганам трэба арганізоўвацца, і мы будзем арганізоўвацца.

## Барону рэкляма без патрэбы

**«НН»: Вобраз цыгана-махляра, які ствараюць варажбіткі на вакзалах, — наколькі ён адпавядае рэчаіснасьці і які працэнт сярод цыганоў менавіта гэтых людзей?**

**МК:** Справа ў тым, што цыганкі-махляркі, якія на вакзале варожаць… усе аб гэтым ведаюць. Усе беларусы ведаюць, што гэта цыганкі-махляркі. Але ж нічога ня зробіш, людзі самі ідуць да іх. І калі чалавек дурань, дык нічым яму не дапаможаш. Хтосьці яго абавязкова ашукае. Цыганка, ці іншы беларус, ці габрэй, ці татарын. Ня мае значэньня. Усе ведаюць, што цыганы, якія прапануюць паваражыць, сапраўды падманваюць. Што датычыцца іх колькасьці… Існуюць, безумоўна, дрэнныя людзі ў любой нацыі. Нельга па некалькіх людзях меркаваць аб усёй нацыі. Безумоўна, існуюць жанчыны-цыганкі, якія валодаюць экстрасэнсорным дарам. Яны дапамагаюць у розных праблемах. А калі да вас недзе на вакзале падыходзіць цыганка, я яшчэ раз паўтаруся, адыдзіце ад яе. Ну, калі вам хочацца, каб вас ашукалі, тут я вам дапамагчы не магу.

**«НН»: Але нашай прэсе нельга закінуць, што яны ствараюць нэгатыўны імідж цыганам. Апошнім часам я некалькі разоў бачыў інтэрвію з цыганскімі баронамі. І ўсё гэта так вясёла, так фэрычна. Што вы на гэта скажаце?**

**МК:** Улады ніякай увагі на праблемы цыганоў не зьвяртаюць. Калі яны і гавораць, дык толькі што, маўляў, справы ў цыганоў добрыя, што ў іх усё выдатна. А што да інтэрвію, якія даюць «бароны» ў дзяржаўных СМІ, — гэта хлусьня. Сапраўднаму цыганскаму барону рэкляма не патрэбна. Яна яму толькі зашкодзіць.

**«НН»: А тое, што мы чытаем?**

**МК:** Гэта маскарад. Гэта дзяржбясьпека стварыла такіх «цыганскіх лідэраў». Іх два ў Беларусі, іх усе ведаюць дакладна. Але ніякага ўплыву сярод цыганоў яны ня маюць. Цыганы самі не пажадаюць, каб сапраўдны цыганскі барон даваў якія-небудзь інтэрвію. Яму проста не дазволяць, каб ён называў сваё прозьвішча.

## «Руска», «халадытка» і «сэрвы»

**«НН»: А чаму такая закрытасьць?**

**МК:** Справа ў тым, што цыганы самі па сабе вельмі закрытыя людзі. Гэта закон прыроды, калі так можна сказаць. Калі мы будзем адкрытыя, мы ня зможам сябе захаваць як этнас, як народ. Таму ў нас вельмі мала міжнацыянальных шлюбаў. Яны ніколі сярод нас не віталіся і ня будуць вітацца. Мы павінны захаваць сябе як народ. Гэта закон прыроды. Кожны цыган, кожная цыганка з маленства ведаюць аб тым, што мы іншыя. Так, мы адрынутыя, так, мы гнаныя. Але мы ганарлівыя, мы сябе захаваем. Мы здолелі захаваць і сваю мову,



Стэрэатыпы пра цыганоў ва ўсім сьвеце аднолькавыя. Не пазьбегнуў іх і культавы рэжысэр Гай Рычы. У яго жудкавата-іранічным баевіку «Snatch» (2000) брытанскія цыганы (галоўнага сыграў Брэд Піт) — паўкрымінальная супольнасьць. Яны жывуць у лёгкіх аўтапрычэпах, выглядаюць мала чым розьняцца ад англасаксаў, але вельмі неразборліва гавораць па-ангельску — калі ім гэта выгадна. Апроч таго, фэнамэнальна б'юцца і ўмеюць бяз знаку зьнікаць. Згодна з законам жанру, вобраз станоўчы.


PHOTO.BYMEDIA.NET

> Працэнтаў 95 цыганскай моладзі ня маюць пяці клясаў пачатковай школы. Трэба зарабляць грошы, а не вучыцца.

# нічога»

і сваю культуру. Нягледзячы на тое, колькі стагодзьдзяў мы гнаныя, мы захавалі ўсё і нідзе не асымляваліся.

**«НН»: А ці адрозьніваюцца беларускія цыганы ад сваіх аднаплямеńнікаў, скажам, у Расеі?**

**МК:** На самай справе беларускіх цыганоў наагул не існуе. Беларускія цыганы ўсе былі зьнішчаны падчас другой сусьветнай вайны атрадамі СС. Абсалютна ўсе, за выключэньнем дзьвюх сем'яў, якія жывуць цяпер у Давыд-Гарадку. Але наяўнасьць гэтых дзьвюх сем'яў, на мой погляд, не дазваляе зрабіць выснову, што існуюць беларускія цыганы як этнас. Не. У Беларусі існуюць тры этнічныя падгрупы. Віцебск, Полацак — «руска рома», як яны сябе называюць. Я да іх адношуся. Гэта цыганы, якія прыйшлі сюды з Расеі — Пскоўшчыны, Карэліі, Падмаскоўя. Гэта агромністая група. Менскія цыганы — гэта польска-прыбалтыйская група, яны называюць сябе «халадытка рома». Гэтая група прыйшла пасьля вайны з тэрыторыі Польшчы, Чэхіі і Прыбалтыкі. У іх шмат там радні. І трэцяя група — гэта Гомель, Магілёў, Палесьсе. Гэта «сэрвы», украінска-малдаўска-вугорская група. Яны прыйшлі з тэрыторыі Ўкраіны ў Беларусь, але іх шлях ляжаў праз Вугоршчыну і Малдову. Гэтыя тры групы вельмі адрозныя паміж сабой, і паміж імі няма нават шлюбаў. Мова адна, вера адна. Праваслаўе. За выключэньнем літоўскіх цыганоў, бо яны каталікі. Літоўскія цыганы — вельмі сапраўдныя каталікі, паважаюць веру, у касьцёл заўжды ходзяць. Іх шмат жыве ў Зялёным Лузе і ў Ратамцы.

## Цыганская дзяржава

**«НН»: Як цікава! І што, на вашу думку, трэба рабіць, каб «нарадзіцца цыганом» не было горам?**

**МК:** Зьмяніць адносіны нашай дзяржаўнай улады да нацыянальных меншасьцяў. Калі дзяржава будзе паважаць правы чалавека, тады і да цыганоў будзе іншае стаўленьне. У ідэале трэба, каб была цыганская школа. Згодна з Законам аб адукацыі, мы маем права навучацца на роднай мове. Для нас беларуская, расейская альбо іншыя мовы — ня родныя. Патрэбен, безумоўна, культурны цыганскі цэнтар. Такі, які існуе ў Літве. Безумоўна, патрэбна дзяржаўная праграма па вырашэньні цыганскага пытаньня, ліквідацыі непісьменнасьці і беспрацоўя сярод цыганоў. Вось вам жывы прыклад. У Вільні існуе дзяржпраграма па ліквідацыі беспрацоўя сярод цыганоў. Любы цыган, які прыйдзе ў мэрыю гораду Вільні, атрымае працоўныя вакансіі. І ніхто, акрамя цыганоў, гэтых вакансій заняць ня можа.

**«НН»: А наколькі цыганы інтэграваныя ў беларускае грамадзтва?**

**МК:** Зусім неінтэграваныя. Мы грамадзтва ў грамадзтве. У цыганоў існуюць свае законы, свой цыганскі суд, свае цыганскія нормы паводзінаў, свая цыганская мараль, сваё цыганскае сьветаўяўленьне. Якое абсалютна адрозьніваецца ад вашага ўяўленьня. Ёсьць і комплекс непаўнавартасьці, які нам дзяржава стварыла. Што тычыцца шлюбнага права — у цыганоў штампік у пашпарце ня значыць абсалютна нічога. У нас адносіны больш шчырыя. Тая жанчына, зь якой вы жывяце, і называецца вашай жонкаю. А пашпарт ня мае ніякага значэньня. У цыган свае законы адносна аліментаў. На адно дзіця аліменты ня плацяцца. На дваіх — мужчына павінен купіць дзецям кватэру. Цыганы вельмі рэдка зьвяртаюцца ў дзяржаўныя ўстановы, у суды для вырашэньня праблем паміж сабою. Для гэтага існуе цыганскі суд.

**«НН»: Які выносіць і сьмяротныя пакараньні?**

**МК:** Сьмяротны прысуд мае права вынесьці толькі сам барон. Але аб ягоным рашэньні ніхто не павінен ведаць. Самі разумееце, гэта не публічны суд. А што да маёмасных спрэчак, дык гэты суд заўжды публічны. У ім абодва бакі маюць роўныя правы. Кожны з бакоў павінен давесьці факт вінаватасьці ці невінаватасьці. І рашэньне, якое выносіць суд, безумоўна публічнае. Існуе права крэўнай помсты. Існуе ў цыган і дуэль як сродак вырашэньня спрэчак. Калі ня могуць дамовіцца, проста выходзяць і страляюцца. У гэтым выпадку бок палеглага права крэўнай помсты ня мае. Таму што ад пачатку іх сваяк сам ведаў, на што ішоў. Паўсюль свая спэцыфіка. Свой лідэр. Гэта ня той лідэр, я паўтаруся, пра якога пішуць у газэтах. Існуе чалавек. Яму 72 гады. Ён жыве ў горадзе Віцебску. Чалавек, які ня толькі здолеў у 25 гадоў атрымаць гэты тытул, але і да сёньняшняга часу яго пацьвярджаць. Цыганы вельмі рэдка глядзяць беларускае тэлебачаньне. У асноўным цыганам падабаюцца індыйскія фільмы, бо мы самі родам адтуль.

> • Калі чалавек дурань, хтосьці яго абавязкова ашукае. Цыганка, ці іншы беларус, ці габрэй, ці татарын.

**«НН»: Вы ня бачыце небясьпекі таго, што адстойваньне правоў цыганоў будзе непазьбежна весьці да асыміляцыі і страты нацыянальнага ладу жыцьця?**

**МК:** Не, гэтага не адбудзецца. Вось вам прыклад — габрэі. Нягледзячы на стопрацэнтную інтэграцыю, на стопрацэнтную асыміляцыю, ніхто зь іх сябе габрэем лічыць не перастаў і ніколі гэтага ня здарыцца. Асыміляцыя ці неасыміляцыя залежаць ад нацыянальнай сьвядомасьці самога народу. Трэба нешта рабіць цяпер, бо колькасьць цыганоў няўхільна зьніжаецца. Сацыяльная неўладкаванасьць, беспрацоўе, нізкі матэрыяльны дастатак цыганоў, безумоўна, сказваюцца як на нараджальнасьці, так і на сьмяротнасьці. І міграцыя. Чэхія, Славакія і Беларусь — гэта дзяржавы, у якіх стаўленьне да цыганоў самае нэгатыўнае ў Эўропе. І самае нэгатыўнае, можа, на ўсёй зямной кулі. Бо ў ЗША і Канадзе таксама вялікая колькасьць цыганоў жыве, але ніводнага выпадку дыскрымінацыі з боку прадстаўнікоў улады няма. А ў Славакіі давялі цыганоў да таго, што яны пачалі браць у рукі зброю і рабаваць крамы. Афіцыйныя ўлады былі вымушаны нават пасладзь войскі для падаўленьня гэтых бунтаў.

Летась зь Беларусі выехалі ў Вялікую Брытанію як палітычныя бежанцы 80 сем'яў. І гэта толькі ў Брытанію. Агулам зьехала ня менш за 300 сем'яў. З аднаго Жодзіна зьехала 12 сем'яў адразу. Нямеччына іх прыняла. Эміграцыя калясальная. Я ня думаю, што да наступнага году цыганоў у Беларусі застанецца такая ж колькасьць, як цяпер. Адсюль нават таджыцкія цыганы ўцяклі. У Скандынавію.

**Гутарыў Зьміцер Бартосік**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Як зьлічыць габрэяў?

**Афіцыйныя зьвесткі — 23 тысячы, на 7 тыс. меней, чым было пяць гадоў таму. Аднак рабіны налічваюць такіх 50 тыс., а права на рэпатрыяцыю ў Ізраіль маюць нават 73 тысячы.**

Напачатку — да гісторыі пытаньня. Згодна зь перапісам 1989 г., габрэяў у БССР налічылі 110 тысяч. Зразумела, што ўлік ішоў паводле знакамітай пятай графы. Лічба гэтая, як і ўсе іншыя ў гэтым пытаньні, прыблізная. Многія, маючы габрэйскую маці, у пашпартах пісаліся па бацьку. Ды і так званыя «чыстыя» габрэі таксама. Віцебскі часопіс «Мишпоха» падае такую гісторыю: габрэй быў расейцам паводле пашпарта, а ў партбілеце значыўся габрэем. І цалкам шчыра казаў: «Я не магу падманваць партыю». (Зразумела, што ўсё гэта было не ад добрага жыцьця.)

Перапіс 1999 г. назваў лічбу 30 тысяч. Пяты пункт адмянілі і перапіс праводзілі паводле заяўляльнага прынцыпу. Г.зн. як сябе назвалі. Тут таксама можна знайсьці прыблізнасьць зьвестак. Насьцярожанасьць і ў тыя часы дэмакратычных нормаў была небесьпадстаўнай, і, відавочна, ня ўсе аб сабе заявілі. У год зьяжджае прыблізна тысяча, і да цяперашняга часу афіцыйныя зьвесткі наступныя: 23 тысячы (гэта, зноў-такі, наўскідку), зь іх 8 тыс. у Менску.

Габрэйскія арганізацыі называюць іншыя лічбы. Старшыня Юдэйскага рэлігійнага аб'яднаньня (артадаксальны юдаізм) Юры Дорн адзначыў, што «па зваротах у габрэйскія арганізацыі мы адсочваем 50 тысяч». Аднак жа ёсьць багата людзей з габрэйскай крывёй, што аніводнага разу не кантактавалі з габрэйскімі арганізацыямі. Паводле ацэнак Саюзу беларускіх габрэйскіх грамадзкіх аб'яднаньняў і супола (старшыня Леанід Левін), у Беларусі блізу 73 тыс. тых, што маюць права на рэпатрыяцыю.

Што ўяўляе сабой гэтае права на рэпатрыяцыю? Пасьля ўтварэньня Дзяржавы Ізраілю быў прыняты ключавы закон — «Аб вяртаньні». Паводле яго, права на рэпатрыяцыю мае той, у каго 1/4 габрэйскай крыві. Такая норма ўзялася не са стол. Закон прымаўся пасьля другой сусьветнай вайны, паколькі паводле Нюрнбэрскіх палажэньняў 1935 году габрэем лічыўся той, у каго ёсьць чвэрць габрэйскай крыві. Таму і права на прытулак у Ізраілі давалася паводле такой нормы.

Рэпатрыяцыйную норму ня варта блытаць з рэлігійным заканадаўствам — Галахай, паводле якога габрэем лічыцца чалавек, які мае маці-габрэйку. Галаха выкладзена ў першай, самай старадаўняй кнізе Талмуду — Мішне (часам кажуць: Мішна і Талмуд). Аднак рэлігійнае заканадаўства адбілася ў законе аб рэпатрыяцыі. Бо сьцяг Ізраілю — малітоўны ручнік, што падкрэсьлівае сувязь з рэлігіяй. (Вярхоўны рабінат у Ізраілі, па сутнасьці, адзін з органаў улады.) Галахічны габрэй (габрэй па маці) атрымлівае пры рэпатрыяцыі ізраільскае грамадзянства аўтаматычна. Не прымаючы юдаізму, ня робячы брыт-мілы (абразаньня). Чалавек з правам на рэпатрыяцыю (габрэй бацька або дзед) для атрыманьня ізраільскага грамадзянства павінен прыняць юдаізм і зрабіць брыт-мілу. (Любы чалавек, які прыняў юдаізм, лічыцца габрэем.)

Здавалася б, гэта законы Ізраілю, але яны знайшлі сваё адлюстраваньне ў габрэйскіх арганізацыях Беларусі. У клюбах, курыраваных «Сахнут» — Сусьветным габрэйскім агенцтвам для Ізраілю, што займаецца рэпатрыяцыяй, напрыклад, у моладзевым клюбе «Гілель», бяруць удзел юнакі й дзяўчаты з габрэйствам па бацьку, дзеду. У мерапрыемствах «Сахнут» удзельнічаюць нават негабрэі, што маюць габрэйскіх сваякоў. У гэтым сэнсе характэрны публікацыі органу «Сахнут» — «Вестника Еврейского агенства России».

Арыэль Шарон заявіў: «Ізраілю патрэбны мільён рэпатрыянтаў». Але адкуль узяць мільён, калі ва ўсёй СНД габрэяў некалькі соцень тысяч? «Нехай яны возьмуць сваіх расейскіх сваякоў», — адказвае «Вестник ЕАР».

Гэта нагадвае показку пра бязьдзетную ўкраінскую сям'ю. Муж паехаў у дзіцячы дом і ўзяў дзіця. «Іванка, він дужэ чэрнэнькый... Можа, жыд?» — пытае жонка. «Затое не кацап!» — адказвае сужэнец.

Як бачна з вышэйпададзенага, розьняцца ацэнкі артадаксальнага юдаізму і Саюзу, у якім усё больш прыметную ролю адыгрывае яго віцэ-старшыня, лідэр прагрэсіўнага (рэфармісцкага) юдаізму Якаў Басін. Рэфармісты наагул адзначаюцца больш цярплівым стаўленьнем да асоб зь мяшаных шлюбаў. Якаў Басін з старонак газэты «Авіў» назваў габрэйскі шавінізм (ушчамленьне паўгабрэяў) «лайном».

Хаця ад рэфармізму недалека да юдэахрысьціянства. Той самы Басін у інтэрвію «Авіву» сказаў наступнае: «Ёсьць кепскія юдэахрысьціяне, а ёсьць добрыя. Мы супрацоўнічаем з добрымі».

Сапраўды, у Менску дзьве суполкі мэсіянскіх габрэяў — «Габрэяў за Ісуса»: «Зорка Бэтлеему» (рабін Уладзімер Хасін) і «Новы Запавет» (рабін Стуард Вінаград). Яны распаўсюджваюць адпаведны часопіс «Виноградник», які выдаецца ў ЗША па-расейску.

Пастар С.Вінаград прыехаў з ЗША. У мінулым ён быў рабінам. Мэсіянскія габрэі адзначаюць усе габрэйскія сьвяты, шануюць Ізраіль. Габрэй-хрысьціянін атрымлівае ізраільскае грамадзянства, калі праўжыве ў краіне працэдку дзесяць год.

Я.Басін бярэ ўдзел у служэньнях «Новага Запавету», нават мэсіянскія габрэі шмат узялі ад рэфармістаў — гэта таксама клюб па інтарэсах. Эвангельскія габрэі сябруюць з баптыстамі, тыя дапамагаюць ім у эвангелізацыі габрэяў. Служэньні ў юдэахрысьціянаў — гэта сумесь юдаізму і пратэстантызму.

Як бачыце, у Беларусі застаецца зусім ня так мала габрэяў, як можна падумаць, зыходзячы са зьвестак афіцыйных дадзеных.

**Сяргей Носаў**

**Частка прадстаўнікоў нацменшасьці заўжды пішацца карэннай нацыянальнасьцю. Пры ацэнцы памеру нацыянальных групаў няможна кіравацца лічбамі перапісу. Меншасьці звычайна большыя, чым падаюцца, і таму патрабуюць большае ўвагі. Але якія крытэры браць? У габрэяў, да прыкладу, усё зусім заблытана.**

# На якой мове зьвініць званок

**У 2004/05 навучальным годзе ў трох менскіх школах зьявяцца польскамоўныя клясы. Доля беларускамоўных школьнікаў падае ўжо дзесяць гадоў.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

Сёлета школьнікі нашай краіны будуць вучыцца на шасьці мовах — беларускай, расейскай, польскай, габрэйскай, украінскай, літоўскай. Пакуль што чыноўнікі Міндукацыі ня могуць даць ані дакладных, ані прыблізных лічбаў наконт падзелу вучняў і школаў паводле моўнай прыметы, кажуць, што ўсё будзе вядома толькі пры канцы верасьня. Пакуль жа ёсьць зьвесткі толькі па 2003/04 навучальным годзе. Зрэшты, і яны досыць красамоўныя. Беларускамоўных школьнікаў усё менш, і ніводнаму з папярэдніх міністраў адукацыі не хапіла волі ці фантазіі, каб гэтую тэндэнцыю пераламіць.

Па стане на 2003/04 навучальны год у 2503 агульнаадукацыйных школах і школах-інтэрнатах, пераважна дробных і вясковых (59,5% ад іх агульнай колькасьці) навучаньне вялося на беларускай мове, у 1337 школах, пераважна гарадзкіх і буйных (31,8%) — на расейскай, у 366 школах (8,7%) — на дзьвюх мовах: расейскай і беларускай.

У 186 школах выкладаньне вялося на мовах нацыянальных меншыняў Беларусі: 182 з польскай мовай, 2 зь літоўскай і па 1 — з украінскай і габрэйскай. Прычым ніводнай школы нацменшыняў няма ў Магілёўскай і Менскай абласьцях.

**Адам Воршыч**

**Доля вучняў, якія навучаюцца па-беларуску (% ад агульнай колькасьці вучняў)**

| | 1997/98 | 1998/99 | 1999/00 | 2000/01 | 2001/02 | 2002/03 | 2003/04 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Менск | 13,4 | 11,2 | 9,5 | 8,4 | 7,3 | 6,4 | 5,1 |
| Берасьцейская | 33,4 | 32,0 | 30,7 | 30,2 | 28,8 | 27,6 | 26,9 |
| Віцебская | 26,2 | 25,2 | 25,9 | 24,5 | 23,8 | 23,0 | 23,1 |
| Гомельская | 21,9 | 20,7 | 20,4 | 20,3 | 19,8 | 18,9 | 18,4 |
| Гарадзенская | 51,5 | 51,0 | 50,3 | 48,3 | 45,9 | 41,9 | 38,1 |
| Менская | 54,5 | 54,4 | 54,0 | 52,6 | 50,8 | 47,9 | 44,5 |
| Магілёўская | 22,6 | 22,1 | 22,9 | 21,6 | 21,0 | 20,8 | 19,9 |
| Агулам | 31,6 | 30,5 | 30,0 | 29,0 | 27,8 | 26,3 | 24,8 |

Крыніца — сайт Міндукацыі.

**Колькасьць школьнікаў, якія вывучалі ў 2003/04 г. мовы нацыянальных меншыняў**

| Мова | польская | габрэйская | украінская | літоўская |
|---|---|---|---|---|
| Колькасьць вучняў | 8896 | 352 | 114 | 71 |

## Беларускі выбар сям'і Каральковых

**1 верасьня Мікіта Каралькоў пойдзе ў першую беларускую клясу, у тую ж школу, дзе вучыцца ягоная сястра Марыйка.**

Два гады таму гэтая дзяўчынка прайшла праз буру, калі яе бацькі запатрабавалі для яе права на атрыманьне адукацыі на роднай мове. Марыя вучыцца паводле індывідуальнага пляну. Тыя прадметы, якія выкладаюцца для ўсяе клясы па-расейску, дзяўчына вывучае асобна. 6-ы год Марыся скончыла на «дзявяткі» й «дзясяткі» па ўсіх прадметах, акрамя расейскай мовы.

Брат Мікіта будзе навучацца па-беларуску з трыма іншымі хлапчукамі. Школа сама запрасіла Каральковых аддаць сына ў беларускую клясу. 4-я школа ў Горках упершыню адкрыла беларускую клясу. Каб у кожным горадзе было хоць па адной беларускай школе — такую мэту вызначыла Міністэрства адукацыі. На месцах з гэтым, аднак, не сьпяшаюцца.

**Мікола Бугай**

## Адна Яніна ў Магілёве

Толькі адна заява на беларускамоўнае навучаньне ў 1-й клясе пададзена сёлета ў Магілёве. Яніне Асіпцовай не давядзецца вучыцца пабеларуску, як гэтага хацелі яе бацькі. Аддзел адукацыі Ленінскага раёну Магілёву ня можа арганізаваць беларускамоўную клясу для аднае вучаніцы. З гэтай нагоды адміністрацыя школы патрабавала ад Яніііных бацькоў забраць заяву на беларускамоўнае навучаньне й перапісаць на расейскамоўнае. «Нам сказалі: інакш будзе выглядаць так, нібы мы ня можам забясьпечыць выкананьне вашых пажаданьняў», — кажа Алесь Асіпцоў, бацька першаклясьніцы.



Бацькі перапісваць заяву адмовіліся. Праўда, Яніна ўсё адно будзе навучацца па-расейску. А.Асіпцоў спадзяецца, што бліжэйшым часам усё ж удасца знайсьці варыянт беларускамоўнага навучаньня — праз газэтныя публікацыі. На думку Алеся, віны аддзелу адукацыі ці грамадзтва няма. Гэта не віна, а бяда, і сям'я Асіпцовых імкнецца «вырашыць праблему ў духу дыялёгу, а не канфрантацыі».

Каб Таварыства беларускай мовы магло нагадваць кожнай сям'і шасьцілетак пра магчымасьць вучыцца па-беларуску, беларускія групы набіраліся б. Пакуль жа мала хто ведае, што такое ўвогуле мажліва.

**АШ**

## Ліцэісты пакляліся перад Быкавым

Ліцэйскі Дзень ведаў быў пазначаны трыма знакавымі месцамі. Лінейка адбылася каля будынку на вуліцы Кірава. Туды прыйшлі 100 ліцэістаў, выпускнікі, настаўнікі, бацькі й проста неабыякавыя. У сваёй прамове Лявон Баршчэўскі адзначыў, што сёньня выкладчыцкі калектыў ліцэю — наймацнейшы ў Беларусі: 2 дактары навук, 4 дацэнты, 7 кандыдатаў навук.

Пасьля лінейкі ліцэісты накіраваліся на Ўсходнія могілкі — ускласьці кветкі на магілу Васіля Быкава. Каля магілы Пісьменьніка навапрынятыя навучэнцы прынесьлі клятву вернасьці Беларусі й Ліцэю.

Трэцім кантрапунктам стала плошча Якуба Коласа: ліцэісты прыйшлі пакласьці кветкі да помніка пісьменьніку, чыё імя насіла ўстанова. Паводле іроніі лёсу, менавіта тут да навучэнцаў прычапіліся міліцыянты. Падпалкоўнік прапанаваў хутчэй пакінуць плошчу. Калі ж праз плошчу пайшла яшчэ адна група школьнікаў з настаўніцай, да іх адразу кінуўся міліцыянт — даведацца, ці не ліцэісты зноў. А ліцэісты сышлі: ім не да міліцыі — у іх пачынаецца навучальны год.

**АШ**

## Сустрэнемся ў падпольлі

Папярэдняя рэкляма не выклікала падазрэньняў, дый назва канцэрту была максымальна бяскрыўдная і ня ўтрымлівала слова «Ліцэй». Аднак 27 жніўня а 14-й гадзіне дырэкцыя клюбу дала загад вынесьці на вуліцу бубны, пазычаныя Алегам Дземідовічам з «NRM». На ўваходзе паставілі ахоўніка, каб той усім паведамляў без тлумачэньня прычын, што канцэрту ніякага ня будзе. Прэзэнтацыя дыску «Я люблю Ліцэй: Веру ў цябе!» ў «Бліндажы» была адмененая за пяць гадзінаў да пачатку. Гэта была ўжо другая спроба правесьці імпрэзу. 14 траўня «Рэактар» зьняў канцэрт з праграмы за тры дні да правядзеньня.

Ад супрацоўнікаў клюбу «Бліндаж» мы пачулі некалькі вэрсій падзеяў. Паводле адной зь іх, з раніцы завіталі ў клюб з упраўленьня культуры Фрунзэнскага раёну, запыталіся, што гэта за канцэрт, і сказалі, што «ён у праграме ня мусіць быць. Інакш у вас могуць зьявіцца праблемы». На гэта супрацоўнік «Бліндажу» адправіўся высьвятляць падрабязнасьці ва ўпраўленьне, дзе яму ветліва адмовіліся даваць тлумачэньні.

Іншы чалавек расказаў, што аднаму з арганізатараў канцэрту, зь якім ліцэісты непасрэдна дамаўляліся, патэлефанавалі а 12-й гадзіне з КДБ, не называючы прозьвішча, і папрасілі распавесьці пра «Ліцэй», які будзе выступаць. На завяршэньне сказалі: «Думайце й вырашайце». Клюб безапэляцыйна зьняў канцэрт з праграмы.

Але ліцэісты ля клюбу сабраліся і невялічкі канцэрт усё ж правялі. Музыкамі былі выкладчыкі Андрэй Хадановіч і Аляксей Крукоўскі, якія пацешылі публіку кавэрамі на сусьветныя гіты. Не спыніў імпрэзы нават дождж, ад якога прыходзілася хавацца пад парасонамі ля плоту па вуліцы Ціміразева, дзе й месьціцца злашчасны клюб.

Між тым, канцэрт плянуецца правесьці, праўда, у падпольных умовах і падпольным месцы, дзе дух падпольля будзе адпавядаць месцу дысьлякацыі. Таксама ліцэісты запісваюць два новыя кліпы на свае песьні й рыхтуюць трэці дыск.

**(Ліцэіст)**

# Што можа быць горшым за Алімпіяду?

Працяг са старонкі 3.

Хаця, калі падумаць, ужо Алімпійскія гульні старажытнасьці былі адной зь першых праяў глябалізму. Раз на чатыры гады (гэты адрэзак часу, уласна, і называўся Алімпіядай) атлеты з розных гарадоў-полісаў, у некаторых зь якіх часам была дэмакратыя, а ў большасьці працьвітала тыранія, зьбіраліся на спаборніцтвы, якія прыцягвалі вялікія (на той час) масы народу. Праўда, на спартоўцах не было тады вопраткі і ўжо таму яны не маглі рэклямаваць фірму-вытворцу інвэнтару. Але ўжо тады спартоўцы карысталіся паслугамі настаўнікаў (трэнэраў), масажыстаў, лекараў-кастаправаў, адмыслоўцаў у прыгатаваньні рознага роду алеяў і г.д. А яшчэ ж трэба было мець дыскі, коп'і ды іншыя спартовыя прыстасаваньні. Нарэшце — стадыёны… Усё гэта, трэба думаць, каштавала немалых грошай ды наносіла шкоду навакольнаму асяродзьдзю, і без таго небагатаму на Пэляпанэскай паўвыспе. А грошы (гэта стала вядома крыху пазьней) ня пахнуць.

З гледзішча хрысьціянаў, дый з усіх іншых гледзішчаў, Алімпіяда — паганская справа. Зразумела, што ў эпоху росквіту хрысьціянства пра Алімпійскія гульні не было і ўспаміну. Але ж мы бачылі, зь якім энтузіязмам праваслаўныя грэкі сёньня падтрымлівалі сваіх спартоўцаў, як яны білі перад тым за права правядзеньня гульняў. Зь няменшым энтузіязмам даўнія непрыяцелі грэкаў туркі падтрымлівалі на Алімпіядзе сваіх. ЗША, якія апынуліся на вяршыні юдэахрысьціянскай цывілізацыі, даўно ператварылі спорт у індустрыю ды штампуюць мэдалі на кожнай Алімпіядзе дзясяткамі, як на канвэеры. За імі не пасьпяваюць пакуль ні Кітай (будысцкі, камуністычны?), ні спадкаемца спартовай супердзяржавы СССР Расея, ні Нямеччына, дзе ў 1936-м годзе, пры Гітлеру, нарадзіўся нежад'емны атрыбут сучасных алімпіяд — паходня.

Дык можа, маюць рацыю антыглябалісты: Алімпійскія гульні — гэта толькі пакланеньне Мамоне, частка сусьветнага шоў-бізнэсу, Выстава дасягненьняў капіталістычнай гаспадаркі, дэманстрацыя вяршэнства адных нацый над другімі?

Так, удасканаленьне сродкаў допінг-кантролю паказала тое, пра што ўсе мы раней здагадваліся: колькасьць спартоўцаў, якія ўжываюць допінг, вымяраецца не адзінкамі, але сотнямі. І робіць яны гэта не дзеля хвіліннай слабасьці, але пад ціскам трэнэраў, начальнікаў камандаў, дзяржаўных чыноўнікаў ад спорту, урэшце, — якія патрабуюць вынікаў. Допінг у спорце — такая ж пашыраная справа, як наркотыкі ў шоў-бізнэсе. Дый сам спорт зрабіўся наркотыкам для мільёнаў (мільярдаў) людзей, што прысмакталіся да тэлеэкранаў і камп'ютараў па ўсім сьвеце. Усё так.

Але ёсьць у спорце адна асаблівасьць: ён, як і тэатар, не дарує фальшу. На Алімпіядах, якія, безумоўна, ёсьць найперш грандыёзным відовішчам, гэта асабліва заўважна. Лёзунг «Галоўнае — не перамога, а ўдзел», зразумела, тут ня дзейнічае. Галоўнае — ня ўдзел, але сумленная барацьба за перамогу да апошняга.

У апошні дзень Алімпіяды выпадкова давялося бачыць трансьляцыю Літоўскага тэлебачаньня з плошчы Гедыміна ў Вільні, дзе тысячы заўзятараў назіралі на велізарным экране матч за трэцяе месца ў баскетбольным турніры. Напал эмоцый быў такі, быццам гульня з амэрыканцамі вядзецца за золата, а ня бронзу. Калі матч скончыўся паразай суайчыньнікаў, у натоўпе на плошчы нейкі час панавала ціша, некаторыя моўчкі плакалі. Але праз хвіліну ўверх пераможна ўскінуліся літоўскія нацыянальныя трыкалёры, тысячы рук паказвалі знак «V», тысячы людзей голасна скандавалі назву сваёй краіны. Літоўцы дзякавалі сваёй камандзе за змаганьне, за гульню, за надзею на перамогу.

Гэта толькі эпізод. Хаця б адзін такі эпізод здараецца амаль у кожнай каманды падчас Алімпійскіх гульняў. Для беларусаў момантам ісьціны стала непрадказальная, неймаверная перамога Юліі Несьцярэнкі на стомэтроўцы. Справа ня ў колькасьці мэдалёў. Праз некалькі гадоў ніводзін нармальны жыхар Беларусі ня ўспомніць, колькі іх там было — 25 ці 15. Запомніцца выраз твару беларускай спартсмэнкі адразу пасьля фінішу. Яна не крычала ад радасьці, не скакала, ня кідалася да гледачоў абдымацца. Яна прыняла на сябе цяжар перамогі як належнае, без афэктацыі (нават у студыі АНТ, у абсалютна ідыёцкай й невыносна фальшывай сытуацыі, калі алімпійскіх чэмпіёнаў пасадзілі побач з камбайнэрам — пераможцам жніва, Юлія Несьцярэнка трымалася натуральна й годна).



Яна не крычала ад радасьці, не скакала, ня кідалася да гледачоў абдымацца. Яна прыняла на сябе цяжар перамогі як належнае, без афэктацыі

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Раз на чатыры гады чалавецтва робіць самому сабе агледзіны. Яму сумна й страшна адчуваць сябе самотным у сусьвеце. Яно нагадвае немаладую даму, што заблыталася ў сваіх шматлікіх праблемах ды бясконца стамілася ад уласных злачынстваў — вялікіх і дробных, але ўсё яшчэ хоча добра выглядаць, хоць бы ў люстэрку, хоць бы некалькі дзён. Люстэрка гэтае, дакладней мільёны электронных люстраў, што стаяць у кожным доме, паказвае нас такімі, якія мы ёсьць. І беларусаў у гэтым люстэрку таксама можна бачыць ва ўсім бляску й гароце. У ім можна ўбачыць і твар невыязнога міністра, і твары чэмпіёнаў, і шмат чаго яшчэ, часткай чаго зьяўляемся мы самі.

Далібог, няхай Алімпійскія гульні будуць самым горшым выпрабаваньнем з тых, што могуць чакаць Беларусь у гэтым стагодзьдзі.

## Усе мэдалі на Алімпіядзе

| Месца па агульнай колькасьці | Краіны | Агульная колькасьць | Золата | Срэбра | Бронза |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ЗША | 103 | 35 | 39 | 29 |
| 2 | Расея | 92 | 27 | 27 | 38 |
| 3 | Кітай | 63 | 32 | 17 | 14 |
| 4 | Аўстралія | 49 | 17 | 16 | 16 |
| 5 | Нямеччына | 48 | 14 | 16 | 18 |
| 6 | Японія | 37 | 16 | 9 | 12 |
| 7 | Францыя | 33 | 11 | 9 | 13 |
| 8 | Італія | 32 | 10 | 11 | 11 |
| 9—10 | Брытанія | 30 | 9 | 9 | 12 |
| 9—10 | Паўднёвая Карэя | 30 | 9 | 12 | 9 |
| 11 | Куба | 27 | 9 | 7 | 11 |
| 12 | Украіна | 23 | 9 | 5 | 9 |
| 13 | Нідэрлянды | 22 | 4 | 9 | 9 |
| 14—15 | Гішпанія | 19 | 3 | 11 | 5 |
| 14—15 | Румынія | 19 | 8 | 5 | 6 |
| 16 | Вугоршчына | 17 | 8 | 6 | 3 |
| 17 | Грэцыя | 16 | 6 | 6 | 4 |
| **18** | **БЕЛАРУСЬ** | **15** | **2** | **6** | **7** |
| 19—20 | Баўгарыя | 12 | 2 | 1 | 9 |
| 19—20 | Канада | 12 | 3 | 6 | 3 |
| | ... | | | | |
| 21—23 | Польшча | 10 | 3 | 2 | 5 |
| 24—27 | Чэхія | 8 | 1 | 3 | 4 |
| 28—31 | Швэцыя | 7 | 4 | 1 | 2 |
| 32—36 | Славакія | 6 | 2 | 2 | 2 |
| 37—45 | Харватыя | 5 | 1 | 2 | 2 |
| 46—50 | Латвія | 4 | 0 | 4 | 0 |
| 51—57 | Літва | 3 | 1 | 2 | 0 |

# У сваю сілу

Больш за паўтара году таму, 23 студзеня 2003 году, Аляксандар Лукашэнка паставіў перад новым міністрам спорту і турызму Юрыем Сіваковым задачу заваяваць у Атэнах 25 мэдалёў.

У красавіку гэтага году падчас штогадовага пасланьня парлямэнту прэзыдэнт паўтарыў: «Нам патрэбен вынік — 25 мэдалёў. Няшмат, 25. Я ж не 100 прашу». Дарэчы, больш за 100 мэдалёў заваявалі толькі ЗША (103).

Беларусы сабралі на 10 мэдалёў меней — 2 залатыя, 6 срэбных і 7 бронзавых. Нагадаем, што ў Сыднэі было 17 узнагарод (3 залатыя, 3 срэбныя, 11 бронзавых). У Атэнах па тры мэдалі прынесьлі ў скарбонку цяжкаатлеты, весьляры. А вось праваліліся мы ў плаваньні. Дый каб ня посьпех Юліі Несьцярэнкі, выступ нашых лёгкаатлетаў (тры мэдалі) можна было б прызнаць няўдалым. Найбольш дальнабачным аказаўся дэпутат Уладзімер Парфяновіч. Ён спрагназаваў 14 мэдалёў.

Кіраўніцтва ж Мінспорту дружна пачало намякаць на неадназначнае стаўленьне да Беларусі з боку Эўразьвязу і г.д. Праўда, пакуль яшчэ ў агульным кантэксьце. Маўляў, ня любяць маленькія краіны ў сьвеце. Сюды дадамо пастаянныя апэляцыі да Бога, якія надта ж злавалі.

Але праблемы — унутры. Да Пэкінскай Алімпіяды — чатыры гады. Многія з тых, хто прынёс беларусам мэдалі ці спыніўся за крок ад п'едэсталу (мы заваявалі 10 чацьвёртых месцаў!), не паедуць у Кітай. Наша вясьлярка Кацярына Карстэн мае 32 гады і — што больш важна — надта капрызны характар. Штурхальніцы ядра, бронзавай прызэрцы Атэнаў Ірыне Ятчанцы — 39 гадоў. Сяргею Мартынаву, што прынёс нам трэцяе месца ў стральбе, — 36. Ня будзе выступаць у Пэкіне і Іван Іванкоў, якому ў 2008 годзе споўніцца 33 гады. Трэба гадаваць новыя кадры, а з нашым фінансаваньнем дзіцячых школ гэта будзе зрабіць цяжка. 0,03% на спорт ад валавога ўнутранага прадукту, як слушна заўважыў у панядзелак на прэс-канфэрэнцыі Сівакоў, — сапраўдная дробязь.

Вернемся да колькасьці ўзнагарод. Плянку ў 25 узнагарод пераадолелі 11 краін: ЗША, Кітай, Расея, Аўстралія, Японія, Нямеччына, Францыя, Італія, Паўднёвая Карэя, Вялікая Брытанія, Куба. Прычым зь іх толькі Куба, Карэя і Аўстралія не зьяўляюца супэрдзяржавамі.

У катэгорыях Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы беларусы выступілі някепска. Украіна заваявала 23 мэдалі, зь іх 9 залатых. Але ж і насельніцтва там у пяць разоў болей. Беларусь абагнала палякаў зь іх насельніцтвам у 38 млн чалавек. Нашы заходнія суседзі заваявалі 10 узнагарод (3 залатыя, 2 срэбныя, 5 бронзавых). Беларусы пакінулі далёка ззаду Літву (1, 2, 0), Латвію (0, 4, 0), Эстонію (0, 1, 2).

Суразьмерная з намі Вугоршчына (10 млн чалавек) заваявала 17 мэдалёў, зь іх восем залатых, але Чэхія (10,3 млн) — 8, Бэльгія (10 млн) — толькі тры.

Праўда, узнагароды розьняцца між сабой. Аргентына заваявала толькі два залатыя мэдалі. Але ў найпрэстыжнейшых дысцыплінах — мужчынскім баскетболе і футболе. У нас, праўда, таксама ёсьць золата Юліі Несьцярэнкі.

Для тых жа, каму надакучыла Алімпіяда, 12 верасьня пачынаецца чэмпіянат Італіі па футболе. У майцы «Сампдорыі» выйдзе на поле наш Віталь Кутузаў. А 8 верасьня беларуская нацыянальная футбольная зборная матчам з нарвэжцамі адкрые новы адборачны цыкл да чэмпіянату сьвету-2006. Днём раней згуляе беларуская маладзёжка. Хварэйма за нашых! Спартовае жыцьцё працягваецца.

**Алег Раявец**

## Колькасьць мэдалёў на 1 млн чалавек

| Месца па агульнай колькасьці | Краіны | Колькасьць мэдалёў на 1 млн чал. |
|---|---|---|
| 11 | Куба | 2,7 |
| 4 | Аўстралія | 2,6 |
| 51—57 | Эстонія | 2,0 |
| 16 | Вугоршчына | 1,7 |
| 17 | Грэцыя | 1,6 |
| 46—50 | Латвія | 1,6 |
| **18** | **БЕЛАРУСЬ** | **1,5** |
| 13 | Нідэрлянды | 1,5 |
| 32—36 | Славакія | 1,2 |
| 37—45 | Харватыя | 1,0 |
| 28—31 | Швэцыя | 0,9 |
| 14—15 | Румынія | 0,9 |
| 51—57 | Літва | 0,9 |
| 24—27 | Чэхія | 0,8 |
| 2 | Расея | 0,6 |
| 8 | Італія | 0,6 |
| 7 | Францыя | 0,6 |
| 9—10 | Брытанія | 0,5 |
| 12 | Украіна | 0,5 |
| 1 | ЗША | 0,4 |
| 6 | Японія | 0,3 |
| 21—23 | Польшча | 0,3 |
| 58—63 | Сэрбія і Чарнагорыя | 0,2 |
| 3 | Кітай | 0,05 |

# Запавет Леаніда Кучмы

## Фрагмэнты прамовы прэзыдэнта Ўкраіны Леаніда Кучмы на Дзень незалежнасьці Ўкраіны

Дарагія мае суайчыньнікі!

Нядаўна споўнілася дзесяць год майго прэзыдэнцтва. Будзе, маркую, дарэчы, калі я скарыстаю такую нагоду, як наша галоўнае сьвята, каб пазнаёміць сваіх суайчыньнікаў з маім асабістым поглядам на вынікі гэтага дзесяцігодзьдзя.

Нагадаю, што і ў 1994 г., і ў 99-м гаворка ішла пра выбар ня толькі і нават ня столькі канкрэтнай асобы на найвышэйшую пасаду ў дзяржаве, колькі палітычнага курсу, што вылучаўся гэтай асобай.

Нашы пераўтварэньні нагадвалі блуканьні па пустыні. Яны зьдзяйсьняліся адразу на чатырох франтах, адначасова ў чатырох трансфармацыйных плоскасьцях. **Па-першае**, трэба было перавесьці правінцыю разваленай імпэрыі ў статус сувэрэннай дзяржавы.

**Па-другое**, аскепак грандыёзнай каманднай, у значнай ступені мілітарызаванай эканомікі трэба было ператварыць у нацыянальную эканоміку рыначнага цывільнага тыпу.

**Па-трэцяе**, на руінах таталітарнага аднапартыйнага грамадзтва трэба было пабудаваць дэмакратычную грамадзянскую супольнасьць.

**Па-чацьвёртае**, трэба было перавесьці 50-мільённы фрагмэнт так званага «савецкага народу» на ўзровень самадастатковай палітычнай нацыі.

Рэальная Ўкраінская дзяржава, якая існавала з 1917 да 1919 году, была ўвасабленьнем украінскай нацыянальнай ідэі, украінскай нацыянальнай мары. Без ідэі, бяз мары нічога ня выйшла б. Ідэя — перш за ўсё.

Рэальная Ўкраінская дзяржава пачатку XX стагодзьдзя была зьнішчана, але яе месца, згодна з ідэалёгіяй і практыкай ленінізму, заняло нацыянальна-тэрытарыяльнае ўтварэньне, якое мела ў сабе зародкі будучай паўнацэннай дзяржаўнасьці. Украіна мела свой псэўда-, але ж урад, свой гімн, іншую дзяржаўную атрыбутыку. Насуперак волі імітатараў закладаўся падмурак будучага паўнавартаснага сувэрэнітэту.

Яшчэ шмат трэба зрабіць для фармаваньня новай палітычнай эліты. Але галоўнае, ад чаго будзе залежаць замацаваньне сапраўднага сувэрэнітэту, — незваротнасьць зрухаў у палітычнай сьвядомасьці народу, у яго культуры. Гэта патрабуе пераадоленьня трывалых стэрэатыпаў, а таксама якасных зьмен ва ўсім укладзе нашага жыцьця.

Спробы штучна паскорыць гэты складаны працэс могуць толькі пашкодзіць. Але нічога не рабіць для паскарэньня — значыць спыніць увесь працэс.

Нагадаю, што амаль адразу пасьля першага выбраньня на пасаду прэзыдэнта мяне абвінавачвалі ў спробах узурпаваць уладу. У сувязі з гэтым я павінен сьмела падкрэсьліць такую заслугу ўкраінскага кіраўніцтва, а ў шырэйшым сэнсе — украінскага народу, як скасаваньне «ўлады саветаў».

Будзем шчырыя. Калі б яшчэ на нейкі тэрмін — досыць кароткі! — прадоўжылася «ўлада саветаў» у постсавецкай Украіне, дык яна проста ператварылася б у контррэвалюцыйную сілу.

Тыя саветы маглі б выклікаць новую сацыялістычную рэвалюцыю. Гэта былі асяродкі і сілы «чырвонага» рэваншу.

Учарашняя правінцыя, якая пачынала з таго, што прывучала сьвет да ісьціны, што Ўкраіна — не Расея, вучылася мысьліць геапалітычна, дзейнічаць стратэгічна. Мы разумелі, што нашы крокі без распрацаванай далёкасяжнай лініі — ня больш чым канвульсійныя, малапрадукцыйныя і неўпарадкаваныя рухі. Таму і абгрунтавалі ды распачалі рэалізацыю стратэгічнага курсу, які вызначае напрамак нашага разьвіцьця сама меней у першай палове XXI стагодзьдзя.

Курс гэты — эўрапейскі выбар. Сам тэрмін дзяржаўнай стратэгіі сьведчыць, што былі і іншыя варыянты, але **эўрапеізацыя** зрабілася ўжо ў нас нацыянальнай ідэяй.

Дазвольце спыніцца на стрыжні ўсёабдымных трансфармацый — **эканомікі**. Выстаяць і падняцца нам дапамог, вядома ж, рынак, гэта значыць рэформа эканомікі, якая грунтуецца на эканамічнай свабодзе.

Мы разумелі: без структурнага аздараўленьня эканомікі, без «крутога павароту» ад эканомікі, што вырабляла «на склад», да эканомікі, што працуе на спажываньне, — ня будзе якаснага прарыву ва ўмацаваньні дзяржавы ды паляпшэньні дабрабыту яе народу. Мы выразна ўсьведамлялі, што прадпрымальніку трэба даць поўную свабоду.

Дзякуючы сыстэмнай 10-гадовай рэфарматарскай рабоце валавы ўнутраны прадукт як выразьнік вызваленай энэргіі народу і высокаэфэктыўнага ўрадавага мэнэджмэнту працягвае расьці.

Ён перасягнуў ужо сёлета самыя аптымістычныя прагнозы, склаўшы 13,5%, пры гэтым прырост прамысловага валу павялічыўся на 14,7%, сельскай гаспадаркі — на 26,5%.

Вялікі шанец для дэмакратычнага пад'ёму дае палітычная рэформа. Яна прадугледжвае ўсталяваньне такой сыстэмы дзяржаўнага кіраваньня, якая зробіць немагчымай якую б там ні было рэстаўрацыю аднаасобнай канцэнтрацыі ўладных паўнамоцтваў.

І, нарэшце, апошняя цагліна — **нацыятварэньне як аснова заснаваньня ды існаваньня дзяржавы**. Яшчэ ніводная пабудова не была зьведзена да цэмэнту, якім для пасьпяховага дзяржаўнага праекту зьяўляецца нацыя. Паўнацэнная нацыя зьяўляецца супольнасьцю з выразнай воляй да дзяржаўнага жыцьця. У мінулыя вякі гэтую волю меў толькі верхні слой: зьнікне ён — зьнікне і «палітычны народ».

Сёньняшнія нацыі зрабіліся больш паўнакроўнымі праз пашырэньне сваёй сацыяльнай базы: яе складаюць усе грамадзяне, увесь народ. Украінская палітычная нацыя ў поўнай ступені адпавядае гэтай заканамернасьці.

Наступную гадавіну незалежнасьці мы будзем адзначаць ужо пасьля прэзыдэнцкіх выбараў. Выбар — за народам, але хочацца, каб гэта быў шчасьлівы выбар.

Пералік магчымых варыянтаў можна зьвесьці сама меней да такой альтэрнатывы: **першая мадэль выразна гістарычных праблем, якія зьяўляюцца непазьбежнымі, — гэта радыкальная зьмена кіраўнічай эліты, пазбаўленьне ўладных паўнамоцтваў адных і наданьне іх асобам іншым.**

Цалкам магчыма, што ў такім разе гэта ўрэшце можа прывесьці да вывядзеньня сытуацыі з сацыяльна-палітычнай раўнавагі, набытай такімі неймавернымі намаганьнямі.

**І мадэль другая — пераемнасьць палітычнага курсу, паглыбленьне пералічаных вышэй шматлікіх трансфармацый.**

Для гэтага патрэбен усебаковы дыялёг, прымяненьне сучасных формаў грамадзкіх адносін, вывядзеньне на палітычную сцэну прафэсійных урадавых мэнэджэраў і грамадзкіх інтэгратараў.

Наша задача — зрабіць усё ад нас залежнае, каб засьцерагчы Ўкраіну ад згубнага, поўнага рызыкі і ўзрушэньняў першага варыянту разьвіцьця падзей.



**Рэальная Ўкраінская дзяржава, якая існавала з 1917 да 1919 году, была ўвасабленьнем украінскай нацыянальнай ідэі, украінскай нацыянальнай мары. Без ідэі, бяз мары нічога ня выйшла б. Ідэя — перш за ўсё.**

**Калі б яшчэ на нейкі тэрмін прадоўжылася «ўлада саветаў» у постсавецкай Украіне, дык яна проста ператварылася б у контррэвалюцыйную сілу. Гэта былі асяродкі і сілы «чырвонага» рэваншу.**

**Эўрапеізацыя зрабілася ўжо ў нас нацыянальнай ідэяй.**

**Палітычная рэформа прадугледжвае ўсталяваньне такой сыстэмы дзяржаўнага кіраваньня, якая зробіць немагчымай якую б там ні было рэстаўрацыю аднаасобнай канцэнтрацыі ўладных паўнамоцтваў.**

**Паўнацэнная нацыя зьяўляецца супольнасьцю з выразнай воляй да дзяржаўнага жыцьця. У мінулыя вякі гэтую волю меў толькі верхні слой: зьнікне ён — зьнікне і «палітычны народ».**

# Стыхія агню

Андрэй Мельнікаў



Штогадовыя афіцыёзныя сьвяточныя імпрэзы на пачатку верасьня робяцца традыцыяй і дазваляюць выказаць фрайдысцкую думку, што гэта ці сублімацыя Аршанскага сьвята, ці яго ж лятэнтная форма.

Ідэя нацыі была агучана, а самі нацыі пачалі фармавацца пад уплывам Ангельскай рэвалюцыі, амэрыканскай вайны за незалежнасьць і Француcкай рэвалюцыі.

Аднак нацыі напэўна дзесяцігодзьдзямі, а то і стагодзьдзямі існавалі і да сваёй «агучкі». Бо любому складанаму арганізму папярэднічае пэрыяд стоенага жыцьця — зародкавы ці каранёвы. Таму і ангельская, і француская нацыі ўжо існавалі як арганізмы да сваіх рэвалюцый.

Калі ж і як адбылося «зачацьце» беларусаў?

Паводле сьцьверджаньня гісторыка Генадзя Сагановіча, на пачатку XVI ст. палоненыя і адпраўленыя ў Масковію праваслаўныя жыхары ВКЛ называлі сябе ня толькі ліцьвінамі, але і беларусцамі.

Тады ж, на пачатку XVI ст., далёка ня самы заможны сваяк Радзівілаў баярын Ільлініч распачаў пабудову Мірскага замку, які праславіўся надалей сувязьзю сваіх рамонтаў ды перабудоў з нацыянальнымі катаклізмамі.

1517 г. адзначыўся пачаткам лютэраўскай Рэфармацыі ў Германіі — утварэньнем пратэстантызму, які хутка выліўся за нямецкія межы і неўзабаве атрымаў пашырэньне ў сярэдзінных землях будучай Беларусі. Менавіта пратэстант, філёзаф і паэт Салямон Рысінскі празь некалькі дзесяцігодзьдзяў першым са шляхты наўмысна назаве сябе беларусам — адрозьніваючы сваю шматканфэсійную нацыю ад чыста каталіцкае Польшчы й праваслаўнае Расеі.

1517 г. адзначыўся таксама першай беларускай друкаванай кнігай Скарыны.

Прыкладна ў тыя ж гады былі створаны «Пруская вайна» Яна Вісьліцкага і «Песьня пра зубра» Міколы Гусоўскага.

Калі разгледзець вышэйпададзенае ў стылі, скажам, традыцыйнай кітайскай філязофіі, то навідавоку чатыры стыхіі, у якіх праявілася «зачацьце» беларусаў на пачатку XVI ст.: палонныя — вада, будаўніцтва сакральнага замку — зямля, рэлігійная адасобленасьць ад суседзяў — дрэва, стварэньне знакавых кніг — паветра.

Для завяршэньня структуры не хапае стыхіі агню. Дзе яе шукаць? У Аршанскай бітве на Крапівенскім полі 8 верасьня 1514 году!

Ці выпадкова, што бітву ня любяць прыгадваць тыя, каму не па душы беларускія нацыя і незалежнасьць? Ці выпадкова, што пэўныя пазьнейшыя істотныя для беларусаў падзеі аказаліся зьвязанымі з датай і месцам Аршанскай бітвы? Ці выпадкова праз 392 гады пасьля бітвы выйшла па-беларуску «Наша доля», а праз 440 гадоў за 40 км ніжэй па Дняпры ад Крапівенскага поля нарадзіўся хлопчык, якога ў 1990 годзе абралі дэпутатам рэспублікі (тады ж на месцы бітвы народнымі намаганьнямі ўзьнёсься праваслаўны крыж) і які ў 40-гадовым узросьце (праз 480 гадоў пасля бітвы) стаў першым прэзыдэнтам Беларусі?

І нарэшце, ці выпадкова да 490-х угодкаў бітвы дзяржавай ладзіцца буйное сьвята ў былым уладаньні Астроскіх Тураве, хай і пададзенае як Дзень пісьменства? Штогадовыя афіцыёзныя сьвяточныя імпрэзы на пачатку верасьня робяцца традыцыяй і дазваляюць выказаць фрайдысцкую думку, што гэта ці сублімацыя Аршанскага сьвята, ці яго ж лятэнтная форма.

Аргумэнты, канечне, ускосныя. Але калі нават не прымаць іх, то яны толькі на карысьць думцы, што Аршанская бітва спрычынілася да зачацьця на пачатку XVI ст. дзіцяці, якому пазьней далі імя «беларускі народ».

*Гомель*

# Небясьпекі адзінай валюты



Беларуска-расейскі валютны саюз можа прывесьці да заняпаду цэлых галін беларускае эканомікі, такіх, як машынабудаваньне і электраэнэргетыка.

Афіцыйны Менск ня раз намякаў, што ідэю пераходу Беларусі на расейскі рубель можна лічыць пахаванай, але Масква зноў і зноў прапануе зь ёю (ідэяй) пераспаць. Пашырэньне прасторы выкарыстаньня расейскага рубля — частка расейскае палітыкі. Пры гэтым крамлёўскія стратэгі спрабуюць пераконваць у незьлічоных выгадах адмовы ад свае нацыянальнае валюты. Між тым аналіз міжнароднае эканамічнае практыкі дэманструе, што непрадуманыя праекты інтэграцыі асыметрычных фінансавых сыстэм могуць нанесьці эканоміцы непапраўную шкоду.

Адна зь вялікіх праблем, якія нясе фінансавая інтэграцыя, — гэта кантроль за эмісійнай ды бюджэтнай палітыкай краін — удзельніц валютных саюзаў. Валютная стабільнасьць шмат у чым залежыць ад велічыні грашовае масы, дэфіцытаў бюджэтаў і аб’ёму дзяржаўнае запазычанасьці. У валютных зьвязах дзеля ўзаемнага кантролю за грашовай палітыкай асобных краін патрабуецца незалежны эмісійны цэнтар і распрацоўка агульных нормаў бюджэтаў, як, напрыклад, максымальны памер гадавога дэфіцыту ў 3%, прыняты ў Эўразьвязе. Але ж нават у такой адносна празрыстай і дэмакратычнай структуры, як Эўразьвяз, мэханізмы ўзаемнага кантролю далёкія ад дасканаласьці. У выпадку ж Беларусі і Расеі, зважаючы на істотную розьніцу ў іх вазе, пра нейкі дзейсны эмісійны і бюджэтны кантроль гаварыць увогуле не даводзіцца. Расея ніколі ня пойдзе на абмежаваньне свайго сувэрэнітэту дзеля гарантыяў грашовае стабільнасьці для Беларусі. Такім чынам, Беларусь рызыкуе зрабіцца фінансавай закладніцай расейскага ўраду.

Другі важны аспэкт — расейскую валюту можна толькі ўмоўна разглядаць як цьвёрдую, а Расея не зьяўляецца самай пэрспэктыўнай у эканамічным сэнсе краінай. Расейскую эканоміку паводле яе структуры можна аднесьці да тыповых сыравіназалежных гаспадарак трэцяга сьвету.

Заўважана, што краіны, не надзеленыя вялікімі прыроднымі багацьцямі, найчасьцей дасягаюць большых эканамічных посьпехаў, чым іх багатыя на сыравіну канкурэнты. У гэтым сэнсе эканамісты гавораць пра «праклён прыроднага багацьця». Нобэлеўскі ляўрэат у галіне эканомікі Джэзэф Штыгліц зьвяртае ўвагу на схільнасьць багатых на прыродныя рэсурсы краін да залішняе цэнтралізацыі, карумпаванасьці, войнаў, запаволенага разьвіцьця несыравінных галін эканомікі ды залежнасьці ад ваганьняў цэн на сыравіну. Апошняе часьцяком прыводзіць да фінансавых і валютных крызысаў.

Насамрэч, пакуль цэны на нафту высокія, расейская эканоміка квітнее, а расейскі рубель мацнее. Калі нафта абясцэньваецца, Расея перажывае чарговы крызыс і падзеньне абменнага курсу рубля. Каб працістаяць такой «афрыканізацыі» эканомікі, патрабуецца дэмакратызацыя, грамадзкі кансэнсус і празрыстасьць эканамічных адносін. Але ж Расея рухаецца якраз у адваротным кірунку. Такім чынам, прывязка беларускае эканомікі да расейскае валюты зробіць Беларусь яшчэ больш залежнай ад спэкуляцый на глябальных рынках сыравіны. Так што ні пра якія перавагі цьвёрдых валют гаварыць не даводзіцца.

Яшчэ адна праблема — вызначэньне абменнага курсу валют краін — удзельніц пагадненьняў. У эканамічнай тэорыі існуюць разнастайныя мадэлі разьліку абменных курсаў, але ніводная зь іх ня можа лічыцца абсалютна надзейнай. З другога боку, арыентацыя на рынкавы курс можа спрычыніцца да атак валютных спэкулянтаў. Ці быў абменны курс слушным, можна даведацца толькі праз нейкі час, калі робіцца відавочнымі вынікі абмену, але зьмяніць ужо нічога нельга. Пры гэтым заніжаны курс абмену прыводзіць да зьніжэньня жыцьцёвых стандартаў насельніцтва, а завышаны курс робіць экспартныя галіны неканкурэнтаздольнымі і пагражае паралізаваць усю эканоміку.

Самы вядомы прыклад — абмен у 1990 г. усходненямецкіх марак на заходненямецкія ў суадносінах 1:1. Вынікам завышанага курсу, які не адпавядаў эканамічнай рэчаіснасьці, сталася неканкурэнтаздольнасьць усходненямецкіх вытворцаў і фактычны паралюш эканомікі былое ГДР. Наступствы такое штучнае фінансавае інтэграцыі адчуваюцца дагэтуль. Эканоміка ўсходніх зямель Нямеччыны ня можа выбрацца з напаўпрытомнага стану, што асабліва кідаецца ў вочы ў параўнаньні з эканамічным дынамізмам у суседніх Польшчы і Чэхіі. Падобным чынам завышаная прывязка аргентынскага пэса да амэрыканскага даляра ў 1990-х была адным з фактараў эканамічнага каляпсу ў Аргентыне.

Адной з прычын завышаных курсаў абмену ў валютных зьвязах часта служыць загад палітыкаў зрабіць пераход на новую валюту як мага больш прыцягальным для насельніцтва. Зважаючы на папулізм «славянскіх» інтэгратараў, можна прадбачыць падобны сцэнар і ў магчымым беларуска-расейскім валютным саюзе. Гэта можа прывесьці да заняпаду цэлых галін беларускае эканомікі, такіх, як машынабудаваньне і электраэнэргетыка.

Сусьветная практыка паказвае, што валютныя зьвязы часьцяком перасьледуюць ня столькі эканамічныя, колькі палітычныя мэты. Так, Францыя 13 год трымала валюты заходне- і цэнтральнаафрыканскіх краін прывязанымі да французскага франка (пакуль кошт такога валютнага саюзу не зрабіўся для Францыі ў 1997 г. невыносным). Такім чынам Парыж спадзяваўся захаваць свой геапалітычны ўплыў у былых калёніях. Выглядае, што й Расея ў сваім навязваньні расейскага рубля таксама спрабуе навечна прывязаць Беларусь да свае адсталае эканомікі.

Валютны зьвяз — гэта тая мяжа, за якой звычайная інтэграцыя валют пераходзіць у незваротны працэс страты незалежнасьці, бо ў валютны зьвяз лёгка ўвайсьці, але амаль што немагчыма выйсьці. Без уласнае фінансавае палітыкі беларуская дзяржава і грамадзтва пазбаўляюцца вельмі важнага мэханізму рэагаваньня на эканамічныя працэсы і асуджаюць сябе на ролю бездапаможных назіральнікаў за працэсам глябалізацыі.

**Сяржук Вінаградаў**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Офіс ліквідаванага **ГА «Грамадзянскія ініцыятывы»** (Гомель) 24 жніўня агледзелі супрацоўнікі абласной падатковай службы й Управы фінансавых расьсьледаваньняў КДК, каб даведацца, што знаходзіцца ў будынку. 25 жніўня Вярхоўны суд пацьвердзіў рашэньні ніжэйшых судоў пра нерэгістрацыю **ГА «Грамадзянская альтэрнатыва»** (Гомель): маўляў, статут арганізацыі ў сямі пунктах «не адпавядае заканадаўству», хоць статут той перапісаны слова ў слова з зарэгістраванага статуту БРСМ. Не зарэгістраваныя ініцыятыўныя групы **Валер’я Шчукіна**, **Уладзімера Вярэніча**, **Уладзімера Лапцэвіча**. 25 жніўня камісія ў справах непаўналетніх вынесла папярэджаньні й паставіла на ўлік **Аляксандра Малчанава** й **Івана Шутко**, затрыманых і зьбітых АМАПам на акцыі 21 ліпеня. **Працоўнай групе па адвольных затрыманьнях** Камісіі ААН па правах чалавека 25 жніўня адмовілі ў наведаньні зьняволенага **Міхаіла Марыніча**. 26 жніўня ўтрыманьне Марыніча пад вартай падоўжылі яшчэ на месяц і вылучылі новае абвінавачаньне — нібыта крадзеж маёмасьці ГА «Дзелавая ініцыятыва», якое ён і ўзначальваў. **Аляксандру Папкову** і **Аляксандру Будагоўскаму**, сябрам ініцыятыўнай групы Сяргея Салаша (ПБНФ, Барысаў), 26 жніўня тэлефанавалі невядомыя й патрабавалі выйсьці з групы. **Валер Леванеўскі** 25 жніўня спыніў галадоўку, а 26-га пачаўся судовы працэс над ім і **Аляксандрам Васільевым** за абразу прэзыдэнта. Вярхоўны суд 26 жніўня не адмяніў папярэджаньня **АГП** за ўдзел у кааліцыі «5+» і акцыі «Ланцуг неабыякавых чытачоў», а 27 жніўня — **БСДГ**. На бацьку і сына **Марозавых**, сяброў ініцыятыўнай групы чальца АГП Анатоля Рубанава (Бабруйск), 26 жніўня напалі два хуліганы ў масках; адзін з нападнікаў быў затрыманы і, са словаў Марозавых, прызнаўся, што яго наняў дэпутат ППНС па гэтай акрузе Глухоўскі. У Рэчыцы 26 жніўня ўзброеныя супрацоўнікі міліцыі абшукалі **сяброў ініцыятыўнай групы Леаніда Невара,** старшыню РГА «Пэрспэктыва» **Анатоля Шумчанку** і намесьніка старшыні РГА «Беларускі Хельсынскі камітэт» **Гары Паганяйлу**, а таксама правяліператрус Неваравай хаты. Канцэрт **«Рок пасьля вакацыяў»** у клюбе «Бліндаж» 27 жніўня быў забаронены ўладамі. 27 жніўня прэтэндэнту ў кандыдаты ў дэпутаты **Зьмітру Бародку** (Барысаў) у пашпартным стале заявілі, што атрымалі ад КДБ інструкцыю «пакуль прытрымаць» станоўчае рашэньне пра пячатку з дазволам на выезд у іншыя краіны. Міністар інфармацыі Ўладзімер Русакевіч 27 жніўня прыпыніў на тры месяцы выхад **газэты «Навінкі»**: выданьню закідаюць позьняе паведамленьне пра зьмену юрыдычнага адрасу, няпоўныя выходныя зьвесткі, недасылку «кантрольных» нумароў газэты ў дзяржорганы. 27 жніўня Вушацкі райсуд не задаволіў скаргі актывіста ПБНФ **Зьмітра Салаўёва** на адмову райвыканкаму даць дазвол на перадвыбарны мітынг. 28 жніўня ў Шаркаўшчыне быў затрыманы актывіст АГП **Валер Каралёў**, які распаўсюджваў улёткі «Пяцёркі-плюс» і незалежную прэсу. Старшыню віцебскай абласной арганізацыі АГП **Генадзя Ананьева** затрымалі 29 жніўня на кірмашы ў Воршы, дзе ён бясплатна раздаваў газэту «Время». 30 жніўня прэтэндэнт у кандыдаты **Яраслаў Берніковіч** (ПБНФ, Глыбокае) атрымаў папярэджаньне ад выбарчай камісіі за выкарыстаньне асабістых сродкаў для агітацыі за кандыдата. 30 жніўня ў Жлобінскім райсудзе пачаўся працэс над актывістам АГП **Уладзімерам Кацорам**, якога вінавацяць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

**АШ**

## Чыноўнікам зь Мінкульту: пра дзень пазбаўленьня волі

Нядаўна давялося мне паўдзельнічаць у конкурсе, прысьвечаным 50-годзьдзю Беларускай службы радыё «Свабода». Трэба было напісаць эсэ на тэму «Мая Свабода». Пісаць было прыемна — і я стаў адным зь пяці (самым, дарэчы, маладым) пераможцаў конкурсу.

А вось гэтыя радкі я пішу з кардынальна супрацьлеглым пачуцьцём — прыкра й непрыемна... Зайшоў у бібліятэку побач з домам пачытаць у «Народнай волі» інтэрвію Піта Паўлава, а мяне як абухом па галаве: «Гэтай газэты вы больш ня знойдзеце ні ў адной бібліятэцы, — кажа сярэдніх гадоў жанчына і дадае: — На жаль...» Калі яна вымавіла гэтае «на жаль», я зірнуў ёй у вочы — і зразумеў яе...

Увечары таго ж дня глядзеў, выгодна ўладкаваўшыся на канапе, клясыку францускага кіно — фільм «Напалеон». Адзін з эпізодаў: малады дыктатар, які толькі што пры дапамозе зброі прысвоіў сабе тытул Першага Консула, на Каляды ў бліскучай карэце едзе са сваёй жонкай у Опэру. Прыгажуня кажа да свайго сужэнца: «Які ты ў мяне малайчына, і газэты пра цябе так добра пішуць!» — «Для гэтага мне давялося закрыць 60 зь іх...» Мяне трэці раз за дзень перасмыкнула. Вядома, параўноўваць Напалеона й першы твар чынавенскай Беларусі не выпадае, але сама сутнасьць дыктатуры ў гэтай цытаце навідавоку.

А ўвогуле я мог бы і не глядзець францускае стужкі, калі б, прыйшоўшы ў азначаны час зь сябрамі й сяброўкамі да клюбу «Бліндаж» на ліцэйскі канцэрт, не пачуў: «Канцэрт забаранілі». Проста патэлефанавалі за тры гадзіны й сказалі: не праводзіць. І зноў не спатрэбілася аніякіх тлумачэньняў.

Некалі, у вельмі далёкія часы, яшчэ Гельвэцый сказаў: «Згрызоты сумленьня пачынаюцца там, дзе канчаецца беспакаранасьць». Мне цікава, ці ёсьць яны, тыя згрызоты сумленьня, у людзей, якія з такой лёгкасьцю забараняюць ды адмяняюць тое, на што было пакладзена шмат працы!

У любым выпадку пражыты дзень я для сябе ахрысьціў «Днём пазбаўленьня волі». Паслужлівым жа чыноўнікам зь Міністэрства культуры й тым, перад кім яны выслужваюцца, хочацца адно нагадаць: пякучая крыўда проста так не даруецца!

**Алесь Квіткевіч, Менск**

## Пра адзін прагноз Грэфа

Міністар эканамічнага разьвіцьця Расеі Герман Грэф прарочыць, што рэкордна высокая цана нафты на сусьветным рынку можа ўзрасьці ўдвая, дасягнуўшы $100 за барэль. Расея атрымлівае шалёныя грошы і з вар’яцкім апэтытам паглынае беларускія тавары. Нядзіўна, калі маскоўскія алігархі пачнуць патрабаваць ад Пуціна рабіць больш рашучыя захады ў абароне расейскага капіталу на «блізкім захадзе», каб абрынуць вольныя нафтадаляры на Беларусь ня толькі дзеля пакупкі кватэр і катэджаў.

**Яўген Лагоўскі, Менск**

## Пра патрэбу ў кнігах

Тупаў з касою, варочаў, гроб, звозіў. І, бадай, увесь гэты час са мною быў кішэнны прыймач. Слухаючы культурніцкія праграмы замежных радыёстанцый, з горыччу параўноваў з тым, што ёсьць у нас.

Сёньня выкінуў з хлява гной, накапаў на вячэру бульбы і перад тым, як узяцца калоць дровы, прысеў на хвіліну, каб пагартаць прысланую сябрамі з Італіі кнігу Эмануэля Аўдызіё «Tutti i cerchi del mondo. I volti, i paesi, le storie che fanno un’Olimpiade» («Усе колцы сьвету. Твары, краіны, гісторыі, зь якіх складаецца Алімпіяда»). Безь Беларусі, вядома.

Тут жа падумаў: у нашай Айчыне багата алімпійскіх волатаў, легендарных спартоўцаў і геніяльных трэнэраў (Шчэрба, Кныш, Парфяновіч, Клім, Корбут...). Чаму ж гэтага залатога Кландайку не скарыстае хто з патрыятычных журналістаў і не раскажа ў прыгожай форме пра іх? Які прагал! Які пралом у культурным падмурку Беларусі!

**Мікола Бусел, Дуброва (Сьветлагоршчына)**

## УСПАМІН З ЖЫЦЬЦЯ

## У валгаградзкім рэстаране

У 70-х мінулага стагодзьдзя, пасьля заканчэньня ВНУ, я быў разьмеркаваны ў сталіцу расейскага Паволжа — Валгаград.

У першы ж вечар, пры наведваньні кафэ «Тэатральнае» на цэнтральным праспэкце, быў шакаваны тым, што аркестар на ўсю моц «наяривал» польскі жаўнерскі марш, пад які мясцовы сьцёб апантана танчыў. Да гэтага я і не здагадваўся, што пад яго можна яшчэ і «отплясывать». Мэлёдыя была мне вельмі знаёмая, бо ёй на Варшаўскім радыё апоўдні суправаджалася перадача для вайскоўцаў.

У тым узросьце, у якім я быў тады, для мяне гэта быў «капец» — куды я папаў?! Цяпер я ведаю — нашы браты вельмі любяць музыку, пад якую можна «ать-два». Але я зьдзіўляюся з таго, што наша сучасная моладзь цяпер «низкопоклонничает» у гэтым перад Усходам.

Потым у рэстаране мне быў «преподан» урок этыкету, які я памятаю ў падрабязнасьцях да сёньня.

Абедаў я за столікам адзін, а побач, за суседнім, — жаночая кампанія. На другое ў мяне была курыца, і я па звычцы пачаў яе есьці з дапамогай нажа і відэльца. І тут я інстынктыўна адчуў узьніклую ўвагу да сябе сваіх суседак, якія таксама елі курыцу, але трымалі яе абедзьвюма рукамі без усялякіх прыбораў. Пачаліся перашэптваньні і азіраньні на мяне. Я не падаваў выгляду, што заўважаю гэта. Раптам адна зь іх ня вытрымала, рашуча падышла да мяне і прамовіла: «Курицу, молодой человек, едят только руками!» Я адказаў, што ў нас гэта робяць з нажом і відэльцам, і прадоўжыў есьці па-свойму. Але адчуў адкрытую варожасьць да сябе і есьці расхацелася. Таму хутка разьлічыўся і сышоў з рэстарану.

Пасьля гэтага выпадку, калі пачынаю есьці птушку, інстынктыўна азіраюся — ці няма паблізу «преподавателей». Гэтую шчырасьць, жаданьне дапамагчы небаракам «приобщиться» да вяршынь сваёй культуры я прыгадваю ў выпадках, калі пры звароце па-беларуску ў адказ чую: «Говорите на нормальном языке!»

**Хведар Ч-н, Менск**

# Каляндар верасьня


ВІКТАР АНДРЭЕЎ

## Крапівенскае поле

**4—5 верасьня** на Крапівенскім полі традыцыйна адзначаюць гадавіну Аршанскай бітвы. Сёлета ў праграме фэсту, які пачнецца а 18-й, багаслужба каля памятнага крыжа, рыцарскі турнір і футбольны матч. Усю ноч — песьні ля вогнішча. Ахвотных прынясць удзел у спартовай частцы запрашаюць прыехаць раней. Ад Воршы можна даехаць на аўтобусе ці маршрутцы ў Дуброўну з аўтавакзалу. Ад прыпынку «Гацькаўшчына» яшчэ з кілямэтар пехатою.

Непасрэднае дачыненьне да Аршанскай бітвы мае знойдзены сёлета краязнаўцам Аляксандрам Шынкевічам наплечнік ад дасьпехаў. Адшуканы ён у пяску, здабытым з русла Дняпра насупраць вёскі Гацькаўшчына (яна месьціцца ў паўкілямэтры ад вусьця Крапівенкі).

Наплечнік выраблены зь ліставой медзі таўшчынёю больш за 1 мм. З краёў мае 7 адтулін, у трох зь іх захаваліся груба выраблены заклёпкі. На вонкавай паверхні наплечніка шмат драпін, увагнутасьцяў. Найбольшая, са скразной уздоўжнай насечкай, магчыма, нанесеная вастрыём мяча або цяжкай шаблі. Ёсьць яшчэ дзьве вялікія ўвагнутасьці ў цэнтры — ад удараў тупога прадмету, відаць, кісьцяня. У тым баі ваяру давялося адначасова змагацца супраць некалькіх ворагаў. Падобна, для яго гэты бой быў апошнім у жыцьці. Наплечнік стане экспанатам музэю гісторыі і культуры Воршы.

Сапраўднай зброі часоў Аршанскай бітвы там адзінкі. Перш-наперш, гэта наканечнік рагаціны XV—XVI ст., знойдзены ў 1960-я ля вёскі Крапіўны. Старажылы прыгадваюць, што ля вусьця Крапівенкі, на правым беразе якой і адбылася знакамітая бітва, некалі выпадкова знайшлі на дзіва добра захаваную кальчугу. Дзе яна падзелася пасьля — невядома. А ў 70-я жыхару суседняй вёскі Берасьценева трапіў у рукі цэлы рыцарскі панцыр. Відаць, быў некалі ў калекцыі мясцовага памешчыка — аматара старасьвеччыны. На жаль, вяскоўцы здалі панцыр у... мэталалом.

Можа, і Вам пашанцуе нешта знайсьці на Крапівенскім полі?




**Даезд:**
**З аршанскага чыгуначнага вакзалу на аўтобусе № 11 да аўтавакзалу (канец маршруту). Далей — аўтобусам «Ворша — Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з вакзалу проста да Гацькаўшчыны. Ад прыпынку «Гацькаўшчына» да месца правядзеньня фэсту каля 1 км. Даведкі праз т.: (8-02161) 52-540 (Генадзь, позна ўвечары)**

## Гомель—Тураў—Ваўкавыск

Адначасова з фэстам на Аршаншчыне пройдзе сьвяткаваньне Дня беларускага пісьменства. Сёлета сьвята пройдзе ў двух гарадах — **4 верасьня** ў Гомелі, а назаўтра ў Тураве. У Гомелі чакаецца адкрыцьцё помніка Кірылу Тураўскаму і цэнтральнай часткі палацу Румянцавых-Паскевічаў. Будзе там уся краса і сіла афіцыйнай беларускай літаратуры, эстрады і кнігавыданьня.

«Дажынкі» ж сёлета пройдуць у Ваўкавыску ў другой дэкадзе верасьня. Як заўжды, з грукатам і вялікімі кірмашамі.

## Не бяз кросу

У другую суботу верасьня ў Менску адзначаецца Дзень горада, перанесены сюды з 3 ліпеня з мэтаю разьвесьці з лукашэнкаўскім Днём незалежнасьці. Сёлета гуляньні не без чорнага гумару прыпалі на **11—12 верасьня**. Асноўныя пляцоўкі — праспэкт Машэрава, Кастрычніцкая плошча, паркі Горкага і Чалюскінцаў. Апроч абрыдлых ужо кірмашоў і сьвята піва, чакаюцца парады тралейбусаў (цікава — калёнаю ці цугам?) у суботу на пр.Машэрава з 12.30 і духавых аркестраў (нядзеля, 11.30 ад Палацу спорту да Ратушы). А палове на першую 12 верасьня на плошчы Свабоды можна будзе пачуць сьвяточныя званы. Для дзетак ля Мастацкага музэю адбудуцца сьвяточны пленэр «Я малюю Менск» і сьвята кветак. Не абыдзецца і без традыцыйнага лыжаролернага кросу. Ці будуць гледачы правярацца на прадмет наяўнасьці памідораў — невядома.

Зь нефармальнага адпачынку — КВК у палацы культуры МТЗ і фэстываль «Трэцяя пяцёрка» ў СКА «Ўручча». Галоўнае, каб адміністрацыя памылкова не расцаніла яго назву як перадвыбарчую агітацыю. Сярод удзельнікаў — беларускія гурты «Дай дарогу», «Onegin», «Deadmarsh», а таксама расейцы «Jan Division» ды «Прыгоды Электронікаў». Квіткі — 16—23 тысячы.

## «Баляда» Быкава

Ужо сьпявае Беларуская опэра. 2 верасьня ідзе «Мадам Батэрфляй». Тэатар балету адкрывае сэзон 3 верасьня спэктаклем «Лебядзінае возера». Увесь месяц ідуць «хіты» беларускага балету «Страсьці (Рагнеда)», «Спартак», «Эсмэральда», «Шчаўкунок», «Рамэо і Джульета».

Сэзон у Купалаўскім тэатры традыцыйна пачнецца з «Паўлінкі».


**Пампасы пачынаюцца ў Барысаве. Фан-клюб БАТЭ на працоўным месцы.**

Адкрыцьцё 85-га сэзону — **10 верасьня**. Цягам месяца ідуць дзьве леташнія прэм'еры: сучаснае прачытаньне «Вішнёвага саду» Антона Чэхава «С.В.» (22 верасьня) і «Эрык XIV» Аўгуста Стрындбэрга (15—17 верасьня). На Малой сцэне — «Баляда пра каханьне» паводле Васіля Быкава (18 і 23 верасьня).

## Футбол!

Працягваецца футбольны сэзон. **8 верасьня**, у сераду параненьку, матчам Нарвэгія—Беларусь стартуе адборачны турнір чэмпіянату сьвету. Цягам верасьня адбудуцца 21—24-ы туры нацыянальнага чэмпіянату. На першых трох месцах пасьля 19-га туру — менскае «Дынама», «БАТЭ» і жодзінскае «Тарпэда».

На верасень таксама плянуюцца Міжнародны турнір па баскетболе памяці Ўладзімера Рыжанкова і II Чэмпіянат сьвету па пажарна-выратавальным спорце — якраз да 300-годзьдзя менскага пажару, учыненага Пятром I.

## Дзень бульбы

У Гайнаўцы да 15 верасьня — X агульнапольскі пленэр студэнтаў мастацкіх вучэльняў. 12 верасьня ў Хорашчы — III Міжнародны прагляд моладзевых аркестраў, 16—19-га — тэатральна-літаратурны конкурс «Чалавек і прырода». XII Беластоцкія дні царкоўнай музыкі пройдуць пры Брацтве Сьвятога Мікалая 22—24 верасьня. У першы восеньскі месяц будзе таксама шмат вясковых сьвятаў і кірмашоў. 5 верасьня ў Беластоку сьвяткуецца дзень агурка, а ў Птаках 12 і 13 верасьня — «Дні бульбы». Імпрэзы ўжо сталі традыцыйнымі, бо агуркі шануюць пяты раз, а бульбу — ажно чатырнаццаты. 5 верасьня ў Чыжах — мясцовыя «Дажынкі».

Шмат імпрэзаў на Беласточчыне будзе прымеркавана да 65-й гадавіны падзей верасьня 1939 г. Сярод іх «XXXVII Зьлёт памяці верасьня 1939 году» (17 верасьня, Візна), канцэрты памяці «Малітва аб міры», што адбудуцца 17—19 верасьня ў Беластоку, Ломжы, Дарагічыне, Элку.

**Сяргей Трафілаў**



## «Шрэк-2»

**У верасьнёўскім кінарэпэртуары Менску — прэм'ера «Шрэка-2». Сярод астатняга — «Модная мамачка», «Эўратур», «Шырокім крокам». З 27 верасьня ў кінатэатрах «Масква» і «Кастрычнік» пачнецца менскі паказ «80 дзён вакол сьвету». Расейскае кіно прадстаўлена стужкай «Гульні матылькоў», а беларускае — дакумэнтальнымі фільмамі ў праграме «Цэнтральнага» і «Піянеру». Адмыслова да Дня беларускага пісьменства пакажуць стужкі пра Эўфрасіньню Полацкую, Францыска Скарыну, Кірылу Тураўскага, Янку Купалу і Якуба Коласа, Максіма Танка. Яшчэ ў верасьні ў Магілёве пройдзе Міжнародны фэстываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка».**

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

## Прэм'ера купалаўцаў

У Купалаўскім тэатры рыхтуецца да прэм'еры пастаноўка «Івона — прынцэса Бургундзкая» паводле п'есы Вітальда Гамбровіча — клясыка польскай літаратуры, чыё 100-годзьдзе адзначаецца сёлета. Рэжысэр-пастаноўшчык спэктаклю Аляксандар Гарцуеў абазначыў жанр спэктаклю як «трагічны парадокс у дзьвюх дзеях». У галоўных ролях — Зоя Белахвосьцік і Ганна Хітрык. Прэм'ера заплянаваная на кастрычнік.

## А&К у Львове

Беларускі дуэт «Аляксандра і Канстанцін» на запрашэньне Русланы адыграў канцэрт на цэнтральным пляцы ў Львове перад 40-тысячнай аўдыторыяй.

Вялікі канцэрт «Зоркі Эўрабачаньня віншуюць Украіну» быў прысьвечаны Дню незалежнасьці краіны і адбыўся 24 жніўня. На правах гаспадыні сьвята выступіла ўкраінская зорка Руслана, якая нарадзілася ў Львове. Акрамя беларусаў яна запрасіла іншых удзельнікаў «Эўрабачаньня» — сэрба Жэлька Яксімавіча, македонца Тошэ Праескі і групу «Лінас і Сімона» зь Літвы.

Наш дуэт выступаў другім — адразу пасьля Русланы. Як паведаміў «НН» Канстанцін Драпеза, іграць сваю праграму пасьля шалёных танцаў украінскай сьпявачкі было досыць цяжка — у першыя хвіліны натоўп яшчэ клікаў Руслану, але праз нейкалькі кампазыцый вельмі цёпла вітаў кожную песьню «А&К».

К.Драпеза кажа, што ў іх з Русланай наладзілася сапраўднае шчырае сяброўства: «Падчас банкету яна распавядала пра нацыянальныя стравы, вучыла нас украінскім тостам. Таксама яна дужа любіць беларускую мову».

## Маркі пра вайну

На 7 кастрычніка заплянавана адкрыцьцё IV Нацыянальнай філятэлістычнай выставы «Белфіла-2004». Да выставы выйдзе адмысловая капэрта і штэмпэль спэцгашэньня.

## Пахаваньне Мілаша

Чэслаў Мілаш пахаваны ў крыпце для заслужаных палякаў у кляштары айцоўпаўлінаў у старажытным цэнтры Кракава. Супраць такога ўшанаваньня выступалі каталікі-кансэрватары, бо Мілаш «ня быў палякам і ня быў сапраўдным каталіком». За Мілаша заступіліся Папа Ян Павал II і абп.Жыцінскі. Зь беларусаў у цырымоніі пахаваньня браў удзел экс-міністар замежных справаў Пятро Краўчанка.

## Папа ў мультфільме

Паэма Яна Паўла II «Рымскі трыптых» будзе ўвасоблена ў анімацыйным жанры. У мультвэрсіі, якую робяць у Польшчы, будуць выкарыстаны фрэскі Мікелянджэла з Сыкстынскай капэлы. Пры стварэньні будуць ужыты розныя тэхнікі — клясычная анімацыя, анімацыя з солі (перад камэрай будуць насыпаць карціны з крышталяў солі, што будзе паказваць стварэньне сьвету), кампутарная анімацыя, фатаздымкі й акторская гульня.

## Колінз+Уэбэр=мюзыкл

На верасень заплянаваная прэм'ера мюзыклу Эндру Лойда Ўэбэра «Жанчына ў белым» паводле аднайменнага раману клясыка дэтэктыўнага жанру Ўілкі Колінз. Сам Уэбэр кажа, што гэтая праца будзе больш сур'ёзная, чым яго ранейшыя папярэднія творы — «Коткі», «Прывід опэры» ці «Эвіта».

## Помнік сьвіньні

У Седльцах (Польшча) урачыста адкрылі помнік сьвіньні. Зроблены ён зь ліпы і важыць 3,5 тоны. У ваяводзтве сьвінагадоўляй займаюцца 60% гаспадарак і 80% жыхароў. Таму мясцовыя ўлады вырашылі ў дадатак заснаваць і сьвята сьвіньні. Помнікі сьвіньні ёсьць таксама ў Партугаліі, Нямеччыне, Даніі і Ўкраіне (тут іх аж два — у Палтаве і Ромнах).

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl, Сяргей Будкін**

## выставы

**Нацыянальны музэй гісторыі і культуры Беларусі**

**Да 20 верасьня** працуе выстава «Майстра і майстры. Школа». Будуць экспанавацца творы Гаўрылы Вашчанкі і яговых вучняў. Жывапіс, скульптура, інсталяцыя.




**Плякаты Крукоўскага**

**Да канца верасьня** ў бібліятэцы імя Талстоя (вул.Маякоўскага, 18) працуе выстава плякатаў Уладзімера Крукоўскага «Старонкі гісторыі», прысьвечаная Дню ведаў.

**Палац мастацтваў**

**Да 12 верасьня** працуе выстава «Менск — сталіца Радзімы». Жывапіс, графіка, дэкаратыўна-выяўленчае мастацтва.

**У «Падземцы» й «Latte»**

На сьценах «Падземкі» (пр.Скарыны, 37) і кавярні «Latte» (вул.Платонава, 10) зьявіліся фатапрацы творчага згуртаваньня «Funlab». Чалавечны партрэт ды ачалавечаны краявід, іржавыя партовыя гарады…

**Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва**

**4** (сб), **5** (ндз) — VI Міжнародны фэстываль пэрформансу. Бяруць удзел 28 мастакоў зь Беларусі, Ангельшчыны, Нямеччыны, Фінляндыі, Польшчы, Швэцыі, Эстоніі. 6 верасьня фэстываль пераедзе ў Строчыцы Менскай вобласьці.

**Музэй гісторыі беларускай літаратуры**

**Увесь верасень** тут працягвае працаваць выстава «Народжаныя для мора» — мадэлі суднамадэлістаў, літаратурныя творы пра марскія прыгоды, старадаўнія карты, мадэлі караблёў, сьцягі, вымпэлы.

**Галерэя «Ўнівэрсытэт культуры» (Палац Рэспублікі)**

**Да 19 верасьня** экспануецца выстава «Вада. Інтэрпрэтацыі»: жывапіс, скульптура, батык, шкло.

**Спартэкспа-2004**

**З 9 да 11 верасьня** ў нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» адбудзецца міжнародная спартовая выстава «Спартэкспа-2004». Мэта выставы — азнаёміць спэцыялістаў з новымі распрацоўкамі і дасягненьнямі спартовай індустрыі, паказаць спартовыя тавары і паслугі. У праграме прадугледжаны паказальныя выступы спартоўцаў, круглыя сталы, сэмінары і бізнэс-сустрэчы.

**Будпрагрэс-2004**

**З 7 да 10 верасьня** ў футбольным манежы на пр.Машэрава, 22 адбудзецца 12-я спэцыялізаваная выстава «Будпрагрэс-2004».

**Музычны фэстываль**

**11 верасьня** ў спарткомплексе «Ўручча» адбудзецца I Міжнародны музычны фэстываль. Удзельнічаюць больш за 20 гуртоў з Расеі, Украіны, Беларусі. Рэгі, хіп-хоп, ню-мэтал, альтэрнатыва, мэтал, рок, ска. Пачатак а 14-й. Заканчэньне — а 22-й. Электронны адрас: www.dashkoff.org. Т.: 757-05-89, 703-89-47, 552-24-57

## тэатры

**Балет**

**3** (пт) — «Лебядзінае возера».
**5** (ндз) — «Рамэо і Джульета».

**Заля камэрнай музыкі**

**16** (чц) — канцэрт Канстанціна Шарава (арган, клявэсын) з цыклу «Вечары царкоўнай музыкі».

**Тэатар імя Янкі Купалы**

**10** (пт), **11** (сб, пачатак а 15-й) — «Паўлінка».
**15** (ср), **16** (чц), **17** (пт) — «Эрык XIV».

**Малая сцэна**

(вул.Энгельса, 12)
**12** (ндз) — «Налу».
**13** (пн) — «Саламея».

## Клюбная афіша

**Графіці** (671-58-65)

**4** (сб), 20.00 — адзін з этапаў гульні «Схватка». Уваход вольны.

**8** (чц), 20.00 — Павал Кашырын & клюб «Графіці» прэзэнтуюць новы праект «Нашы сябры» з удзелам Валер'я Шчарыцы &Co са сваёй арыгінальнай праграмай.

**10** (пт), 20.00 — напярэдадні эфіёпскага новага году — вечар казак ад Дзьмітрыя Гайдука (Масква) з удзелам «Хайле тумс» (Менск).

**Бліндаж** (219-00-10, 671-58-65)

**2** (чц), 23.00 — dj's Egor/Zolart.
**3** (пт), 23.00 — dj's Egor/Zolart.
**4** (сб), 23.00 — dj's Egor/Zolart.
**11** (сб), 18.00 — эфіёпскі Новы год. 6-гадзінны канцэрт беларускіх камандаў «Вірус Ліха», «Чык-Чык», «Непаліва», «Хайле Тумс», «Калімбу» (Менск), «Адыс-Абэба» (Гомель), «Авэста» (Ліда), а таксама казкі ад Дзьмітрыя Гайдука.

**Bronx** (288-10-61, velcom: 103 і 105)

**2** (чц), 22.00 — «Клюбны чацьвер»: dj Dust.
**3** (пт), 22.00 — live jazz.
**4** (сб), 22.00 — «Start party».

**Белая Вежа** (284-69-22, 239-16-00)

**2** (чц), 19.00 — dj Dee, White Tower: dj Top, dj Grizzly.
**3** (пт), 22.00 — «Euroclub»: dj Mixell, go-go. Квіткі: 20000 — 10000.

**X-Ray** (223-93-55)

**3** (пт), 22.00 — dj-bar.
**4** (сб), 22.00 — dj-bar.

**Ямайка** (252-07-26)

**3** (пт), 2.00 — «The Afterparty».
**4** (сб), 2.00 — «The Afterparty».

## Менская кінаафіша з 3 да 5 верасьня

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Дзяўчына з Джэрзі»: **3** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Ван Хельсынг»***: **3—5** (пт—ндз) 17.00, 20.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Кепскія дзяўчаты»: **3** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 19.00, 21.00.
«Чалавек-павук-2»: **4, 5** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30.

**«Дружба»** (240-90-13)

«Кепскія дзяўчаты»: **3** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **4** (сб) 18.00, 20.00; **5** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Стэпфардзкія жонкі» (прэм'ера): **3** (пт) 16.30, 18.40, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.30, 18.40, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)

«Стэпфардзкія жонкі» (прэм'ера): **3** (пт) 16.50, 18.50, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 14.40 (іл), 16.50, 18.50, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Мільён год да нашай эры»: **3—5** (пт—ндз) 17.00, 21.20.
«Троя»: **3** (пт) 18.00, 20.40; **4, 5** (сб, ндз) 15.00, 18.00, 20.40.
«50 першых пацалункаў»: **3—5** (пт—ндз) 19.00.

**«Перамога»** (223-77-66)

«Чалавек-павук-2»: **3** (пт) 13.50, 16.10; **4, 5** (сб, ндз) 13.50.
«Пакуты Хрыстовы»****: **3** (пт) 18.40, 21.10; **4, 5** (сб, ндз) 16.10 (іл), 18.40, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)

«Пітэр Пэн»: **3** (пт) 14.00; **4, 5** (сб, ндз) 10.20, 14.10.
«Забіць Біла-2»***: **3** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **4, 5** (сб, ндз) 16.10, 18.30, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)

«Дзяўчына з Джэрзі»: **3** (пт) 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **28, 29** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу:

**«Аўрора»**

«Лебядзінае возера»: **3—5** (пт—ндз) 14.30.

**«Берасьце»**

«Блізард»: **3** (пт) 14.30.
«Браток медзьведзяня»: **4, 5** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**

«Кніга джунгляў-2»: **3** (пт) 10.30; **4, 5** (сб, ндз) 13.00.

**«Мір»**

«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **4, 5** (сб, ндз) 13.00.
«Эліна, нібыта мяне і не было»: **4, 5** (сб, ндз) 14.00.

**«Піянер»**

«У пошуках Нэма»: **3** (пт) 12.00; **4, 5** (сб, ндз) 12.10.

МЕНСКАЯ КІНААФІША

# Гаваркія рыбы з прыгодамі

«У пошуках Нэма» («Finding Nemo»)
ЗША, 2003, каляровы, 100 хв.
**Жанр:** Анімацыйныя прыгоды-казка для сямейнага прагляду
**Адзнака:** 8,5 (з 10)



Карціна «Ў пошуках Нэма» даволі даўно ідзе ў Менску, але гэтая выдатная анімацыя яшчэ доўга не састарэе.

Маленькая рыбка-клоўн шукае свайго сына Нэма, скрадзенага злосным дантыстам-глыбакаводнікам ля каралавага рыфу. Каб выратаваць дзіця, герою прыходзіцца пераплыць акіян, увязацца ў прыгоды і пасябраваць з гаваркой рыбкай-склерозьніцай Дорыс, якая па здольнасьці трапляць у забаўныя сытуацыі пераплюне любога клоўна.

Чарговы фільм студыі «Піксар», якая пасьпяхова займаецца аб'ёмнай кампутарнай анімацыяй, прынясе асалоду і дарослым, і дзецям, таму карціна зусім не выпадкова атрымала «Оскара».

Чаго вартыя адныя акулы, якія аб'ядналіся ў вегетарыянскі клюб і ладзяць сэансы калектыўнай псыхатэрапіі! А хатнія акварыюмныя рыбкі, якія пляткараць на тэмы стаматалёгіі і распрацоўваюць пляны ўцёкаў? Рыбы ў фільме — як людзі.

А вось адмоўная дзяўчынка-дурнічка, зубастая дачка дантыста і візгатлівая «рыбазабойца», мае морду драпежнага карася — і зьяўляецца ў карціне пад музыку зь фільму «Псыха». Стэнтан увогуле добра прайшоўся па кінаклясыцы, але маленькім дзеткам, якія ня ведаюць з кіно анічога, гарантаваныя дзьве гадзіны зьдзіўленьня і сьмеху.

Фільм карыстаецца надзвычайнай папулярнасьцю: дзеці ў масавым парадку выпускаюць зьняволеных акварыюмных рыбак у акіян.

А вось у беларускім возеры Белае ўжо зьявіліся нечаканыя хатнія рыбкі — піраньі. Мо і гэта «Ў пошуках Нэма» — на мясцовы лад.

**Андрэй Расінскі**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Беларуская нацыянальная валюта: праблемы й пэрспэктывы:** Матэрыялы канф., г.Менск, 30 лістап. 2003 г.. — Менск: Цэнтар «Супольнасьць», 2004. — 144 с. 299 ас.

Беларускія эканамісты — як прадстаўнікі незалежных дасьледніцкіх цэнтраў, так і дзяржаўныя службоўцы — супольна зь нямецкімі навукоўцамі абмяркоўвалі ў Менску сучасны стан ды будучыню айчыннай валюты. У цэнтры ўвагі стаяла пытаньне магчымага пераходу на расейскі рубель. Валер Дашкевіч разгледзеў два сцэнары разьвіцьця эканамічнай сытуацыі ў Беларусі ў выпадку валютнай інтэграцыі. Аляксандар Лабанаў і Юры Ўласкін прааналізавалі грашовакрэдытныя тэндэнцыі ў нашай краіне. Прафэсар Станіслаў Багданкевіч выступіў з дакладам «Заўсёды ёсьць альтэрнатыва. Нацыянальныя інтарэсы». Сыстэмны пэралік пагрозаў для гаспадаркі й дзяржаўнасьці Беларусі, якія прынёс бы пераход на валюту Расеі, падалі ў сваіх выступах Гарэгін Вардэванян і Ўладзімер Усоскі. Нямецкія ўдзельнікі спыніліся на пытаньнях пераходу на эўра ў Нямеччыне й (меркаванага) у Польшчы.

**Маеўская Н. Мая ўлюбёная краіна:** Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 103 с. 1000 ас.

**Тарасаў С. Фрэскі:** Абразкі й апавяданьні: Для сярэд. школьн. узросту / Маст. М.Купава. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 102 с.: іл. 2000 ас.

Вядомы археоляг і пісьменьнік прапануе дзецям павандраваць сьцяжынамі старажытнай Беларусі. Абразкі з разьдзелу «Камяніцы й таямніцы» прысьвечаныя Полацку, Нямізе, Гарадні, Бэрасьцю. У даступнай форме аўтар апавядае ў кнізе пра жыцьцё першабытных людзей ды паходжаньне беларусаў, уздым дзяржаўнасьці пры Ўсяславу Чарадзею ды Вітаўту. Цана 7570 руб.

**Левко О. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие.** — Минск: Беларуская навука, 2004. 280 с.: ил. 600 ас.

У кнізе абагульнены вынікі 25-гадовай працы па вывучэньні гарадоў, замкаў, мястэчак, вёсак, манастыроў, храмаў і пахавальных аб'ектаў паўночна-ўсходняй Беларусі. У разьдзеле, прысьвечаным культаваму будаўніцтву, можна прачытаць пра дзейнасьць Куцеінскага манастыра. Шапік у будынку Акадэміі навук прапануе за 26520 руб.

**Минские парковые скульптуры Владимира Жбанова:** Каталог = Park Sculptures by Vadimir Zhbanov. — Минск: УП «Бизнесревю», 2004. — 32 с.: ил. 1000 ас.

Таямнічая «Незнаёмка» ў Міхайлаўскім сквэры, вясёлыя «Гусі» ля фантану на пляцы перад Камароўскім рынкам ды яшчэ пяць скульптур «паркавага жанру», выкананых У.Жбанавым, ужо некалькі гадоў прыцягваюць увагу менчукоў. Каталёг знаёміць з гісторыяй цікавостак, раскрывае імёны асоб, што сталіся прататыпамі для твораў. Тут друкуюцца таксама здымкі й тэхнічныя парамэтры скульптур.

**Михаил Пташук:** Исповедь кинорежиссёра. Сценарий худ. фильма. Публикации. Воспоминания / Ред.-сост. Л.М.Пташук. — Минск: Мастацкая літаратура, 2004. — 366 с.: ил. 2000 ас.

Дзякуючы М.Пташуку на экране ажылі творы У.Караткевіча, І.Шамякіна, В.Быкава — у сваёй «Споведзі» рэжысэр прызнаецца, што ўсё зьнятае ім «мае дачыненьне да беларускай літаратуры XX стагодзьдзя». Кніга, падрыхтаваная намаганьнямі жонкі майстра, уключае аўтабіяграфічную аповесьць «І плач, і сьлёзы…», сцэнар да фільму «Анёл-ахоўнік», а таксама публікацыі пра дзейнасьць творцы й успаміны аб ім (сярод аўтараў — М.Міхалкоў, Г.Данэлія, Н.Русланава, А.Папова, А.Дудараў). Цана 19980 руб.

**От Берестья до Бреста из века в век** = From Berestye to Brest century by century: Фотоальбом / Авт. текста В.Мороз. — Брест: ЧУП «Изд-во Академия», 2004. — 230 с. 1500 ас.

Здымкі, агляд-храналёгія гісторыі Берасьця й тэматычныя артыкулы пра горад і жыхароў. Перавыданьне. Цана блізу 38000 руб.

**Праведники Народов Мира Беларуси** / Междунар. центр культ. связей «Израиль—Беларусь»; Музей истории и культуры евреев Беларуси; Сост. И.Герасимова, А.Шульман. — Минск: ОДО «Тонпик», 2004. — 164 с.: ил. 100 ас.

«Чалавек, які ўратаваў адно жыцьцё, ўратаваў усё чалавецтва», — такія словы з Тальмуду зьмешчаны на мэдалі «Праведнік Народаў Сьвету». У сьвеце дзвццаць тысяч такіх людзей, зь іх 500 — беларусы. Паймённы сьпіс ратавальнікаў і ўратаваных, дакумэнты, здымкі, аповед пра акалічнасьці выратаваньня — сьцiслая гісторыя самаахвярнасьці й бескарысьлівасьці. У «Акадэмкнізе» 15700 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Жнівеньскія

Сяргей Харэўскі

## Бяда з гонтаю

Не было ў гэтым годзе сапраўднага лета. Ці я не пасьпеў яго заўважыць. Памятаю, цэлы чэрвень былі дажджы, пасьля — дажджы напалам зь бязводзьдзем. Насуперак усім прагнозам, зусім мала сёлета грыбоў. Пусты ляшчыньнік. Каліва ягадаў.

А вось сёньня ўжо халодная імжыстая раніца. Ня хочацца выходзіць зь цёплае хаты. Паветра пахне ўжо зусім не па-летняму. Штосьці бадзёра-самотнае чуваць у ім. Над возерам падымаецца пара. Значыць, вада яшчэ цяплейшая за паветра. Сям-там у азёрнай вадзе ўжо гойдаюцца сасьпелыя пунсовыя дзічкі. А чарот пазалаціўся.

Да нас з жонкаю ў госьці ў сядзібу, у вёску **Вайшкуны**, завітаў Міхал Анемпадыстаў. Падбіў нас на экспэдыцыю па Мядзельшчыне ды Пастаўшчыне. Мы шукалі майстроў, што ўмеюць рабіць гонту ці, прынамсі, станкі для яе вырабу, калі такія ацалелі. Сёньня, як ні дзіўна, на рынку зьявіўся попыт на гэты спрадвечны беларускі спосаб пакрыцьця стрэхаў. Нехта сёньня хоча мець экалягічна чыстыя матэрыялы ва ўласным доме, ці дакладней, *на* ім. А нехта мае патрэбу ў адмысловым стылёвым аздабленьні сваіх камэрцыйных праектаў — напрыклад, рэстарацыі ў народным стылі ці якіх гатэльчыкаў на прыродзе. Цікавасьць сёньня падаграецца й моднымі глянцавымі часопісамі, што рэклямуюць гонту заходняе вытворчасьці. Чаму б не пафантазіяваць пра магчымасьць аднаўленьня спрадвечнае традыцыі й у Беларусі? Багата хатаў, пуняў, сьвірнаў, паветак яшчэ красуюцца выцьвілымі гонтавымі шатамі. Укрытыя гэтымі немудрагелістымі драўлянымі дыхтачкамі, прастаялі яны безьліч гадоў, перастаялі ўсе часы й ўлады.

Тры гады таму мне пашчасьціла сустрэцца з гэткім майстрам, што жыве на хутары блізу **возера Саранчаны**. Мянушка ў яго — Ясюня Бяда. Бяда — бо, як растлумачыў ягоны пляменьнік, ён усё жыцьцё наракаў на ўсё, бедаваў. І за палякамі, і за немцамі, і за саветамі. Дзед Ясь, рыхтык Плюшкін, цягнуў на свой падворак усё, што знаходзіў вартага ў навакольлі. Тут былі і куфры, і невядомага прызначэньня старасьвецкія мэханізмы, і нават панская мядзяная ванна з бронзавымі львінымі лапамі.

Тады той дзед паказаў мне й прыхаваны ў сьвірне велізарны станок для вырабу гонты. Дзед Ясь падрабязна растлумачыў прынцып дзеяньня тае гонташчапальнае машыны, што мусіць круціцца конямі. Пасьля ён прачытаў цэлую лекцыю пра тэхналёгію падрыхтоўкі драўніны. Найлепей, дарэчы, алешыны. І паказаў на ўласныя пабудовы, крытыя з паўстагодзьдзя таму. Гонта серабрылася, нібы жмурылася ад сонца.

Вось і вырашылі адведаць Ясюню Бяду яшчэ раз. Ехаць дык ехаць. Дарога пачынае кружляць, кружляць, часам прападаючы зусім. Ну вось, нарэшце, і Ясюнеў хутар. Ледзь пазнаць. Перакасіліся дзьверы хлява, завязаныя нейкай драціною. Невядома нават, зь якога боку ўваходзіць у хату, бо нат сьцяжыны не відаць сярод крапівы. Пасьля доўгага груканьня ў дзьверы й вокны дачуліся, як дзед ідзе на ганак. Ён зусім састарэў і ледзь рухаўся. «Нага баліць», — растлумачыў. Дазнаўшыся, у якой мы патрэбе, з прыкрасьцю махнуў рукою. «Нічога больш няма. Парасідаў. Усё паржавела», — страціўшы ўсялякі інтарэс да нас, бурчэў дзед. Бяда, адным словам.

На шчасьце, суседам дзеда Ясюні аказаўся малады хлапец Анатоль, цясьляр з Лынтупскага сьпіртзаводу. Таленавіты, дарэчы, фатограф. Выпадкова пазнаёміўшыся з намі, ён паабяцаў, што здолее сабраць той Ясюнеў гонтавы станок. Відавочна, справа яго захапіла.

## Сярожа і Міша

Недзе **на Мядзельшчыне** па дарозе вырашылі зрабіць тэхнічны прыпынак. Разгледзелі на ўзбочыне вялікі бэтонны мэмарыял зь зіхотка-чырвонымі лічбамі 1941—1944, паўторанымі для кагосьці двойчы. У бэтон умураваны пліты з чырвонага граніту. А вось жа пад бэтоннай стрэшкаю на звычайным кардонным пляншэце трафарэтам напісана, што ў гэтым самым лесе месьціліся і Вялейскі падпольны абкам, і Мядзельскі падпольны райкам КПБ, і нейкае Паўднёвае бюро ЦК КП Літвы, а таксама партызанскія брыгады імя Будзённага, Варашылава, Ракасоўскага й Даватара. Сьпіс фантастычна доўгі, даруйце, калі штó й прапусьціў. Вось так проста й напісана, што «ў гэтым лесе разьмяшчаліся…» Няўжо ж усе разам? Ды й не напісана, *калі* разьмяшчаліся. Мо да 1944-га, а мо і пасьля.

Як мы з Анемпадыставым разам вучыліся ў Менскай мастацкай вучэльні, то так і закарцела трасянуць даўніною й прыпісаць пад стыль тых літараў: «…а таксама Міша й Сярожа». Ніхто ж ня будзе спрачацца, што й мы тут во «разьмяшчаліся».

Мае рацыю Адам Глёбус, калі гаворыць, што няма нічога больш антыэстэтычнага, як «вялікая айчынная вайна», з усімі яе нязграбнымі й непрыгожымі мэмарыяламі. Сёньня яны ўжо не кранаюць сэрца мінакоў. Прынамсі, кранаюць ня болей, чым расфарбаваныя ў дзікія фарбы гранітныя валуны з заклікамі берагчы прыроду альбо высечаныя з цэлых дрэваў грыбочкі з чырвонымі каптуркамі.

Сеўшы назад у аўто, нечакана для сябе пачалі сьпяваць савецкія ваенна-патрыятычныя песьні. Прытым чым больш дакладна мы траплялі ў ноты, тым большым абсурдам здаваліся нашы сьпевы сярод ціхамірных нашых палёў, сярод сьпелых садоў ды прыдарожных крыжоў, любоўна спавітых кветкамі й стужкамі.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Далёка ад Менску

Ізноў час імкліва сьціснуўся, як гадзюка перад скачком, а пасьля памчаў наперад. Агарод выглядае дзіка. Палоць ужо запозна, дый паліваць няма сэнсу. Лету канец. Пара дахаты, ізноў у Менск.

Вось і **Засьвір**. Зіхціць яшчэ непабляклай бляхаю старасьвецкі касьцёл. Некалі тут пробашчам быў Казімер Сваяк. Тутэйшы люд касьцельны й сёньня ўспрымае беларушчыну цалкам натуральна. Навокал касьцёлу цяпер падкрэсьленая чысьціня й парадак. Зрэшты, як і ўва ўсім гэтым маленечкім мястэчку. Ля касьцельнае брамы ўжо падзьбіраваліся людзі. Да імшы яшчэ быў час. Зазірнулі ў сьвятыню, што некалі ўзьвялі тут айцы-кармэліты. Суворага, ваярскага выгляду звонку, усярэдзіне ён робіць уражаньне далікатнага. Пры ўваходзе, у бабінцы, ацалела адпаліраваная тысячамі ног мураваная падлога. Я быў тут гадоў пятнаццаць таму. Тады ў касьцёлу не было нават даху.

Абышлі цьвінтар. Пры ім — аднуўленыя магілы нямецкіх жаўнераў першае сусьветнае вайны. Немцам не адмовіш у пачуцьці меры: сьціплыя крыжы, сталёвыя ланцугі, ахайны газон.

Пры касьцёле засталіся велізарныя рамантычныя руіны былога кармэліцкага кляштару. Пасярод колішняга іхнага двара й да сёньня растуць старыя яблыні. Тым часам нашу ўвагу прыцягнула старая кабета, што зьбірала букет зь дзікіх кветак. Пэўна што для нейкае аздобы ў касьцёл. «Дзетачкі, як жа ж тут было раней прыгожа, — казала яна. — І вось і мяне ж прымушалі гэта ўсё бурыць… — працягвала. — А адзін быў тады камсамолец, які, убачыўшы, што я ня надта шчырую, шпурнуў у мяне цаглінаю з гары. Ледзь не патрапіў. Во як было. Выходзіць, што і я гэта ўсё бурыла…» Кабета расплакалася ды пасьпяшалася да бажніцы.

**У Шэметаве**, што было нам далей па дарозе, касьцёл заўсёды быў чынны. У яго сутарэньнях да сёньня спачываюць у сваіх трунах продкі Скірмунтаў. Але цяпер усё стала яшчэ лепей. Былы палацык Скірмунтаў цяпер прыстасаваны пад плябань і нядзельную школку. Падняўшыся па даўжэзнай стромкай лесьвіцы, можна агледзець тутэйшы краявід далёка-далёка. Пагатоў, проста перад гарою, на якой стаіць касьцёл, разьлягаюцца рыбгасныя ставы. У іх шчоўкаюць пашчэнкамі ладныя шчупакі ды пераліваюцца лускою лянівыя карпы. Жнівеньскае эмалевае неба, адбіваючыся ў вадзе ставоў, асьвятляе ўсё навокал. Здаецца, каб не было і сонца, гэтая вада сьвяцілася б велізарнымі нэонавымі лямпамі.

Пры сьцяжынцы — складзеная зь дзікага каменьня новая каплічка са скульптуркаю Панны Марыі. А пры касьцельнай агароджы зьявіўся новы мэмарыяльны знак — у гонар роду Скірмунтаў, якія фундавалі рэстаўрацыю й разбудову гэтага касьцёлу ў 1902 г. Надпіс зроблены па-беларуску. Як і ўсё, што напісана тут на інфармацыйным стэндзе пры ўваходзе. З касьцёлу чуваць былі беларускі сьпеў. Нешта пакрысе ўсё ж мяняецца тут незваротна, насуперак усім абставінам. Прынамсі, хочацца сябе гэтым цешыць.

Да Менску адсюль яшчэ вельмі далёка.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**У Шэметаве касьцёл заўсёды быў чынны. У яго сутарэньнях да сёньня спачываюць у сваіх трунах продкі Скірмунтаў.**

## Звычайны дзень

Сёньня ўжо звычайны дзень у **Менску**. Вось нішчаць яшчэ адзін старасьвецкі дом. Дом у два паверхі на цокалі па вуліцы Калектарнай, што меў нумар 3б. Коўш экскаватара з размаху ўгрызаецца ў старыя муры.

Першае, што раблю па прыезьдзе ў горад, — улучаю тэлевізар. Сёньня выпадкова натрапіў на нейкі расейскі сэрыял. Натуральна, пра міліцыю, бандытаў і п'янтосаў. Мяне зусім не зацікавіў сюжэт. Але зацікавіла месца здымкаў. Так, родны мой горад, любоў мая… Вось кавалак вуліцы Якуба Коласа, вось Зьмітрака Бядулі, стадыён «Дынама». Знаёмыя аркі, краты, пад'езды… А дзеяньне — нібы ў Расеі. У Менску здымаліся ўсялякія «Каменскія», «Бальзакаўскія ўзросты» ды немаведама яшчэ што. Менск для іх — ідэальная пляцоўка. Мяркую, справа ня толькі ў таннасьці тутэйшага сэрвісу ці працоўных рук. Гэта было б запроста. Сёньняшні Менск — *ніякі*. Пазнавальна савецкі, свойскі для любога насельніка «шостае часткі сушы», нэўтральна-стэрыльны, без прыкметаў сваістасьці. Нічым ня будзе асабліва вылучацца й масоўка, што служыць стафажам для галоўных пэрсанажаў з Расеі, — ані вопраткай, ані гаворкаю.

Можна нават уявіць сабе, што ўсе старыя, несавецкія дамы ў Менску зносяцца адмыслова для кінэматографу. Памятаю, як малым хадзіў у школу, на нашых вачах зьнішчалі Нямігу. І ўсе школьныя гады я быў сьведкам бясконцых кіназдымак. Вось палае дом, вакол немцы з аўтаматамі. То залунае сьцяг са свастыкай, то ўжо з зоркаю. Танкі, сабакі, салдаты. Так зьнішчалі квартал за кварталам. Ажно пакуль нічога ад колішняе Нямігі не засталося. Толькі сабор Пятра й Паўла стаіўся між бэтоннага хаосу, як у акопе.

«**Вуліца Гандлёвая** стане й насамрэч гандлёвай», — радасна рапартуе афіцыйная прэса. Бадай, ніхто з тых пісарчукоў не пацікавіўся тым, што добрыя чатыры стагодзьдзі гэтая найстаражытнейшая вуліца мела назву Зыбіцкай. Можна доўга шукаць вінаватых, але факт — за гады перабудовы й незалежнасьці ў Менску так і не была выкарчавана каляніяльная й камуністычная тапаграфія. На прыкладзе Менску й іншыя гарады Беларусі ні пра што такое не парупіліся. За выключэньнем хіба Маладэчна. Хоць вось жа зьявілася пару гадоў таму вуліца Татарская! Што праўда, не замест Дзімітрава, дзе яна была. Дзеля гэтага перайменавалі



**Сяргей Харэўскі — літаратар, мастацтвазнаўца, сябар Рэдакцыі «НН» ад яе аднаўленьня.**

# кронікі

старадаўнюю вуліцу Вялейскую. Цікава, каму гэта сёньня гэтакі дарагі Дзімітраў, які ну ніякім спосабам да Менску дачыненьня ня меў?

Згадалася выслоўе Гюнтэра Граса. Карэспандэнт запытаўся — ці ня прыкра яму, што ягоны родны Кёнігсбэрг завецца сёньня Калінінградам. Спадар Грас на гэта адказаў, што Кёнігсбэргу больш няма, а тое нагрувашчаньне, што там ёсьць сёньня, можа звацца як заўгодна, хоць бы й Калінінградам.

## Ганчарык, Краўчанка, Малафееў

Слава й памяць людзкая — рэчы адносныя. Справа ня ў тым, зьменлівая ці не любоў народная. Проста нешта мы абавязкова мусім забываць. Падобна, мы мусім забываць большасьць свайго досьведу, пакідаючы толькі самае істотнае. Інакш наш мозг нагадваў бы гарышча, поўнае ўсялякага хлуду, на якім ня хутка знойдзеш, што табе трэба.

Паехаў на абед да маці. Пакуль ёсьць магчымасьць, варта бачыцца з бацькамі чым часьцей. Хто ведае, куды ўрэшце закіне цябе лёс і ці надарацца пазьней такія магчымасьці.

Прыткнуўся да аўтобуснага акна. Разглядаю людзей. Вось праз колькі чалавек ад мяне едзе Ганчарык, былы кандыдат у прэзыдэнты. Проста глядзіць у акно. Поўны аўтобус, а ніхто не зьвяртае на яго ўвагі. Сапраўды, ня надта прыметны чалавек у акулярах. А мо каб і сказаў нехта, напрыклад: «Глядзіце — Ганчарык!» — ці сходу людзі сьцямілі б, пра каго вядзецца?

Але я ж яго ведаю. Таму, сыходзячы з аўтобуса, ветліва кіўнуў яму галавою, а ён мне ў адказ усьміхнуўся, як старому прыяцелю. Хоць не прыгадаю, калі мы зь ім бачыліся. Відавочна, гэтаму чалавеку бракуе простых людзкіх кантактаў. Бадай, прэзыдэнту ў гэтым і няма патрэбы. Але ж Ганчарык прэзыдэнтам ня стаў. Наогул, цяпер я зь цяжкасьцю ўяўляю яго нават кандыдатам у прэзыдэнты. Ветлівы чалавек з разумным тварам, без аніякае харызмы, які не прыцягнуў нічыёй увагі, апроч маёй. Такая ўжо ў мяне звычка.



Рэнэсансная царква ў Новым Сьвержані, што некалі была ўніяцкай, ацалела... У каталіцкай і праваслаўнай бажніцах усё падпісана па-беларуску.

А вось з былым міністрам замежных спраў Краўчанкам бачыліся мы пэўна. І ня раз. І ў нязмушанай атмасфэры. Памятаю, як ён нам, віленскім нашаніўцам, распавядаў, як любіць японскую паэзію. Як ён зімою езьдзіў у Менск, каб набыць нейкія кніжкі, а пасьля ледзь на пехам вяртаўся ў родныя Смалявічы ў завею.

Сёньня ж Пётар Краўчанка — высокі падцягнуты чалавек у ярка-чырвонай футболцы, з дарагім скураным саквояжам у адной руцэ й з марозівам у другой. Ён ішоў уздоўж цягніка Менск—Вільня, выбіраючы свой вагон. Уся ягоная постаць, нават са сьпіны, дэманстратыўна выяўляла поўнае нежаданьне пабачыцца з кім са знаёмых. Што ж, мае права. Яшчэ адзін непазнавальны беларускай публікай пэрсанаж. А можа, ён і ня хоча быць пакуль пазнавальным… Сеў ціхенька сабе ў цягнік і пакаціў у крывіцкую Мэкку.

А вось іншыя дзеячы беларускай гісторыі вельмі хочуць, каб іх пазнавалі. Часта бачу ў гастраномах па вуліцы Пуліхава, напрыклад, Анатоля Малафеева. Кім толькі чалавек гэты ня быў… І першым сакратаром ЦК КПБ, і старшынём палаты прадстаўнікоў, пасядзеў ці не ва ўсіх магчымых прэзыдыюмах, савецкіх і беларускіх. А вось мала каму да яго ёсьць справа. І гэтак ён стане пасярод крамы, і гэтак. Вусны падцісьне, спрабуе глядзець зьверху ўніз. Па вачах відаць: чалавек хоча, каб хоць хто зь ім павітаўся. А не. Усе яго абмінаюць. Не пазнаюць. Так сабе, адзін з чыноўнікаў-пэнсіянэраў, якіх у Менску тысячы.

Уяўленьне малюе мне нават такую карцінку: заходзіць дарэшты зласелы, зь сівымі вусамі пэнсіянэр Лукашэнка ў менскі ГУМ і… нікому да яго няма справы. Забылі й не пазнаюць.

А вось Мечыслава Грыба не абмінеш. Яму на Пуліхава ківаюць, махаюць, ціснуць рукі ці ня кожны другі. Зусім іншая энэргетыка зыходзіць ад гэтага чалавека. А некалі ж я на яго ў газэце «Свабода» карыкатуры маляваў.

І на Шушкевіча шмат карыкатураў панамалёўваў. Як сёньня глянуць, то й дарма. Але такая ўжо рэч тая гісторыя — нічога не рапапішаш. Адзін спадзеў — што хутчэй забудуць. Як забылі ўжо шмат чаго.

## Званок ад Дзянісава

Прачнуўся вельмі рана, на сьвітанку. Узыход раскладае па горадзе дзіўныя водбліскі. Чуваць сьпевы птаства, надзіва шматлікага як для Менску, пра што ніколі не падазраеш сярод тлумнага й куродымнага дня. Неба афарбаванае сёньняшнім ранкам у дзіўныя апалава-амэтыставыя калёры. «Пара ўставаць, пара гарбату піць», — як некалі напісаў Алег Мінкін.

За моцнай гарбатаю сяджу на бальконе й адчуваю ўсёй сваёй істотаю, як прачынаецца буйны горад, вялікае мноства народу й машын. Самы час нешта пісаць ці маляваць. Канец жніўня — нязносная пара ў Менску. Немагчыма знайсьці своечасова тых, каго хочаш знайсьці. Хто ў ад'езьдзе, а хто й адлучае тэлефоны. Ва ўсіх маіх знаёмцаў бракуе грошай. Патрацілі на адпачынкі, паадкладалі на пільныя патрэбы пачатку восені. Напрыклад, на выправу дзяцей на вучобу.

Таму гэтымі днямі я нікога не шукаю. Затое мяне знаходзяць.

Такая ў мяне прыкмета: калі тэлефануе гісторык Уладзімер Дзянісаў, то нічога добрага ня скажа. Адно разьвярэдзіць сэрца.

Вось і сёньня мне патэлефанаваў спадар Дзянісаў. Паведаміў навіну: уладыка Філарэт накіраваў ліст менскаму бурмістру Паўлаву. Мітрапаліт выступае з новымі ініцыятывамі па асваеньні тэрыторыі Верхняга гораду.

Крый мяне божа кідаць камень у бок праваслаўя наагул. Але заўсёды няёмчыся, гледзячы на кубамэтры золата, якім залiваюцца купалы цэркваў ці ня ў кожным менскім мікраёне. А ў скрыначках для ахвяраваньняў, якіх праваслаўны клір панаставіў у гастраномах, я большай купюры за тысячу ня бачыў. Відаць, ёсьць іншыя, і немалыя, даходы.

Як па мне, дык хай бы й насамрэч зрабілі адну з цэркваў цалкам дзяржаўнай. Аднак няхай найперш тая царква, з такімі прэтэнзіямі, прынясе ў кожны беларускі дом Сьвятое Пісаньне. Няўжо ж гэта даражэй за тое золата, ад якога залiваюцца купалы?

Але нештачка добрае, насуперак сваім правілам, мне спадар Дзянісаў сёньня ўсё ж расказаў. Ён адкрыў імя яшчэ аднаго нашага дойліда, Андрэаса Кромэра, які будаваў сьвятыню ў Будславе, а ў Менску — каталіцкі кляштар бэнэдыктынак і браму да праваслаўнага Петрапаўлаўскага манастыра. А яшчэ Ўладзімер Дзянісаў распавёў цалкам анэкдатычную гісторыю са свайго варшаўскага побыту. Ня маючы што рабіць увечары, зьвярнуў увагу на сьмецьцевыя бакі ў двары, забітыя макулятураю. Падпарадкоўваючыся дасьледчыцкаму інстынкту, ён не пагрэбаваў дастаць са сьмецьця колькі стосаў паперы й забраць да сябе ў гатэль. А там ягонаму зьдзіўленьню не было канца. Ён адкрыў архіў варшаўскага ваяводы міжваенных часоў Аляксандра Солтана. І здымкі, і дакумэнты, і проста прыватныя лісты. Прасушыўшы й перабраўшы гэты скарб, беларускі дасьледчык сумленна занёс яго ў варшаўскі Нацыянальны архіў. За што атрымаў вялікую падзяку, а пазьней і адмысловы ліст.

Мяне гэтая гісторыя зацікавіла цалкам практычна. Той самы ваявода Солтан валодаў багата якімі землямі на Сьвянцяншчыне й Пастаўшчыне, на сёньняшнім сумежжы Беларусі, Літвы й Латвіі. Мо ў тых самых лістах і знойдуцца адказы на пытаньні, якія казычуць нашы летуценьні?

## Нясьвіскія хамэлеоны

Надарылася нагода зьезьдзіць зь сябрамі ў Нясьвіж і Мір. Раніца была нібы нішто сабе, сонечная. А ў дарозе пайшоў дождж. Прымета такая: дождж у дарогу — дзень будзе ўдалым. Прыкладна так і было. За **Стоўпцамі** збочылі ў **Новы Сьвержань**, славутае радзівілаўскае мястэчка. Некалі на трохкутным цэнтральным пляцы тут у XVI ст. стаялі касьцёл, царква й збор. Рэнэсансная царква, што некалі была ўніяцкай, ацалела, ацалеў і былы збор, які сёньня ёсьць касьцёлам Пятра й Паўла. Ранішнія службы. У праваслаўных сканчаецца, у каталікоў пачынаецца. У абедзьвюх бажніцах усё падпісана па-беларуску: «Не курыць», «Сьмецьця ня кідаць» ды г.д. Ідылія.

**Вішнявец**. Вялікі статак кароў брыдзе па асфальце. Колішняя базыльянская царква. На барочны будынак за расейскімі часамі панэлеплівалі расейскіх какошнікаў з набалдашнікамі. Непрыемна сёньня ўражваюць далепкі з сылікатнае цэглы. Ажно перасмыкнула. Няма як зрабіць прыстойнае фота.



Не расчараваў Мір. Замак амаль дароблены й ганарліва пануе над ваколіцамі. Але ў замку глядзець няма чаго: музэйная экспазыцыя стала яшчэ бяднейшаю...



...дый мястэчка стварае прыемнае ўражаньне. Хоць таксама штучнае.

Няма чаго здымаць і ў **Нясьвіжы**. Замак у жахлівым стане. Ідзе «рэстаўрацыя». На гэтую будоўлю пускаюць за тысячу рублёў. А глядзець няма на што. Нават старадаўнія дрэвы й кусты павысякалі ў двары. А ў сам замак не ўвайсьці. За тую ж тысячу можна ў касьцёле паслухаць грунтоўную лекцыю й убачыць радзівілаўскія труны ў крыпце.

Па парку раскідана сьмецьце. Пад помнікам савецкаму салдату гарыць «вечны» агонь. Цікава, колькі каштуюць гэтыя газавыя агні, калі падсумаваць па ўсёй Беларусі? А вянкі са штучных кветак? Штучны культ. У выставачнай залі ў колішнім езуіцкім калегіюме выстава жывых інсэктаў. «Сенсация! Живые!» — заклікае афіша. А ў нясьвіскім музэі тымчасам — «Минерал-шоу». У рэстарацыі «Хамэлеон», што за ратушай, замаўляем розныя стравы — шніцаль, сьвініну з грыбамі, люля-кебаб. Прыносяць аднолькавыя кавалкі сьвініны (у рознай, праўда, паніроўцы) з аднолькавым гарнірам. Сьвініна мімікруе пад тую ці іншую назву з меню. Рыхтык як хамэлеоны. Дырэкцыя не бяз гумару. Дождж змывае рэшту турыстаў зь нясьвіскіх вуліцаў.

Не расчараваў **Мір**. Замак амаль дароблены й ганарліва пануе над ваколіцамі. Але ў замку глядзець няма чаго: музэйная экспазыцыя стала яшчэ бяднейшаю. Хоць ты сам ім нешта прынясі — мастацкую кераміку, кнігі, малюнкі… Ды хоць проста па дварах пазьбіралі б рознага даваеннага хлуду — ужо было б на што паглядзець. А колішняя пахавальня Сьвятаполк-Мірскіх наагул выглядае жахліва. Дваццаць гадоў рэстаўрацыі не прайшлі марна — паламана амаль усё, што можна паламаць. Зьняты богведама калі велізарны бляшана-мядзяны княжацкі герб з фасаду зьнік у невядомым кірунку.

У адным духу з замкам аднолены й старажытны касьцёл Сьвятога Мікалая — ачышчаны ад тынкоўкі й укрыты сапраўднай дахоўкаю. Мястэчка стварае прыемнае ўражаньне. Хоць таксама штучнае. Пад дажджом на сцэне сьпявае нейкі народны ансамбль. Без гледачоў. Для тэлевізіі. *Вось сымбаль твой…*

АЛІМПІЯДА ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Кітайская сыстэма



Нягледзячы на тое што алімпійскі факел у Афінах спыніў курэць амаль тыдзень таму, Алімпіяда нябачна працягваецца.

Як паведамляюць тэлетайпы, кіраўнік МАК у якасьці сувэніраў захапіў з сабою з Грэцыі 3500 прабірак з аналізамі атлетаў, каб яшчэ раз праверыць тыя аналізы на прадмет наяўнасьці стымулятараў.

Гэтая навіна павінна зацікавіць Сівакова, які ўжо выказаў намер «пашчаміць дзьвярамі» трэнэраў з адстаючых відаў спорту. Пачакай, чувак! Магчыма, у крыві таго ці іншага чэмпіёна знойдуць забаронены мікроб. Як вынік, яго пазбавяць мэдаля, а крывіч, якому дасталося чацьвёртае месца (такіх у нас аж 10), адразу падскочыць на трэцюю прыступку алімпійскага трону. Глядзіш, такім чынам мы павялічым наш алімпійскі кошык да 24 мэдалёў і выканаем дадзенае бацьку абавязацельства.

Паралельна ў сьвеце ўзьняўся рух за адмену шмону на допінг. «Калі ўжо вырашылі змагацца са штучным уплывам на чалавечы арганізм, дык давайце рабіць гэта пасьлядоўна — забаронім піхаць дзяцей вітамінамі і рыбіным тлушчам: хіба гэта ня той самы допінг?» — лягічна піша «Guardian». Возьме верх гэты пункт гледжаньня — усе, каго на гэтай алімпіядзе абвінавацілі ў допінгу і адмурыжылі мэдаль, атрымаюць свае ўзнагароды цурук.

Між тым, нягледзячы на тое што мы знаходзімся ў фазе буфіркацыі сучаснага спорту, некаторыя трэнды ў алімпійскім руху ўжо відавочныя. Толькі сталы кліент цэнтру карэкцыі зроку «Аптымэд» не заўважыць прарыву кітайцаў. Найбольш папулярная вэрсія трыюмфу ўнукаў хунвэйбінаў — у паўтарамільярднай краіне ёсьць выбар, каб сфармаваць клясную каманду. Аднак, як слушна піша нямецкі «TAZ», сакрэт кітайскіх спартсмэнаў хутчэй у тым, што ў Паднябеснай ёсьць толькі дзьве формы ўдзелу ў алімпійскім руху. Першы — шыць па 16 гадзін у дзень шырспажыў з алімпійскай сымболікай для канцэрнаў «Nike», «Adidas», «Puma», зарабляючы па 2 баксы. Другі — ставіць сусьветныя рэкорды. Усьведамленьне, што спорт — адзіны сродак выхаду зь беднасьці, надае прадстаўнікам трэцяга сьвету такога маральнага пэндаля, што любы анаболік адпачывае. Таму, як пагаджаюцца спэцыялісты, гультаяватыя заходнікі ня маюць у будучыні аніякай алімпійскай пэрспэктывы.

Паглядзіце на немцаў. Як толькі былыя жыхары ГДР узьняліся да стандартаў спажываньня ФРГ, нямецкі спорт ляснуўся. Спорт належыць бедным! І тут, натуральна, у Беларусі не такія ўжо і дрэнныя шанцы. Прыклад афінскіх мэдалістаў, якія дзякуючы рэкордам адхапілі без ільготнага крэдыту асабістыя кватэры, прыцягне ў спорт тысячы юнакоў, якім іншым чынам ніколі ня зьехаць ад надакучлівых продкаў. Галоўнае для айчыннага спорту — надаць беднасьці масавы, татальны маштаб. Таму я галасую за трэці тэрмін!

**Лёлік Ушкін**



Як цыганы разводзяцца. Старонка 6.

PHOTO.BYMEDIA.NET

«Наша Ніва» дзякуе Алегу П. з Лынтупаў, Ігару Ліцьвіну і Алесю Цюленеву зь Менску, Дзьмітрыю Вінчэўскаму з Горадні, Адольфу Суботу з Нью-Ёрку, Віталю Гедрановічу і прадпрыемству «Стары млын» з Наваполацку, Юшкевічу П. і спадару N за ўчасную дапамогу.

**Запрашаем 12 верасьня па маршруце:**
**Менск—Полацак—Верхнядзьвінск—Сар'я—Асьвея—Мёры—Менск.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

**17–20 жніўня**
**запрашаем у вандроўку**
**«Золота Підкова Львоўшчыны»**
Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск
Кошт вандроўкі: для дарослых 45 у.а. + 15 000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. + 15000 руб.
Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі каштуюць 0,1—0,5 у.а.).
Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.
Т.: 8-029-755-03-70, 222-88-76



КАІСА

## Неалімпійскія гульні

У кастрычніку Гішпанія прытуліць чарговую шахматную Алімпіяду. Згуляць на ёй — неаспрэчны гонар для кожнага шахматыста. Беларусь штогод выстаўляе найлепшых гульцоў, якія звычайна гарантуюць зборнай месца ў другім тузіне. Рэй у камандзе заўсёды вёў чэмпіён краіны. Пару гадоў таму было прынята адмысловае рашэньне Фэдэрацыі шахмат: чэмпіён *ipso facto* мае права прадстаўляць краіну на Алімпійскіх гульнях.

Першынство Беларусі ў сакавіку 2004 г. нечакана выйграў Андрэй Малюш, 32-гадовы кандыдат у майстры, старшына міліцыі (цяпер ужо прапаршчык), які ў інтэрвію прэсе выхваляўся тым, што ён непрафэсіянал. Пасьля начных дзяжурстваў засяроджвацца на гамбітах ды мітэльшпілях яму было цяжэй за астатніх; тым ня менш, сп.Малюш заткнуў за пояс такіх славутых грасмайстраў, як Дзідзішка, Купрэйчык, Азараў… І вось у жніўні трэнэрская рада фэдэрацыі радзіць Малюша ў зборную не ўключаць. Замест яго прапануюць бронзавага прызэра, 18-гадовага міжнароднага майстра Андрэя Жыгалку: маўляў, «дамо дарогу маладым».

Юрыдычна рашэньне рады, мякка кажучы, няўдалае. Богведама як яно адаб'еца на прэстыжы шахмат у Беларусі. Відаць, перамога аматара (хоць чэмпіён Беларусі да шахматаў прыкіпеў: вядзе гурток, штомесяц арганізуе бліцтурніры ў гарадзкім клюбе, зьяўляецца сакратаром славутай «Вясьнянкі») настолькі ўзрушыла чорна-белы істэблішмэнт, што асобныя трэнэры ахвяравалі здаровым глуздам. Нагодай жа стала не зусім удалае выступленьне Малюша ў Пардубіцэ — 5 з 9, тады як браты Жыгалкі ўзялі па 6 ачкоў, Азараў — 7. Цяпер у фэдэрацыі мяркуюць выпраўляць на Алімпіяду «па сукупнасьці дасягненьняў», а ня толькі па выніках чэмпіянатаў краіны.

Форум на сайце «Беларускія шахматы» кіпіць ад абурэньня. Ці ня пойдуць калегі чэмпіёна Беларусі з АМАПу на штурм рэзыдэнцыі дзяржтрэнэра Мачалава?

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

**Партыя А.Жыгалка — А.Малюш, Менск, 2004. Ход чорных. Яны ў цяжкім туровым эндшпілі. Выратаваліся эцюдным шляхам. Якім?**



**Адказ: 1...Тс3!! 2. bc Крh4 3. Крf3 Крg5 4. а5 а6! і белыя ня здолелі рэалізаваць лішнюю пешку.**

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Lubaja Natałka,** vinšuju ciabie z Dniom narodzinaŭ! Žadaju ździajśnieńnia ŭsich tvajich zapavietnych maraŭ! Tvoj Jazik

**Віншую Міхася Пацука** з 54-годзьдзем! Жадаю зьдзяйсьненьня ўсіх мар! Аляксей

**Віншую Антося Цыбуля** з Полацку з Днём народзінаў! Жадаю аптымізму, грошай, здароўя, каханьня! Аляксей

**З Днём**, Годам, Стагодзьдзем і Тысячагодзьдзем (і г.д.) беларускіх ведаў. Сьвяткуй сваё! Жыві ў сваім! Міхась

**ДЛЯ БАРДАЎ**

**22—24 кастрычніка** ў Бельску-Падляскім ( Польшча) адбудзецца 11-ы фэстываль беларускай бардаўскай ды аўтарскай песьні «Бардаўская восень-2004», да ўдзелу ў якім запрашаюцца ўсе, хто складае песьні на беларускай мове і ўпісваецца ў межы жанру. 1 кастрычніка а 19-й гадзіне ў актавай залі Дому літаратара адбудзецца праслухоўваньне і адбор кандыдатаў. Каб узяць удзел у адборачным туры, трэба даслаць арганізатарам тры ўласныя творы і зьвесткі аб сабе ў адвольнай форме да 25 верасьня. Зьвязацца з арганізатарамі можна праз тэлефоны: 8-029-642-60-24, Алесь (Менск), +48602383927, Ігар (Беласток). Ці наведаўшы сайт: www.sonca.org

**КАНТАКТЫ**

**Калі вы маеце** лішнія цацкі, беларускія дзіцячыя кніжкі, стары магнітафонік (абы не жаваў, але можна і hi-fi), першая кляса беларускай гімназіі з удзячнасьцю прыме ўсё ў дарунак альбо ў часовае карыстаньне. Т.: 261-68-49 (Арына), 251-95-90 (Марына і Зьміцер)

**Дзеці**, якія гуляюць у беларускай роднай мове і зь ёю — у Менску. Тэл. для татаў і мам: 233-61-89 (Міхась і Вераніка)

**Добры шанец** трапіць у беларускамоўныя ясьлі дзецям да 3 гадоў (у садок №314). Інфармацыя для татаў і мам ад Міхася і Веранікі. Т.: 233-61-89

**Шукаем** здольнага правільна і па-мастацку аформіць сямейны радавод. Электронны адрас: krynica@yahoo.com

**Хлопец** пазнаёміцца зь беларускамоўнай прыхільніцай black/pagan metal. Электронны адрас: nordavind@tut.by

**Няўлоўны Ігар Мацьвееў** зь Віцебску, як маешся? Што новага? Куды рушым? Чакаю званка (тэлефон не зьмяніўся). Алесь

**4 верасьня** Крапівенскае поле чакае нас. Сп.Ігар, тэлефануй. Т.: 5-25-40, Генадзь

**5 верасьня** каля помніка Янкі Купалы адбудуцца чытаньні на тэму: «Купала пра абарону Бацькаўшчыны». Пачатак а 14-й. Заканчэньне а 16-й

**КВАТЭРА**

**Здыму** аднапакаёвую кватэру ў прыгарадзе Менску (можна ў Фаніпалі). Т.: 8-029-755-79-81, Сяргей. Электронны адрас: eyewitness@tut.by

**КНІГІ**

**Куплю** «Беларускую энцыкляпэдыю», т. 1—3, 6, 7. Т.: 613-70-85, Алесь

**Кнігаабмен**. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Гісторыя, этнаграфія, фальклёр, дапамога ў друку, падрыхтоўка рукапісу, пераклад. Фарміраваньне бібліятэкі. Т.: 8-029-753-91-96

**Прапаную** кнігі: «Нарыс гісторыі Беларусі» (Шыбека), «Гістарыяграфія генэалёгіі», эцыкляпэдыя «Хто ёсьць хто...», «Исторические сведения» (1855 г.) ды інш. Т.: 753-91-96

**Майкі** з нацыянальнай сымболікай, новыя ды рэдкія кнігі, часопісы, слоўнікі, навучальныя дапаможнікі, значкі, відэа, аўдыё, CD на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка па пятніцу (12.00—17.30). Т.: 8-029-707-40-01

**Прадам** кнігі: Ю.Туронак «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», Э.Загорульский «Возникновение Минска», М.Прыгодзіч «Старабеларускі лексыкон», В.Ластоўскі «Творы» («Беларускі кнігазбор») і інш. Т.: 236-02-15

**Прадам** кнігі: «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», т.4, «Кампазытары Беларусі», энц. даведнік, «Беларуска-польскі размоўнік» і інш. Т.: 236-02-15

**Прадам** кнігі: А.Алексютович «Белорусские народные танцы» (528 стар.), Ю.Чурко «Белорусский сценический танец», часопісы «Спадчына», «Полымя», «Маладосць», паэзія, пераклады на беларускую мову. Т.: 236-02-15

**ПРАЦА**

**Працаўніка** шукаем для рамонту лецішча (афарбоўка даху, устаноўка замкоў і г.д.). Т.: 258-99-28 (пасьля 20.00)

**Патрэбны выкладчык** ангельскай мовы ў прыватную навучальную ўстанову. Т.: 272-01-27, 272-01-26

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Юр'ю Т. з Горадні.** Спрэчка між прыхільнікамі розных правапісаў доўжыцца 15 год. Не пара яе ўзнаўляць цяпер. Хай пакуль захоўваецца статус-кво.

АД РЭДАКЦЫІ

### Памажыце «Нашай Ніве»

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» зьвяртаецца да чытачоў «НН», суродзічаў, беларускіх арганізацый з просьбай аб фінансавай дапамозе. Крызыс, што паўтараецца штолета праз сэзоннае паніжэньне продажу, сёлета асабліва цяжкі — прычыны ў незвычайнай фінансавай дыскрымінацыі газэты дзяржаўнымі манапалістамі. Газэце неабходная Вашая тэрміновая падтрымка, каб застацца якаснаю. Т.: 284-73-29, 613-32-32, 707-73-29. E-mail: nn@promedia.by. Адрас: 220050. Менск, а/с 537.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3352. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 1.09.2004.
Замова № 5381.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а